Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт
імя Максіма Танка»

Гістарычны факультэт

Кафедра гісторыі Беларусі і славянскіх народаў

Рэг. № ЭМ(К)-26-1-30/2020

УЗГОДНЕНА
Загадчык кафедры
_________ С.А.Талмачова
25.11. 2020 г.

УЗГОДНЕНА
Дэкан факультэта
_________ В.П.Скок
25.11. 2020 г.

ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНЫ КОМПЛЕКС ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ

# ЭКАНАМІЧНАЯ МАДЭРНІЗАЦЫЯ Ў БЕЛАРУСІ (XIX-ПАЧАТАК XXI СТ.)

для спецыяльнасці: 1-21 80 15 Гісторыя

Складальнік:
Жытко А.П., доктар гістарычных навук, прафесар, прафесар кафедры гісторыі Беларусі і славянскіх народаў

Разгледжана і зацверджана
на пасяджэнні Савета БДПУ «26» 11 2020 г., пратакол № 3.

Вучэбна-метадычны комплекс па вучэбнай дысцыпліне “Эканамічная мадэрнізацыя ў Беларусі (XIX-пачатак XXI ст.)” распрацаваны для студэнтаў другой ступені атрымання вышэйшай адукацыі (магістратура) па спецыяльнасці 1-21 80 15 Гісторыя.

Вучэбна-метадычны комплекс накіраваны на фарміраванне ў студэнтаў сістэмных ведаў у галіне мадэрнізацыйнай тэорыі і іх практычнай рэалізацыі ў Беларусі. У ВМК раскрыты сутнасць і асабдівасці мадэрнізацыйных працэсаў у сельскагаспадарчай і прамысловай вытворчасці, развіцці шляхоў зносін і сувязі, іх уплыў на сацыяльную трансфармацыю беларускага грамадства з XIX да пачатку XX ст.

# ЗМЕСТ

Тлумачальная запіска 4
ТЭАРЭТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ
Канспект лекцый ……………………………………………… 6
ПРАКТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ ……………………………………… 63
Планы семінарскіх заняткаў ……………………………………….. 63
РАЗДЗЕЛ КАНТРОЛЮ ВЕДАЎ ……………………… 65
Пытанні да заліку 65
ДАПАМОЖНЫ РАЗДЗЕЛ: ……………………………………... 67
Вучэбная праграма 67

## Тлумачальная запіска

Вучэбна-метадычны комплекс па дысцыпліне "Эканамічная мадэрнізацыя ў Беларусі (XIX-пачатак XXI ст.)" распрацаваны для студэнтаў другой ступені атрымання вышэйшай адукацыі (магістратура) па спецыяльнасці 1-21 80 15 Гісторыя. Дысцыпліна "Эканамічная мадэрнізацыя ў Беларусі (XIX-пачатак XXI ст.)" з'яўляецца вучэбнай дысцыплінай кампанента установы вышэйшай адукацыі модуля "Сацыяльна-эканамічныя працэсы ў Беларусі".

**Мэтай** выкладання і вывучэння дысцыпліны з'яўляецца выяўленне сутнасці і асаблівасцей мадэрнізацыйных працэсаў у эканамічнай і сацыяльнай сферах Беларусі з улікам змяненняў геапалітычнай сітуацыі.

– Задачы вывучэння дысцыпліны: набыць неабходныя тэарэтыка-метадалагічныя веды ў галіне мадэрнізацыйнай тэорыі і яе практычнай рэалізацыі ў Беларусі; атрымаць уяўленне аб ўзаемасувязі і ўзаемазалежнасці мадэрнізацыйных працэсаў у Беларусі з мадэрнізацыяй ў краінах Еўропы, Амерыкі і Азіі; засвоіць асаблівасці працэсаў мадэрнізацыі на тэрыторыі Беларусі, заканамернасць і пераемнасць у іх развіцці; сфарміраваць у студэнтаў навыкі навуковага аперыравання катэгарычным апаратам тэорыі і практыкі мадэрнізацыі. У выніку вывучэння дысцыпліны "Эканамічная мадэрнізацыя ў Беларусі (XIX - пачатак XXI стст.)" студэнт павінен

– ведаць: сутнасць мадэрнізацыі і асаблівасці яе праяўлення ў Беларусі; узаемаўплыў працэсаў мадэрнізацыі на тэрыторыі Беларусі і суседніх славянскіх народаў; этапы мадэрнізацыі на беларускіх землях у складзе Расійскай імперыі, БССР і Рэспублiцы Беларусь;

– умець: выяўляць перадумовы і прычыны мадэрнізацыі ў эканамічнай і сацыяльнай сферах; паказваць якасныя адрозненні ў працэсе мадэрнізацыі на розных этапах; устанаўліваць узровень уплыву замежнага вопыту на эвалюцыю мадэрнізацыі ў Беларусі.

– валодаць: вопытам аналізу вучэбнай і навуковай літаратуры, выкарыстання сучасных тэхналогій атрымання навуковых ведаў; методыкай самастойнай працы з навуковымі даследаваннямі і дакументальнымі крыніцамі; сучаснай метадалогіяй і методыкай навуковага пазнання; афармлення навуковых вынікаў; міждысцыплінарным падыходам пры вырашэнні праблем мадэрнізацыі.

Вывучэнне вучэбнай дысцыпліны "Эканамічная мадэрнізацыя ў Беларусі (XIX - пачатак XXI стст.)" павінна забяспечыць фарміраванне ў магістрантаў акадэмічных, прафесійных і сацыяльна-асобістых кампетэнцый. Патрабаванні да кампетэнцый магістра:

магістр павінен: КПК-2. Быць здольным сістэматызаваць і класіфікаваць сацыяльныя і этнакультурныя працэсы, тлумачыць іх уплыў на гістарычнае развіццё грамадства.

**Метады** (тэхналогіі) навучання . Асноўнымі метадамі навучання з'яўляюцца: – праблемнае навучанне (праблемнае выкладанне, часткова-

пошукавы і даследчы метады); – тэхналогія навучання як вучэбнага даследавання; - камунікатыўныя тэхналогіі, заснаваныя на актыўных формах і метадах навучання (дыскусіі, мазгавы штурм, круглы стол).

Курс выкладаецца з пазіцый праблемна-арыентаванага і міждысцыплінарнага падыходаў, з улікам шырокага спектру трактовак і ацэнак сучаснай гістарыяграфіі.

Усяго на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны “Эканамічная мадэрнізацыя ў Беларусі (XIX - пачатак XXI стст.)” на дзённай форме атрымання адукацыі адводзіцца 90 гадзін, з іх аўдыторных - 52 гадзіны. Размеркаванне аўдыторных гадзін па відах заняткаў: 24 гадзіны - лекцыйных, 28 гадзін семінарскіх заняткаў. Самастойная праца студэнта-48 гадзін. Бягучая атэстацыя праводзіцца ў адпаведнасці з вучэбным планам па спецыяльнасці ў форме заліку (першы семестр).

# ТЭАРЭТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ

## Тэма 1. Уводзіны

Мэта дысцыпліны – выяўленне сутнасці і асаблівасцей экнамічных мадэрнізацыйных працэсаў у эканамічнай і сацыяльных сферах на тэрыторыі Беларусі ў XIX – пачатку XXI ст.

У сучасным грамадазнаўстве, у тым ліку і ў гістарычнай навуцы, найбольшай папулярнасцю карыстаюцца тры сацыялагічныя макратэорыі: фармацыйная, цывілізацыйная і мадэрнізацыйная. Выкарастанне апошняй у айчыннай гістарычнай навуцы пачалося толькі ў апошнія дзесяцігоддзі XX ст. Пры гэтым інтарэс да мадэрнізацыйнай парадыгмы шмат у чым тлумачыцца магчымасцямі яе прымянення пры вывучэнні грмадска-палітычнай і эканамічнай трансфармацыі, якая пачалася з канца 1980-х гг.

Тэорыя мадэрнізацыі - гэта канцэпцыя грамадска-экнамічнага і палітычнага развіцця, якая тлумачыць пераход ад традыцыйнага (стабільнага) да сучаснага індустрыяльнага (грамадзянскага) грамадства, якое безупынна мяняецца.

Адрозніваюць два тыпы мадэрнізацыі: першасная – у краінах, дзе першапачаткова пачалася індустрыялізацыя, і другасная, у краінах, якія пачалі пераходзіць да індустрыялізацыі значна пазней і падцягваюцца да існуючай сістэмы мадэрнізацыйных краін. Да першаснай мадэрнізацыі адносяць эпоху першай прамысловай рэвалюцыі, разбурэння традыцыйных спадчынных прывілей і абвяшчэння роўных грамадзянскіх правоў, свабод, дэмакратыі г.д. Спецыфіка другаснай – прыстасаванне адстаючых краін да мадэрнізаваных.

Марксісцкая канцэпцыя мадэрнізацыі прадугледжвае пераход ад архаічнай (першаснай) да другаснай фармацыі, гэта значыць да капіталістычнага спосабу вытворчасці. У аснову гэтага пераходу К.Маркс паклаў матэрыяльны фактар, змену форм уласнасці у выніку класавай барацьбы. Ж.Кандарсэ, як і пазней М.Вебер, з'яўляюцца аўтарамі канцэпцыі ўзрастаючай рацыяналізацыі грамадства, вызвалення ад традыцыйнага вобразу жыцця людзей.

На працягу другой паловы XX ст. у рамках мадэрнізацыйнай перспектывы быў назапашаны значны тэарэтыка-метадалагічны і эмпірычны вопыт вывучэння розных аспектаў пераходу ад традыцыйнага грамадства да сучаснай грамадзянскай супольнасці.

У сваім развіцці мадэрнізацыйная парадыгма прайшла некалькі этапаў. Першы – другая палова 1950-х - першая палова 1960-х гг. – перыяд нараджэння і хуткага росту мадэрнізацыйных даследванняў у класічнай версіі. Другі – канец 1960-х – 1970-е гг. – крытычны перыяд, калі тэорыя мадэрнізацыі трапіла пад унутраную і знешнюю крытыку. Трэці – 1980-я гг. – посткрытычны перыяд адраджэння мадэрнізацыйных даследванняў, на працягу якога наглядалася тэндэнцыя канвергенцыі школ мадэрнізацыі, залежнасці і светасістэмнага аналізу І.Валерстайна. Чацвёрты – з канца 1980-

х гг. – станаўлення неамадэрнізацыйнага і постмадэрнізацыйнага аналізу пад уплывам трансфамацый у краінах цэнтральнай і усходняй Еўропы.

Разам з тым, на сучасным этапе мадэрнізацыйная тэорыя раглядаецца як супярэчлівы працэс, якому уласцівы канфлікты не толькі на этапе станаўлення, але і на ўзройні "развітых" краін.

**Тэма 2 Мадэрнізацыйныя працэсы ў Расійскай імперыі ў першай палове XIX ст. і Беларусь.**

Умовы развіцця панскай гаспадаркі пры феадалізме ў многім вызначаліся пазямельнымі адносінамі. У канцы XVIII ст. у Беларусі панскае землеўладанне, якое склалася ў часы Вялікага Княства Літоўскага, было пануючае. У апошняй чвэрці гэтага ж стагоддзя, з улікам колькасці акладных падатковых адзінак - дымоў, феадалам, што валодалі прыгоннымі, належала 74,9 % агульнай зямельнай плошчы. Пераважную большасць усіх зямель (63,1 %) складала іх уласная зямля. Зямельная ўласнасць, рэалізаваная эканамічна ў выглядзе феадальнай рэнты, з'яўлялася асновай феадалізму. Уласнасць на зямлю ў сналучэнні з пазаэканамічным прымусам забяспечвала феадалу магчымасць эксплуатацыі асабіста залежных ад яго сялян.

Пасля далучэння тэрыторыі Беларусі да Расійскай імперыі царскі ўрад праводзіў палітыку насаджэння рускага памеснага землеўладання ў краі. Былыя дзяржаўныя і духоўныя ўладанні, канфіскаваныя маёнткі мясцовых памешчыкаў, якія адмовіліся прысягнуць на вернасць новай уладзе, а таксама ўдзельнікаў паўстання 1794 г., 1830-1831 гг. і рэвалюцыйнага руху ў 30-40-я гг. XIX ст., раздаваліся расійскім вяльможам, ваенным і грамадзянскім чыноўнікам. У 1772-1801 гг. у пяці бсларуска-літоўскіх губернях ім падаравалі 250,4 тыс. рэвізскіх (мужчынскіх) душ сялян. Так, графу Завадоўскаму дасталася Магілёўская эканомія (25 860 сялян), генерал-аншэфу князю Пацёмкіну - Крычаўскае староства (14 250 душ), генерал-фельдмаршалу графу Румянцаву - Гомельскае староства (11 100 прыгонных), генерал-фельдмаршалу графу Чарнышову – Чачэрскае староства (5 100 сялян).

Раздача дзяржаўных і канфіскаваных прыватных маёнткаў рускім тытулаваным дваранам з'яўлялася для царскага ўрада сродкам умацавання яго сацыяльнай апоры на заходніх землях. Падараванне казённай зямлі свецкім феадалам пагаршала прававое і маёмаснае становішча сялян, якія пазбаўляліся магчымасці звяртацца са скаргамі на сваіх уладальнікаў у дзяржаўны суд і залежалі ад іх самавольства. Атрыманыя маёнткі можна было прадаць іншым асобам, у тым ліку мясцовым дваранам. На лаяльную шляхту Беларусі, што прысягнула на вернасць царызму, распаўсюджваліся манапольныя пазямельныя правы расійскага дваранства.

За ўдзел паланізаваных памешчыкаў у паўстанні 1830-1831 гг. на тэрыторыі пяці беларуска-літоўскіх губерняў было канфіскавана мноства іх маёнткаў з 64.7 тыс. душ сялян. Найбольшая колькасць такіх маёнткаў (188 з 54,9 тыс. душ) знаходзілася ў Віленскай і Гродзенскай губернях. Частка іх (каля 25 тыс. душ) пазней была вернута ўладальнікам, што пакаяліся.

Як слушна адзначыў П.Казлоўскі, падараванні і канфіскацыі адлюстроўвалі сутнасць царскай аграрнай палітыкі канца XVIII - першай паловы XIX ст. на бсларускіх землях. Царызм падтрымліваў мясцовых прыгоннікаў, дапамагаў ім ва ўмацаваннії феадальнай уласнасці і эксплуатацыі сялян.

Да часу адмены прыгону ўдзельная вага панскай зямельнай уласнасці заставалася вельмі высокай. У 1859 г. у маёнтках сярэдне- і буйнапамесных уласнікаў (больш за 100 рэвізскіх душ прыгонных) пяці губерняў налічвалася 16071,1 тыс. дзесяцін прыдатнай зямлі, або 66,8 % усёй яе плошчы Па адносных памерах панскай зямельнай уласнасці Беларусь да канца другой трэці XIX ст. займала першае месца ў Еўрапейскай Расіі.

Сярод панскай зямельнай уласнасці значна пераважала буйная, латыфундыяльная феадальная ўласнасць (маёнткі, дзе было звыш 500 душ прыгонных). У апошняй чвэрці XVIII ст. на яе долю ва ўсходніх паветах прыпадала 74,6 % прыватнаўласніцкай зямлі, у заходніх і цэнтральных - у сярэднім 68,5 %. У далейшым у сувязі з драбленнем і канфіскацыяй часткі латыфундыяльных уладанняў царскімі ўладамі памеры буйнапамеснай зямельнай уласнасці прыкметна зменшыліся. У 1859 г. у пяці беларускіхгубернях яна склала 44,2 % панскай зямлі.

Паводле звестак В.Чапко, у 40-50-я гг. XIX ст. у пяці беларускіх губернях налічвалася 9 тыс. панскіх маёнткаў. Больш чым 6700 з іх (73,2 %) былі дробныя (20-100 рэвізскіх душ сялян). Амаль ва ўсіх маёнтках вялася ўласная гаспадарка, існавала фальварковая ворная зямля.

Рост таварнай прадукцыі ў панскай гаспадарцы, асабліва павелічэнне вытворчасці збожжа на продаж, патрабаваў пашырэння плошчы фальварковай ворнай зямлі. Яна павялічвалася не толькі за кошт асваення новых зямель, але і ў выніку захопу сялянскіх угоддзяў. У многіх маёнтках замест традыцыйна належачых сялянам 2/3 такой зямлі ім адводзілі ад 2/5 да 1/3, іншы раз і менш. Паводле даных інвенгароў 800 маёнткаў,у 40-я гг. XIXст.у Гродзенскай губерні панскія гаспадаркі з фальварковай ворнай зямлёй памерам звыш 1/3 усіх ворных зямель склалі больш за 3/4 іх агульнага ліку, у Мінскай - 62 %, у Віцебскай - звыш паловы гаспадарак. У апошнія гады перад адменай прыгону ўдзельная вага фальварковай ворнай зямлі хутка павялічвалася. У 1859 г. у маёнтках сярэдне- і буйнапамесных уласнікаў Магілёўскай губерні яна займала ўжо 65 % ворных угоддзяў, Віцебскай - 63, Мінскай 56 %. Хуткае пашырэнне плошчы фальварковай ворнай зямлі абумовіла значнае ўзмацненне феадальнага прыгнёту сялянства, павелічэнне адпрацовачных павіннасцей.

Галоўнай прадукцыйнай сілай панскай гаспадаркі з’яўляліся прыгонныя сяляне. У пяці беларуска-літоўскіх губернях у 1795 г. (5-я рэвізія) яны складалі 84,8 % усяго сялянства, або 75,1 % народанасельніцтва, у 1858 г. (10-я рэвізія) - адпаведна 70,9 і 57,6%. Змяншэнне ўдзельнай вагі прыгонных сялян тлумачыцца крызісам феадальна-прыгонніцкай сістэмы.

Асновай гаспадаркі памешчыкаў было ворнае земляробства. З другой паловы XVIII ст. пануючай сістэмай яго стала папарнае трохполле. З пашырэннем пасеваў бульбы ў многіх маёнтках яно замянялася

чатырохполлем. З развіццём танкаруннай авечкагадоўлі, галоўным чынам на захадзе Беларусі, у некаторых панскіх гаспадарках з'явілася шматполле з травасеяннем. Шырэй ужываліся новыя агратэхнічныя прыёмы (зяблевае ворыва, праполка, вапнаванне глебы), паляпшалася ўгнаенне палёў.

У абсалютнай большасці гаспадарак памешчыкаў апрацоўка зямлі і ўборка ўраджаю вяліся цяглавай сілай, прымітыўнымі прыладамі (саха, драўляная барана, серп, каса) і працай прыгонных сялян. Удасканаленыя прылады - плугі, жалезныя бароны, сеялкі, жняяркі, сенакасілкі сустракаліся рэдка. У 40 - 50-я гг. XIX ст. у панскіх фальварках шырокае распаўсюджанне атрымалі толькі машыны для абмалоту і апрацоўкі зерня - малацілкі, веялкі. Разам з тым ужо ў канцы XVIII ст. у магнацкай сельскай гаспадарцы Заходняй Беларусі наёмная рабочая сіла склала 17,2 %, Усходняй Беларусі - 7,4 % усёй рабочай сілы. Скарыстанне машын і наёмнай працы ў панскай сельскай гаспадарцы сведчыць аб фарміраванні капіталістычнага ўкладу ў нетрах феадалізму, спробе перабудовы перадавых маёнткаў у буржуазным кірунку. Аднак у эпоху позняга феадалізму наёмная праца не ўяўляла яшчэ альтэрнатывы паншчыне, а толькі спадарожнічала ёй.

Вынікам панавання папарнага трохполля, слабай тэхнічнай узброенасці земляробства былі пераважна збожжавы характар паляводства, невысокая ўраджайнасць.

У структуры панскіх пасеваў першае месца займала азімае жыта, якое з'яўлялася галоўнай харчовай і рыначнай культурай. Сярод яравых пераважалі авёс і ячмень. З тэхнічных культур сеялі лён, каноплі, з канца 20-х гг. XIX ст. на панскіх палях пачалі саджаць бульбу. Ураджайнасць збожжавых некалькі ўзрасла. Калі ў канцы XVIII ст. у панскіх гаспадарках усіх катэгорый яна склала ў сярэднім сам-3, то ў 30-40-я гг. XIX ст. - сам-3,5. Аднак абвастрэнне крызісу феадальна-прыгонніцкай сістэмы да канца 50-х гг. абумовіла паніжэнне ўраджайнасці ў сярэднім да сам-2,8. Скарацілася пасяўная плошча, знізіліся зборы збожжавых культур. Калі ў першым дзесяцігоддзі XIX ст. у панскіх маёнтках пяці губсрняў высявалі збожжа прыкладна 4,3 млн чвэртак, а збор іх дасягаў 16 млн чвэртак, то напярэдадні рэформы 1861 г. - адпаведна 3,2 і 9 млн чвэртак. У 1858-1860 гг.у параўнанні з 1843- 1847 гг. сярэднегадавыя пасевы бульбы ў панскіх фальварках Віленскай і Гродзенскай губерняў зменшыліся з 241,2 тыс. да 157,7 тыс. чвэртак (на 34,6%).

Земляробства ўсё больш падпарадкоўвалася попыту ўнутранага і знешняга рынкаў, набывала таварны характар. Да канца XVIII ст.з магнацкіх ла- тыфундый заходніх і цэнтральных паветаў на іх паступала больш за 3/4 вы- творчасці жыта. Самай таварнай галіной магнацкага прадпрымальніцтва было вінакурства - манаполія мясцовых дваран. Звыш 90 % атрыманай гарэлкі прадавалі на ўнутраным рынку. З магнацкіх маёнткаў на ўсходзе Беларускага рэгіёна вывозілі галоуным чынам лён, пяньку. а таксама лес і прадукты перапрацоўкі драўніны. У 40-я гг. XIX ст. на землях буйных землеўласнікаў Беларусі на продаж адпраўлялі 70 -80 % сабранага жыта і 45-55 % - ячменю, ауса. гароху, бульбы .

Другой па значнасці галіной панскай гаспадаркі была жывёлагадоўля. Разводзілі пераважна прадукцыйную жывёлу кароў, свіней, авечак. Многія памешчыкі заводзілі пародзістую малочную і мясную жывёлу. Землеўладальнікі, што пачалі скарыстоўваць у фальварках наёмную працу, набывалі валоў і коней. З ростам суконнай вытворчасці ў 30-40-я гг. XIXст. у заходніх паветах значнае развіццё атрымала гандлёвая панская мерыносавая авечкагадоўля. На рубяжы гэтых дзесяцігоддзяў у Гродзенскай губерні налічвалася 500-600 тыс. танкарунных авечак. Распаўсюджвалася і таварная мяса-малочная жывёлагадоўля.

З пашырэннем рынадных, таварна-грашовых адносін у Беларусі паступова складвалася раённая спцыялізацыя сельскай гаспадаркі (лён - у паўночных паветах, капоплі - ва ўсходніх, бульба - у заходніх і цэнтральных, жывёлагадоўля - на захадзе і Палессі).

Узрастала вотчыннае прадпрымальніцтва. Поруч з вінакурнямі ў маёнтках ствараліся суконныя, палатняныя, шкляныя, гарбарныя, паташныя і іншыя мануфактуры, другія прадпрыемствы. З 1796 па 1860 г. у Беларусі колькасць вотчынных мануфактур павялічылася з 51 да 70 (27,1 %), а іх валавая прадукцыя – з 353 тыс. да 757 тыс. руб. (у 2,1 раза). У 20-х гг. XIX ст. з’явіліся першыя панскія фабрыкі. Да сялянскай рэформы 1861 г. колькасць іх узрасла з 2 да 18, а валавая прадукцыя - з 151 тыс. да 850 тыс. руб. (у 5,6 раза). На прамысловых прадпрыемствах скарыстоўвалася як паншчынная праца прыгонных, так і наёмная праца (сваіх сялян і пабочных асоб).

Дзяржаўная зямельная ўласнасць у Беларусі ў гэты перыяд значна ўступала панскай. У апошняй чвэрці XVIII ст. на яе долю прыпадала каля 18 % усяго зямельнага фонду. У фактычным жа ўладанні феадальнай дзяржавы знаходзілася толькі 7.5 % агульнай зямельнай плошчы. Астатнія дзяржаўныя землі былі аддадзены ў арэнду, заклад, кіраванне свецкім і духоўным феадалам.

З далучэннем тэрыторыі Бсларусі да Расійскай імперыі дзяржаўны зямельны фонд яшчэ больш зменшыўся. Як ужо адзначалася, царскі ўрад раздаваў казённыя землі разам з сялянамі расійскім саноўнікам. Пасля другога і трэцяга падзелаў Рэчы Паспалітай Кацярына II падаравала ў Мінскай, Слонімскай і Віленскай губернях былыя каралеўскія і старасцінскія маёнткі з 40,4 тыс. душ, Павел I у Літоўскай губерні - з 19,8 тыс. душ. У 1810-1816 гг. расстройства дзяржаўных фінансаў прымусіла царызм прадаць многія казённыя маёнткі ў прыватныя рукі. Аднак у далейшым у казну перайшлі канфіскаваныя землі ўдзельнікаў паўстання 1830-1831 гг. Дзяржаўны зямельны фонд у 30-я - пачатку 40-х гг. XIX ст. напоўніўся таксама за кошт секулярызацыі царкоўных і манастырскіх уладанняў. У выніку да часу рэформы дзяржаўных сялян (канец 60-х гг.) у пяці беларускіх губернях казне належала столькі зямлі (4472 тыс. дзесяцін, або 18,7 %), колькі яна прыкладна мела ў апошняй чвэрці XVIII ст.

З раздачай дзяржаўных зямель колькасць казённых сялян у Беларусі ў апошняй трэці XVIII ст. зменшылася прыкладна ў тры разы і склала 76,4 тыс. рэвізскіх душ, ці 5,5 % народанасельніцтва. У далейшым з пашырэннем

дзяржаўнай зямельнай уласнасці і натуральным прыростам насельніцтва колькасць іх тут узрасла. У 1866 г. яна дасягнула 266 тыс. душ мужчынскага полу, што склалала 21,1 % сялянскага, або 15,5 % усяго насельніцтва.

Амаль усе лзяржаўныя маёнткі здаваліся з публічных таргоў у доўга-тэрміновую арэнду (на 24 гады і больш) чыноўнікам, дробнай шляхце. Фальварковая гаспадарка вялася працай казённых сялян. У пачатку XIX ст. частка дзяржаўных земель была перададзена самім сялянам на правах грашовай арэнды. Пры гэтым фальваркі ліквідаваліся. Земляробства, жывёлагадоўля, уся гаспадарка дзяржаўных маёнткаў да 40-х гг. XIX ст. знаходзіліся на той жа ступені развіцця, што і ў панскіх фальварках.

Рэформа П.Кісялёва ў дзяржаўных маёнтках. Крызіс феадальна-прыгонніцкіх формаў гаспадаркі, узмацненне сялянскага руху прымусілі царызм правесці некаторыя змены ў сістэме феадальнай эксплуатацыі сялянства. У снежні 1839 г. пачалася перабудова адміністрацыйна-гаспадарчага кіравання дзяржаўнай вёскай заходніх губерняў. Яна з’яўлялася састаўной часткай агульнарасійскай рэформы П.Кісялёва. Праводзілася люстрацыя, г.зн. падрабязнае апісанне маёнткаў і вызначэнне памераў сялянскага землекарыстання і павіннасцей. Уводзіўся падушны надзел, роўны 3 дзесяцінам ворнай зямлі і 1 дзсесяціне сенажацей. Па аснове маёмаснай няроўнасці на дзяржаўнай вёсцы сяляне былі падзелены на цяглых, напаўцяглых, агароднікаў і бабылёў. Цягламу двару паншчына вызначалася памерам у шэсць дзён на тыдзень, паўцягламу - тры дні. Агароднікі за карыстанне агародамі і пашамі павінны былі выконваць розныя дваровыя работы, а ў выпадку неабходнасці прыцягвацца і на паншчыну. Бабылі працавалі ў маёнтку за натуральную ці грашовую плату.

Рэформа палепшыла становішча дзяржаўных сялян. У выніку праведзенай люстрацыі павіннасці казённых сялян Віцебскай і Магілёўскай губерняў зменшыліся на 62-65 %, Гродзенскай і Мінскай - на 30-35; зямельныя надзелы ў апошніх губернях павялічыліся на 32-36, у Магілёўскай - на 15 %. З 1844 г. у дзяржаўных уладаннях Беларусі ліквідаваліся фальваркі, сяляне пераводзіліся з паншчыны на грашовы аброк. Памеры яго адпавядалі даходу, які атрымлівала казна па інвентарах і арэндных кантрактах. Пазней былі адменены даніна і дадатковыя адпрацовачныя павіннасці. Перавод на аброк істотна змяніў эканамічны стан сялян: яны атрымалі большую свабоду для гаспадарчай дзейнасці. Была спынена таксама здача дзяржаўных маёнткаў у арэнднае карыстанне.

Інвентары панскіх маёнткаў. У 1844 г. Мікалай I зацвердзіў Палажэнне, згодна з якім у гэтым жа годзе ва ўсіх заходніх губернях былі створаны губернскія дваранскія камітэты для складання абавязковых інвентароў панскіх маёнткаў. Камітэты павінны былі перагледзець старыя інвентары ў маёнтках, а там, дзе яны адсутнічалі, - скласці новыя. Увядзенне ў дзеянне перагледжаных і складзеных ўпершыню інвентароў у Беларусі пачалося ў 1845 г. Павіннасці сялян у іх вызначаліся адпаведна колькасці і якасці надзельнай зямлі, але не маглі перавышаць 1/3 валавога даходу з пазямельных участкаў. Інвентары фіксавалі і велічыню надзелаў з мэтай

некалькі абмежаваць сялянскія павіннасці. Зямля, што знаходзілася ў фактычным карыстанні сялян, захоўвалася за імі. Разам з тым для цяглага двара вызначаліся нормы надзелу ад 4,75 да 9 дзесяцін. Такая гаспадарка абавязана была адпрацаваць у тыдзень на паншчыне тры дні з канём (мужчынская паншчына) і адзін дзень без яго (жаночая паншчына). Фурманачная павіннасць выконвалася ў лік паншчынных дзён. Памешчыкам было забаронена самавольна вызначаць згонныя дні, а таксама абкладаць сялян натуральнымі паборамі.

Інвентарная рэформа выклікала незадавальненне памешчыкаў, якія ўвогуле выступілі супраць умяшання дзяржавы ва ўнутрыпамеснае размеркаванне ўгоддзяў і рэгламентацыю сялянскіх павіннасцей. Яны ўсяляк тармазілі перагляд старых і ўвядзенне новых інвентароў. Уваходзячы ў інвентарныя камітэты, памешчыкі дабіліся па многіх маёнтках не толькі захавання ранейшых прыгонніцкіх павіннасцей, але часта і іх павелічэння. Увядзенне абавязковых інвентароў ішло павольна. Царскі ўрад, баючыся абвастрыць адносіны з мясцовымі памешчыкамі, не асабліва падганяў іх. У панскіх уладаннях Заходняй і Цэнтральнай Беларусі абавязковыя інвснтары былі складзены і ўведзены ў другой палове 40-х гг. XIX ст. Ва ўсходніх паветах яны былі ўведзены ў частцы маёнткаў. Тут інвентары некалькі разоў пераглядаліся і выпраўляліся. Перагляд і выпраўленне іх ва Усходняй Беларусі зацягнуліся да 1857 г., калі пачалася падрыхтоўка адмены прыгону. У сувязі з гэтым неабходнасць ва ўвядзенні абавязковых інвентароў у маёнтках зусім адпала. У цэлым інвентарная рэформа, выкліканая крызісам прыгонніцкага ладу, засталася незавершанай і не аблегчыла становішча панскіх сялян.

Такім чынам, у Беларусі, як і ва ўсёй Расійскай імперыі, прыгонніцкая сістэма гаспадаркі, асновай якой з'яўлялася феадальная ўласнасць на зямлю, да сярэдзіны XIX ст. прыйшла ў заняпад. Яна стала тормазам для далейшага развіцця прадукцыйных сіл, што ў канцы XVIII - першай палове XIX ст. вяло да станаўлення капіталістычнага ўкладу ў нетрах феадалізму. У 40-50-я гг. XIX ст. феадальна-прыгонніцкі спосаб вытворчасці аказаўся ў стане глыбокага крызісу. Адначасова павялічвалася феадальная эксплуатацыя большай часткі сялянства.

Прамысловасць. Шляхі зносін.

У канцы XVIII - пачатку XIX ст. у фінансава-грашовай сістэме Расійскай імперыі - важным інструменце ўплыву дзяржавы на эканоміку - склалася цяжкая сітуацыя. Увядзенне папяровых грашовых знакаў - асігнацый, якія атрымалі хаджэнне з 1769 г., прывяло да ўзрастання інфляцыйных працэсаў. На беларускія губерні вольнае абарачэнне банкаўскіх асігнацый было распаўсюджана паводле ўказу ад 8 лютага 1795 г. Курс асігнацый у адносінах да срэбнай манеты падаў з кожным годам. У 1814-1815 гг. ён знізіўся да 20 кап. срэбрам найбольш нізкага ўзроўню ў XIX ст.
Інфляцыя стрымлівала развіццё капіталістычных адносін, гандлю і крэдыту.

Грашовая рэформа 1839-1843 гг., якую правёў міністр фінансаў Я. Канкрын, усталявала сістэму срэбнага монаметалізму з абарачэннем

устойлівых папяровых грашовых знакаў. Яна амаль што на дзесяць гадоў стабілізавала грашовае абарачэнне і з’явілася імпульсам хуткага развіцця таварна-грашовых адносін.

У банкаўскай справе захоўвалася дзяржаўная манаполія. Паводле ўказаў ад 15 лістапада 1776 г., 8 снежня 1824 г„ 22 сакавіка 1844 г. на Беларусь была распаўсюджана дзейнасць Дваранскага і Дзяржаўнага камерцыйных банкаў, дазволена арганізацыя пазыковых кас. Аднак гэтыя меры мелі выразны саслоўны характар і тычыліся толькі памешчыкаў. На арганізацыю прамысловай вытворчасці ў гэты перыяд крэдытная сістэма з прычыны сваёй неразвітасці істотнага ўплыву не аказвала.
Страхавая справа ў Беларусі, пачынаючы з 20-40-х гг. XIX ст., была прадстаўлена аперацыямі расійскіх страхавых таварystваў (двух супрацьпажарных, страхавання капіталу і даходаў, марскога, рачнога і сухапутнага транспарту і інш.). У адрозненне ад банкаўскай страхавая справа з першых крокаў з'яўлялася выключна капіталістычнай, прыватнапрадпрымальніцкай ініцыятывай.

Уніфікацыі бсларускага і расійскага рынкаў садзейнічала ўвядзенне адзіных мер даўжыні і вагі. У Расійскай імпсрыі такая стандартызацыя была пачата ў канцы XVIII ст. паводле ўказу 29 красавіка 1797 г. 28 лістапада 1824 г. Камітэт міністраў прыняў рашэнне аб выкарыстапні ў Падольскай, Віленскай, Гродзенскай, Мінскай, Валынскай губернях і Беластоцкай вобласці толькі тых мер даўжыні і вагі, якія былі ўстаноўлсны для ўсёй дзяржавы. Аб гэтым было загадана паведаміць па губернях з амбонаў цэркваў і касцёлаў. Аляксандр I пацвердзіў гэты загад указам ад 30 сакавіка 1825 г. Хаця атрыманне ўзорных мер даўжыні і вагі зацягнулася аж да пачатку 30-х г., агульнарасійскія адзіныя меры даўжыні і вагі паступова ўвайшлі ў побыт беларускіх губерняў.

З 1830 г. пачала ажыццяўляцца афіцыйная палітыка абароны правоў вытворцаў шляхам дзяржаўнага зацвярджэння прамысловых клеймаў. Яна была накіравана супраць пранікнення на рынак падробак і няякаснай прадукцыі. Усяго з 1830 па 1860 г. права на клеймаванне сваёй прадукцыі атрымаў 51 беларускі прадпрымальнік.
Увядзенне адзіных мер даўжыні і вагі, разам з абаронай правоў вытворцаў, наклала пачатак стандартызацыі – неад’емнай рысы індустрыяльнага грамадства.

У прамысловасці Беларусі канца XVIII - першай паловы XIX ст. найбольшыя эканамічныя поспехі былі дасягнуты ў сферы дваранскага прадпрымальніцтва. У першай чвэрці XIX ст. новыя прадпрыемствы адкрывалі буйныя землеўласнікі, галоўным чынам расійскага паходжання. Намаганні дваран-прадпрымальнікаў гэтага часу нагадвалі рэформы А.Тызенгаўза ў апошнія гады Рэчы Паспалітай. Яны ўяўлялі сабой кангламераты розных мануфактур, арыентаваліся на патрэбы дзяржавы і вышэйшых колаў грамадства. Іх існаванне, як правіла, было не больш працяглым, чым жыццё іх уладальнікаў.

Графу Р. Пацёмкіну ў Крычаўскім графстве належала суднаверф, канатная і парусінавая мануфактуры. Акрамя таго, ён запрасіў з Пецярбургскай Акадэміі мастацтваў майстра П. Нардштэйна, шведа па паходжанні, з дапамогай якога заснаваў у Дубровенскім старостве гадзіннікавую мануфактуру, адну з першых у Расійскай імперыі. Там жа працавалі суконная мануфактура і мануфактура па вытворчасці пазументаў. Другі фаварыт Кацярыны II - граф С.Зорыч заснаваў у Шклоўскім маёнтку гарбарную, канатную. парусінавую, суконную і шаўкаткацкую мануфактуры. Адзін з бліжэйшых да імператара Аляксандра I прыдворных, правадзейны тайны саветнік М.Навасільцаў трымаў у Слоніме суконную і дывановую мануфактуры. Дзяржаўны канцлер граф М.Румянцаў меў у Гомельскай эканоміі два вінакурныя заводы, тры гуты, тры ткацкія фабрыкі, дзве піваварні, медзяны і ліцейны завод, свечкавы, гарбарны, льнотрапальны, цагельны, вапнавы і кафляны заводы, сыраварню, шматлікія млыны, кузні і лесапільні.

Другі перыяд дваранскага прадпрымальніцтва пачаўся з 20-х гг. XIX ст. У ім актыўна ўдзельнічалі сярэднія і дробныя землеўладальнікі, шляхта мясцовага паходжання. Гэты перыяд характарызаваўся спецыялізацыяй вытворчасці, узнікненнем новых галін прамысловасці, укараненнем удасканаленага абсталявання і паравых машын, спалучэннем мануфактуры і фабрычных формаў арганізацыі вытворчасці, цеснай сувяззю не толькі са знешнім, але і з унутраным гандлем. Дваранскія прадпрыемствы такога тыпу былі падрыхтаваны да дзейнасці ва ўмовах капіталістычнага грамадства.

Дваранская прамысловасць з'яўлялася спосабам утылізацыі ссльскагаспадарчай сыравіны, якая выраблялася ў маёнтках, і выкарыстання лясных багаццяў. Такім чынам, прыгонніцкая сельская гаспадарка спалучалася з арганізацыйна-тэхнічнымі формамі перадавой капіталістычнай індустрыі. Напрыклад, маёнткі Пуслоўскіх уяўлялі сабой своеасаблівы камбінат, дзе сыравіна (зерне, бульба, воўна, руда) перараблялася ў розную прамысловую прадукцыю, якая мела шырокі рынак збыту.

Дваранскія прадпрыемствы развіваліся ў адзінстве са сваёй асновай - маёнткам. У той жа час пры пашырэнні дваранскай прамысловасці, асабліва пры змене мануфактуры фабрыкай, уласнай сыравіны не хапала. Узнікла шматбаковая сувязь феадальнай. прыгоннай па сваёй аснове гаспадаркі з рынкам: праз рэалізацыю сваёй прадукцыі і праз набыццё на рынку сыравіны і прамысловага абсталявання. Змянілася і сутнасць адносін з прыгоннымі. Па-першае, дваране-прадпрымальнікі заахвочвалі сялян за плату займацца вытворчасцю сыравіны для сваіх прадпрыемстваў (напрыклад, цукровых буракоў, хмелю, балотных руд). Па-другое, яны выкарыстоўваліся ў якасці рабочых на прамысловых прадпрыемствах або ў залік паншчыны ці за асобную плату. Прыгонныя, як правіла, працавалі разам з вольнанаёмнымі і часта побач з замежнымі майстрамі. 1х звязваў адзіны працэс капіталістычнай вытворчасці.

Другарадную ролю ў агульным развіцці прамысловасці адыгрывалі эканамічныя намаганні купцоў і мяшчан. За адзінкавымі выключэннямі

(Альбрэхтаўскі стэарынава-свечкавы і млынны завод, пінскі паравы млын, слонімская медзеапрацовачная фабрыка) ім належалі дробныя і сярэднія прадпрыемствы. У той жа час у дарэформеннай Беларусі паступова ішоў працэс накаплення купецка-мяшчанскага капіталу.

Новая капіталістычная сістэма гаспадарання ў корані супярэчыла феадальнаму ладу. Яна паклала пачатак разлажэнню саслоўна-феадальнай структуры. Асабліва ярка гэта выявілася ў з'яўленні новых магчымасцей для самага масавага і бяспраўнага феадальнага саслоўя - сялянства. 7 лістапада 1782 г. з'явіўся ўказ "О дозволении крестьянам в Белоруссии при новой ревизии записываться в купечество". Ён тычыўся толькі дзяржаўных сялян, аднак надалей быў падтрыманы палажэннем аб "переходе казенных поселян в городские сословия" (24 кастрычніка 1804 г.), "Дополнительными правилами для дозволения крестьянам производить разными товарами торговлю с получением на сие право свидетельств и с платежом определенных пошлин" (29 снежня 1812 г.) і, нарэшце, указам ад 28 снежня 1818 г. "О распространении права учреждать фабрики и заводы на всех казенных, удельных, помещичьих крестьян и вольных хлебопашцев".

Формы прамысловасці. Пачатак тэхнічнага перавароту. Для беларускай прамысловасці была характэрна дробнатаварная вытворчасць у форме рамяства і дробнакапіталістычных прадпрыемстваў. Да катэгорыі дробных капіталістычных прадпрыемстваў звычайна адносяць прадпрыемствы з колькасцю работнікаў ад 5 да 16, без паравога рухавіка, з гадавой вытворчасцю не менш чым 1 тыс.руб. У Беларусі ў 1796 г. дробныя прадпрыемствы складалі прыкладна 99%, у 1860 г. - 96% усіх прадпрыемстваў. Паводле падлікаў М.Болбаса, у 1860 г. у Беларусі налічвалася 7,8 тыс. дробных капіталістычных прадпрыемстваў з 23,4 тыс. рабочых і сумай вытворчасці 14,1 млн руб..

Рамеснікі працавалі ў асноўным на заказ. Прадукцыя дробнатаварнай вытворчасці паступала на мясцовыя - гарадскія, местачковыя і сельскія кірмашы і базары.

Таксама працягвалася развіццё мануфактурнай вытворчасці са спалучэннем прымусовай і вольнанаёмнай працы. Па сутнасці сваіх вытворчых сіл мануфактура супярэчыла феадальнаму спосабу вытворчасці. У 1860 г. мануфактуры Беларусі складалі 0,5 % колькасці прамысловых прадпрыемстваў, канцэнтравалі 7,7 % рабочых і далі 7,4 % прадукцыі ўсей прамысловасці.

Далейшае пашырэнне вытворчасці патрабавала новай энергетыкі, а ўдасканаленне тэхналогіі - непарыўнасці вытворчага працэсу. У Беларусь прыйшоў час тэхнічнага перавароту. Яго сутнасць заключалася ў выцясненні ручной працы сістэмай машын і механізмаў. Тэхнічны пераварот сведчыў аб якасна новай ступені ў эвалюцыі эканомікі. Пасля з'яўлення фабрычнай, машыннай індустрыі гэты працэс набываў незваротны характар.

Першы паравы рухавік у Беларусі з'явіўся на Хомскай фабрыцы (Кобрынскі павет) памешчыка В.Пуслоўскага. У 1823 г. Хомская фабрыка размяшчалася ў мураваных і драўляных пабудовах, мела 44 ткацкія станы, паравы рухавік.

вадзяны і конскі рухавікі. Сыравіна (1778 пудоў воўны) ішла як з уладанняў Пуслоўскага, так і набывалася. За год на фабрыцы было выраблена 59 725 аршынаў сукна, прададзена 51 950 аршынаў. На фабрыцы працавалі трое майстроў-замежнікаў і 481 рабочы з прыгонных сялян'.

У 1818 г. граф М.Румянцаў ухваліў прананову механіка Гомельскай эканоміі англічаніна А. Сміта аб будаўніцтве паравой лесапільні і парахода. Чарцяжы, абсталяванне і паравы рухавік за 20 тыс. руб. заказалі на пецярбургскім заводзе К.Берда. У 1824 г. адбылося выпрабаванне парахода.Так у Беларусі быў пакладзены пачатак выкарыстанню паравых рухавікоў на транспарце.

Да сярэдзіны 50-х гг. XIX ст. паравыя машыны меліся ва ўсіх галінах беларускай прамысловасці, за выключэннем сілікатнай. У 1860 г. у Беларусі было 76 прадпрыемстваў з паравымі рухавікамі і паравымі катламі агульнай магутнасцю ў 1117 к.с. і сумай вытворчасці 1926 тыс. руб. Хаця на фабрыках працавала ўдвая менш рабочых, чым на мануфактурах, фабрычная прадукцыя па кошту амаль на 1/5 пераўзыходзіла мануфактурную. Гэта дае магчымасць зрабіць выснову аб тым, што ў мануфактурна-фабрычнай прамысловасці Беларусі машынная вытворчасць стала пануючай яшчэ да адмены прыгоннага права.

З пачаткам тэхнічнага перавароту вынаходніцтва пачалі прызнаваць відам інтэлектуальнай уласнасці і яно атрымала юрыдычную абарону. У Расійскай імперыі аўтарскія правы вынаходніка сталі ахоўвацца на падставе царскага маніфеста ад 17 чэрвеня 1812 г. шляхам выдачы дзяржаўных прывілеяў. З беларускіх вынаходнікаў першы афіцыйны прывілей (67-ы ў Расійскай імперыі) атрымаў пінскі павятовы прадвадзіцель дваранства А. Скірмунт “за ўдасканальванне спосабу выпарвання цукровага сіропу”. Прывілей быў выдадзены 10 снежня 1830 г. тэрмінам на 10 гадоў.

Тэхнічнае абнаўленне беларускай народнай гаспадаркі ішло бесперапынна, з выкарыстаннем як замежнага, так і ўласнага вопыту. У адрозненне ад цэнтральных губерняў Расійскай імпсрыі, дзе тэхнічны пераварот пачаўся ў баваўнянай прамысловасці, у Беларусі лідэрам тэхнічнага прагрэсу ў першай палове XIX ст. з’яўляліся асобныя прадпрыемствы суконнай і харчовай прамысловасці.

Прамысловасць Беларусі канца XVIII - першай паловы XIX ст. у асноўным абапіралася на мясцовую сыравінную базу. Гэта і вызначыла развіццё яе вядучых галін - харчасмакавай і тэкстыльнай.

Галоўнай галіной не толькі харчовай, але і ўсёй прамысловасці дарэформеннай Беларусі было вінакурства. Гэтаму спрыялі некалькі прычын.

Па-першае, выключная манаполія на вінакурства, якая належала дваранам: так званае прапінацыйнае права, права на “вольнае вінакурства”, што існавала з часоў Рэчы Паспалітай і было захавана царскімі ўладамі. Па-другое, наяўнасць таннай сыравіны, працоўнай сілы і абсталявання. Пачынаючы з 30-х гг. XIX ст. сыравінная база пашыралася за кошт шырокага выкарыстання бульбы. Па-трэцяе, спажывецкі рынак быў побач з вытворчасцю - у першую чаргу ўласныя сяляне. Такая кан’юнктура рынка

рабіла вінакурства вельмі прыбытковай і дынамічнай галіной. У 1796 г. у Беларусі працавала 7,5 тыс. бровараў з 13,5 тыс. сезонных рабочых з гадавой вытворчасцю 2562 тыс. вядзёр спірту.

Не абышоў вінакурства і тэхнічны прагрэс. З 30-х гг. XIX ст. адбываецца паступовая замена агнявога спосабу вінакурства паравым, што на 1/3 павялічыла вытворчасць. Як вынік, пры адносным змяншэнні колькасці вінакурных заводаў іх сярэдні памер і вытворчасць узраслі больш чым у тры разы.

Новай і таксама выключна дваранскай галіной харчовай прамысловасці стала вытворчасць цукру. Вядомым беларускім цукразаводчыкам быў А.Скірмунт, які пабудаваў у 1830 г. першы ў Беларусі Моладаўскі (Кобрынскі павет) цукровы завод (існаваў па 1848 г.). У 1860 г. ён заснаваў завод у Парэччы (Пінскі павет), найбольш тэхнічна дасканалае прадпрыемства гэтага профілю ў Беларусі.

У мукамольнай прамысловасці былі прадстаўлены ўладальнікі прадпрыемстваў з усіх саслоўяў і ўсе формы арганізацыі вытворчасці: дробнатаварная, мануфактурная і фабрычная. У 1796 г. дзейнічалі 1184 мукамольныя прадпрыемствы з 1400 рабочымі, гадавым перамолам 843 тыс. пудоў зерня. Да 1860 г. іх колькасць узрасла да 1834, а гадавы перамол - да 2956 тыс. пудоў. У 1841 г. пачаў працаваць першы ў Беларусі паравы млын (Магілёў). Пазней такія млыны з’явіліся ў Пінску і Віцебску. Іх уладальнікамі былі як дваране, так і купцы (Пінск). Тытунёвыя прадпрыемствы належалі купцам і мяшчанам і размяшчаліся толькі ў гарадах.

Пачынаючы з другой чвэрці XIX ст., вельмі хутка развіваліся такія новыя для Беларусі галіны прамысловасці, як свечкавая і мылаварная. Па памерах вытворчасці і дасканаласці тэхнічнага абсталявання значна вызначаўся Альбрэхтаўскі стэарынава-свечкавы і мылаварны завод варшаўскага купца Р.Ботэ (наваколле Пінска) - адно з лепшых прадпрыемстваў у Еўропе. Асноўную сыравіну для вытворчасці - лой - набывалі на месцы ці прывозілі з Украіны. Гатовую прадукцыю збывалі ў беларускіх, польскіх і ўкраінскіх губернях. У 1860 г. завод вырабіў 10 тыс. пудоў стэарынавых свечак, 3 тыс. пудоў свечак з лою, 5 тыс. пудоў мыла на агульную суму 139,5 тыс. руб.

Таксама назіраўся даволі стойкі рост гарбарнай прамысловасці. Але яе пашырэнне мела экстэнсіўны характар і не суправаджалася ўзбуйненнем прадпрыемстваў, новымі тэхналогіямі і ўдасканаленнем абсталяванпя.

У тэкстыльнай прамысловасці ў канцы XVIII - начатку XIX ст. панавала вытворчасць палатняных, з 20-х гт. XIX ст. - ваўняных тканін. Да ліку лепшых прадпрыемстваў Беларусі належалі Альбярцінская суконная фабрыка Пуслоўскага (Слонімскі павет) і Парэцкая суконная фабрыка памешчыка Скірмунта (Пінскі павст).

Попыт на металічныя вырабы разам з высокімі цэнамі на прывазное жалеза прывёў да кароткачасовага ўздыму беларускай чорнай металургіі. З 1828 па 1860г. колькасць выплаўленага і пераробленага ў Беларусі жалеза ўзрасла з 5,3 тыс. да 245 тыс. пудоў, а сума вытворчасці - з 10,8 тыс. да 569,1

тыс. руб. Найболыш стабільна працавалі металургічныя і металаапрацоўчыя прадпрыемствы Храптовіча ў Вішневе (Ашмянскі павет), Барысаўшчынскі металургічны завод (Барысаўскі павет), Старынкаўскі чыгунаплавільны і машынабудаўнічы завод памешчыка Бенкендорфа (Чэрыкаўскі павет).

Істотных змен не адбылося ў традыцыйнай для Беларусі сілікатнай прамысловасці (шкляныя, цагельныя, кафельныя, ганчарныя і вапнавыя прадпрыемствы). Большасць з іх адносілася да дробнай прамысловасці. Выключэнне складала шкляная, дзе пераважала мануфактурная вытворчасць. На перапрацоўцы лясных багаццяў Беларусі базіраваліся шматлікія галіны лясной прамысловасці: лесапілаванне, вытворчасць будаўнічага гонту, суднабудаўніцтва, экіпажнае майстэрства, паташныя, дзягцярныя, смалакурныя і шкіпінарныя прадпрыемствы. Іх развіццё ў значнай меры вызначалася зменамі кан'юнктуры рынку і тэхналогіі.

Водныя і сухапутныя шляхі зносін. У канцы XVIII - першай палове XIX ст. беларускія губерні. у параўнанні з іншымі рэгіёнамі Расійскай імперыі, мелі болыш развітую сістэму шляхоў зносін. Гэта з'явілася вынікам інтэнсіўнага будаўніцтва водных і сухапутных шляхоў.

З 1817 г. у Расійскай імперыі пачалося будаўніцтва шашэйных дарог. Да 60-х гг. XIX ст. праз Бсларусь прайшлі такія важныя сухапутныя шляхі, як шаша Брэст - Варшава (будаўніцтва скончылася ў 1823 г., працягласць 177 вёрст), Масква - Брэст (1819 г., 1000 вёрст). Віцебск - Смаленск (І855г., 286 вёрст), Бабруйская шаша (Магілёў - Бабруйск, 1850 г., 107 вёрст). Шаша з Пецярбурга ў Кіеў, што прайшла праз беларускія землі, атрымала афіцыйную назву Беларускага тракта.

Не менш інтэнсіўна вялося будаўніцтва водных шляхоў зносін. У 1799 г. пачаліся работы па паляпшэнню Агінскага канала. З 1804 г. рух па каналу аднавіўся. У сярэдзіне XIX ст. па Агінскай воднай сістэме штогод праходзіла да 200 суднаў і больш за 500 плытоў.
Таксама быў рэканструяваны і Каралеўскі канал, які ад 9 снсжня 1846 г. пачаў звацца Дняпроўска-Бугскім. Яго важнае значэнне неаднаразова адзначала ваеннае міністэрства.

У 1797 г. імператар Павел I зацвердзіў праект будаўніцтва Бярэзінскай сістэмы, якая злучыла басейны Днянра і Заходняй Дзвіны. У 1805 г. па новаму воднаму шляху пачалася першая навігацыя. Апрача праходу суднаў, за гэты год па сістэме былі сплаўлены 5667 мачтавых дрэў, больш за 32 тыс. бярвенняў будаўнічага лесу і каля 11 тыс. брусоў з дуба. З мэтай паляпшэння ўмоў суднаходства і лесасплаву гідратэхнічныя збудаванні сістэмы неаднаразова перабудоўваліся. Так, у 1810 г. толькі на рамонце Лепельскага шлюза было занята 3 тыс. рабочых.

Мытныя спрэчкі паміж Прусіяй і Расійскай імперыяй у першай чвэрці XIX ст. прывялі да рашэння злучыць Нёман і Віслу водным шляхам у абыход прускіх зямель. Так узнік праект Аўгустоўскай воднай сістэмы на стыку беларускіх і польскіх губерняў. Яе будаўніцтва вялося ў 1824 - 1839 гг., агульныя затраты склалі больш за 2 млн руб. Да будаўніцтва чыгунак па Аўгустоўскай воднай сістэме (акрамя лесасплаву) праходзіла да 400 суднаў

штогод. Гэта сістэма была найбольш тэхнічна дасканалай (мураваныя шлюзы), найменш – Бярэзінская.

У выніку ў першай палове XIX ст. амаль усе буйныя рэкі Беларусі былі злучаны штучнымі воднымі шляхамі. К пачатку 60-х гг. даўжыня суднаходных шляхоў па пяці беларускіх губернях складала каля 4 тыс. км, а сплаўных – прыкладна ўдвая больш.

У Беларусі вялося не толькі паляпшэнне водных шляхоў. Будаваліся і новыя сродкі зносін - параходы. Так, у снежні 1836 г. у Бабруйску пачалося будаўніцтва двух параходаў магутнасню па 50 к.с. кожны для суднаходнай кампаніі, якая атрымала ад улад прывілей на дзесяць гадоў для таго, каб наладзіць параходны рух паміж Барысавам, Бабруйскам, Кіевам і Краменчугом па Бярэзіне і Дняпру. У дарэформенны перыяд па беларускіх рэках плавала 20 паравых суднаў.

У канцы XVIII ст. у Беларусі з'явілася рэгулярная паштовая сувязь. З 1781 г. існавалі тры віды паштовых адпраўленняў - пісьмы (лісты), пасылкі і грошы. З 1848 г. уводзіліся паштовыя скрынкі для збору карэспандэнцыі і так званыя "штэмпельныя куверты", якія падрыхтавалі пераход да марачнай аплаты паштовых адпраўленняў. Першая тэлеграфная кантора адкрылася ў 1816 г. у Гродне. К начатку 60-х гг. XIX ст. даўжыня тэлеграфных ліній у Беларусі дасягнула прыкладна 2 тыс. вёрст.

Развіццё капіталістычных адносін у Беларусі мела свае характэрныя рысы і нацыянальныя асаблівасці. Як і ў эпоху феадалізму, зыходнай базай для развіцця эканомікі з'яўляліся сельская гаспадарка і вёска. Менавіта там былі сканцэнтраваны эканамічная ініцыятыва, асноўныя фінансавыя, сыравінныя і працоўныя рэсурсы. У сельскай мясцовасці разгортвалася і атрыманая ў спадчыну ад феадалізму гандлёвая дзейнасць у форме перыядычнага кірмашовага гандлю. Гарады і гарадская эканоміка ў працэсс зараджэння капіталізму ў Беларусі выконвалі дапаможную ролю. Беларуская "мадэль" генезісу капіталізму рэалізавалася ва ўмовах адсутнасці ўласнай нацыянальнай дзяржавы і адпаведна ўласнай дзяржаўнай эканамічнай ініцыятывы.

**Тэма 3. Беларусь і рэфармаванне сацыяльна-эканамічнай сістэмы Расійскай імперыі ў другой палове XIX ст**.

1 лютага 1861 г. Аляксандр II падпісаў маніфест і зацвердзіў ухваленыя Дзяржаўным саветам праекты "Палажэнняў" аб адмене прыгону ў Расіі, якія атрымаді сілу закону. Закон складаўся з "Агульнага палажэння", мясцовых "Палажэнняў", "Палажэнняў" аб уладкаванні дваровых людзей, выкупе, губернскіх і павятовых па сялянскіх справах установах, а таксама дадатковых правілаў, што тычыліся асобных груп насельніцтва.

"Агульнае палажэнне" вызначала асабістыя і маёмасныя правы сялян, парадак кіравання і выканання імі казённых, земскіх і грамадскіх павіннасцей.

З адменай прыгону панскія сяляне сталі асабіста свабоднымі. Памеш чыкі былі пазбаўлены права распараджанца імі як сваёй уласнасцю,

прадаваць, закладаць, дарыць, біць, самавольна перасяляць з месца на месца і інш. Сяляне атрымалі шэраг грамадзянскіх правоў: заключаць дагаворы, узбуджаць іскі, несці асабістую адказнасць перад судом, свабодна ўступаць у шлюб, браць удзел у рабоце органаў сялянскага самакіравання, псраходзіць у іншыя саслоў, пастудаць на службу і ў навучальныя ўстановы, свабодна займацца гандлем і промысламі, валодаць рухомай і нерухомай маёмасцю. Вызваленне сялян ад прыгоннай залежнасці было адной з галоўных прагрэсіўна-гістарычных праяў рэформы.

Разам з тым у пэўнай меры захаваўся пазаэканамічны прымус сялян. Памешчыкі засталіся ўласнікамі ўсёй зямлі маёнткаў. Сяляне на працягу дзевяці гадоў па-ранейшаму былі прымацаваны да надзелаў. Да заключэння выкупных здзелак сяляне былі на становішчы "часоваабавязаных". Але і пасля заканчэння зазначанага гэрміну селянін толькі з дазволу памешчыка меў права выкупу палявой зямлі. Пры гэтым сядзібу яны маглі выкупіць адразу, без дазволу землеўласніка. Памеры надзелаў вызначаліся канчаткова, сяляне пазбаўляліся права прырэзкі зямлі ў будучым. Яны былі звязаны кругавой парукай у спраўным адбыванні павіннасцей дзяржаве, а пры абшчынным карыстанні ўсімі ўгоддзямі - і памешчыку, падлягалі цялесным пакаранням у сялянскіх валасных судах. Да спынення часоваабавязаных адносін памешчыкі захоўвалі права вотчыннай паліцыі ў сялянскай грамадзе і апекі над сялянамі. З пераходам на выкуп часоваабавязанае становішча спынялася, і сялян залічвалі ў разрад сялян-уласнікаў.

Мясцовыя "Палажэнні" вызначалі парадак надзялення сялянства зямлёй і выканання павіннасцей за карыстанне ёю. У Беларусі рэфармаваннем былі ахоплены 1860,3 тыс. (78 %) душ абодвух полаў прыватнаўласніцкіх сялян. Рэформа праводзілася паводле агульных узаконенняў і двух мясцовых "Палажэнняў". На Магілёўскую і Віцебскую (акрамя Дрысенскага і латгальскіх паветаў) губерні распаўсюджвалася мясцовае "Палажэнне" для губерняў вялікарасійскіх, наварасійскіх і беларускіх. У Віленскай, Гродзенскай, Ковенскай, Мінскай губернях, Дрысенскім і латгальскіх паветах Віцебскай губерні дзейнічала асобнае мясцовае "Палажэнне".

Наяўнасць двух мясцовых "Палажэнняў" тлумачыцца найперш сацыяльна-эканамічнымі матывамі.

Да адмены прыгону ў панскіх маёнтках усходніх паветаў Беларусі, падобна да рускіх губерняў, існавала сялянскае абшчыннае землекарыстанне. якое распаўсюджвалася на ўсе ўгоддзі. Павіннасці на карысць памешчыкаў вызначаліся з цягла, але фактычна сяляне адбывалі іх з рабочай душы. У другой палове 40-х - 50-я гг. XIX ст. у мностве панскіх маёнткаў гэтага рэгіёна абавязковыя інвентары не былі ўведзены. У заходніх жа і цэнтральных паветах Беларусі, як і ў Літве, панскія сяляне карысталіся ворнай і сенакоснай зямлёй падворна, а сялянскія павіннасці на карысць памешчыкаў вылічвалі з падворнага зямельнага ўчастка у адпаведнасці з абавязковымі інвентарамі. Акрамя таго, тут мелася значная праслойка малазямельных сялян - агароднікаў і бабылёў, больш ужывалася

парабкоўская наёмная праца. Прымаючы асобнае "Палажэнне" для Заходняй, Цэнтральнай Беларусі і Літвы, царызм кіраваўся таксама палітычнымі меркаваннямі. Урад баяўся сялянскага руху ў гэтым рэгіёне. які межаваў з Каралеўствам Польскім, Прыбалтыкай, Прусіяй, дзе сяляне ўжо карысталіся асабістай свабодай. Апрача таго, царскае самадзяржаўе лічыла больш апазіцыйнай да сябе мясцовую апалячаную шляхту.

Мясцовыя "Палажэнні" аддавалі перавагу "добраахвотным пагадненням" сялян з памешчыкамі аб памерах надзелаў і павіннасцей. Калі ж такое было немагчыма, уступалі ў сілу нормы, вызначаныя гэтымі "Палажзннямі". У апошнім выпадку велічыня надзелаў і павіннасцей сялян на ўсходзе і захадзе Беларусі вызначалася на аснове розных прыпцыпаў.

Паводле мясцовага "Палажэння" для рускіх, паўднёваўкраінскіх і ўсходнебеларускіх губерняў, у Віцебскай (8 паветаў) і Магілёўскай губернях, як і ў цэнтральных рэгіёнах Расіі, была ўстаноўлена вышэйшая і ніжэйшая норма надзелу. У гэтых месцах Беларусі памеры вышэйшага душавога надзелу па асобных паветах вагаліся ад 4 да 5,5 лзесяціны, а ніжэйшага - ад 1,3 да 1,8 дзесяціны. Калі дарэформенны надзел перавышаў вышэйшую норму, то памешчык меў права адрэзаць лішак зямлі на сваю карысць. У выпадку калі ў памешчыка заставалася менш за 1/3 агульнай плошчы ўгоддзяў маёнтка, ён мог утрымаць за сабой да трэці ўсіх прыдатных зямель. Са згоды сялян землеўласнік атрымаў права памяншаць надзел да чацвяртнога (1/4 вышэйшага), зато даваўся бязвыплатна ("дармовы", або "жабрацкі" надзел).

За сялянамі, за выключэннем адзначаных вышэй выпадкаў, павінны былі захоўвацца надзельныя землі, якімі яны карысталіся да рэформы.

Паводле мясцовага "Палажэння" для Віленскай, Гродзенскай, Ковенскай, Мінскай і часткі Віцебскай губерняў, за сялянскай грамадой замацоўваліся надзельныя землі, якія знаходзіліся ў пастаянным карыстанні сялян да 19 лютага 1861 г. Аднак калі памер надзелу быў вышэйшы за інвентарны ці ў памешчыка заставалася менш чым 1/3 угоддзяў маёнтка, праводзілася адпаведная адрэзка сялянскай зямлі.

Згодна з "Палажэннямі", за пастаяннае карыстанне надзельнай зямлёй часоваабавязаныя сяляне да пераводу на выкуп павінны былі па-ранейшаму адбываць грашовыя (аброк) і адпрацовачныя (паншчына), феадальныя павіннасці. Іх памер вызначаўся ўстаўнымі граматамі. Сяляне ўносілі аброк там, дзе плацілі яго да рэформы або адбывалі ў эпоху феадалізму змешаныя павіннасці - аброчную і паншчынную. Сяляне, якія да 1861 г. знаходзіліся на паншчыне, павінны былі адбываць яе і пасля адмены прыгону.

Мясцовае "Палажэнне" для рускіх, паўднёваўкраінскіх і ўсходнебеларускіх губерняў вызначала памеры павіннасцей адпаведна велічыні душавога надзелу. Паволле яго, сяляне павінны былі абкладвацца аброкам да тых памераў, у якіх апошні збіраўся з іх на час адмены прыгону.

Паводле мясцовага "Палажзння" для заходнебеларускіх і літоўскіх губерняў, у аснову вызначэння памераў аброку і паншчыны была пакладзена агульная вартасць павіннасцей з надзельнага ўчастка, азначаных у інвентары

маёнтка. Гранічная велічыня сялянскіх плацяжоў у параўнанні з інвентарнымі некалькі зніжалася, вызначаўся максімум іх не вышэй чым 3 руб. з дзесяціны палявога надзелу ў год. Аднак і такі аброк быў не пад сілу для аброчных сялян.

Праз два гады пасля абвяшчэння рэформы сяляне атрымалі права пераходу з паншчыны на аброк, пры ўмове адсутнасці нядоімак па падатках дзяржаве і павіннасцях памешчыку, а таксама выплаты аброку апошняму за паўгода наперад.

Надзельную зямлю сяляне набывалі на аснове "Палажэння аб выкупе", агульнага для ўсёй Расійскай імпсрыі. Вартасць надзелу па выкупу вылічвалі шляхам капіталізацыі аброку з 6% гадавых. Выкупную аперацыю праводзіла дзяржава, якая выдавала сялянам выкупную пазыку. Пры згодзе сялян на выкуп, калі яны атрымлівалі поўны надзел, гэты пазык складаў 80% выкупной сумы, пры паменшаным надзеле - 75 %. Астатнюю частку выкупной сумы (20 - 25 %) сяляне павінны былі выплаціць памешчыку наяўнымі пры заключэнні выкупнога пагаднення.

Фактычна выкуплялася не зямля, а феадальныя паншчынная і аброчная павіннасці сялян на карысць памешчыка.

Пачатак паўстання ў Каралеўстве Польскім прымусілі царскі ўрад стаць на шлях лавіравання, пайсці на пэўныя ўступкі былым прыгонным, каб прыцягнуць іх на свой бок. Указам ад 1 сакавіка 1863 г. у Віленскай, Гродзенскай, Мінскай, Ковенскай губернях, Дрысенскім і латгальскіх паветах Віцебскай губерні абавязковыя адносіны паміж сялянствам і памешчыкамі спыняліся з 1 мая гэтага ж года. Уводзіўся абавязковы выкуп са зніжэннем аброчных і адпаведна ім выкупных плацяжоў. Сялян, што адбывалі паншчыну, пераводзілі на аброк з памяншэннем яго на 20 % супраць аброчных плацяжоў, вызначаных устаўнымі граматамі. Для праверкі гэтых плацяжоў былі створаны павятовыя паверачныя камісіі. Яны ж павінны былі складаць выкупныя акты. 2 лістапада гэтага ж года быў выдадзены ўказ аб спыненні з 1 студзеня 1864 г. абавязковых адносін у Магілёўскай губерні, беларускіх і рускіх паветах Віцебскай губерні. Тут таксама былыя панскія сяляне пераведзены на абавязковы выкуп са зніжэннсм выкупных плацяжоў адносна аброчных на 20 %. Функцыі паверачных камісій выконвалі павятовыя міравыя з'езды.

Датэрміновы перавод сялян на выкуп прымусіў царскія ўлады займацца сервітутамі і агульнымі пашамі. Ва ўстаўных граматах яны нават не ўпаміналіся, што давала магчымасць памешчыкам пазбаўляць сялян гэтых угоддзяў. Пры складанні выкупных актаў, акрамя надзельнай зямлі, за сялянствам замацоўвалася права на сервітутныя і агульныя ўгоддзі да іх развярстання.

**Рэформа 1867 г. у дзяржаўнай вёсцы**. Вызваленне панскага сялянства ад прыгоннай залежнасці паставіла на парадак дня пытанне аб пазямельным уладкаванні іншых груп сельскага насельніцтва, у тым ліку казённых сялян. У Беларусі ў 1858 г. іх налічвалася 468,8 тыс. (19,7 %) душ абодвух полаў. Яны пражывалі галоўным чынам у заходніх і паўночных паветах. Асноўныя

прынцыпы рэформы на панскіх землях, эмяненне ўмоў яе згодна з указамі ад 1 сакавіка і 2 лістапада 1863 г. былі раснаўсюджаны на дзяржаўнае сялянства заходніх губерняў.

16 мая 1867 г. быў прыняты закон аб рэформе дзяржаўнай вёскі Беларусі, Літвы і Правабярэжнай Украіны. Дзяржаўных сялян перавялі на абавязковы выкуп і прылічылі да так званых сялян-уласнікаў у адрозненне ад казённага сялянства рускіх губерняў, Левабярэжнай і Паўднёвай Украіны, дзе на аснове закона ад 24 лістапада 1866 г. надзельная зямля знаходзілася толькі ў іх пастаянным карыстанні. За сялянамі замацоўваліся надзелы, якімі яны пастаянна карысталіся да часу правядсння рэформы 1867 г. Для ўладкавання гаспадаркі сялян дапускаліся як прырэзка да сялянскіх надзелаў з запасных і іншых свабодных дзяржаўных зямель, так і абмен сялянскіх надзелаў на казённыя зямельныя ўчасткі. Але, як і панскае, дзяржаўнае сялянства не мела права павялічваць памеры надзелаў пасля правядзення рэформы.

Велічыню надзельных зямельных участкаў і суму выкупных плацяжоў вызначалі люстрацыйныя камісіі, якія складалі люстрацыйныя акты. Яны былі адэкватныя выкупным актам былых панскіх сялян. Для іх складання і зацвярджэння быў прадугледжаны тэрмін: у Віленскай і Гродзенскай губернях - тры гады, у Мінскай - чатыры, у Віцебскай і Магілёўскай шэсць гадоў. Пры вызначэнні велічыні выкупу зыходзілі з сумы паменшаных на 10 % выкупных плацяжоў былога прыватнаўласніцкага сялянства суседніх з казённымі панскіх маёнткаў. Тэрмін пагашэння выкупнога доўгу складаў 46 гадоў. У адрозненне ад панскіх сялян ніякай пазыкі ад казны дзяржаўныя сяляне не атрымлівалі, што моцна ўскладняла выкуп. Да 1871 г. па Гродзенскай губерні было зацверджана 1635 (99,4 %) люстрацыйных актаў, Віленскай – 3958 (97,5 %), Мінскай - 969 (96,9 %). У Віцебскай і Магілёўскай губернях складанне і зацвярджэнне іх было завершана ў сярэдзіне 70-х гг.

Надзельнае землеўладанне былога казённага сялянства Беларусі на 1877 г. параўнальна з 1858 г. павялічылася на 185,5 тыс. (14,7 %) дзесяцін. Аднак за гэты час колькасць двароў дзяржаўных сялян узрасла на 18,8 тыс. (30 %).

**Іншыя аграрныя рэформы.** Разам з былымі панскімі і казённымі сялянамі, што складалі асноўную масу сялянства, у Беларусі ў 60-90-я гг. XIX ст. было праведзена рэфармаванне іншых, невялікіх саслоўных груп сялян - удзельных, вольных людзей, старавераў,сельскіх чыншавікоў, праваслаўных арандатараў, а таксама аднадворцаў. Выкупныя плацяжы вольных людзей 2-га разраду (абеззямеленых пасля 1857 г.), старавераў, сельскіх чыншавікоў, праваслаўных арандатараў былі значна вышэйшыя за выкуп былых панскіх і асабліва дзяржаўных сялян. Пры вялікіх памерах выкупной сумы большасць усіх гэтых сялян-арандатараў была пазбаўлена магчымасці выкупу арандаваных панскіх зямельных угоддзяў. Памешчыкі адмаўлялі ім у арэндзе зямлі, выганялі з маёнткаў.

Такім чынам, рэформа 1861 г. у Беларусі, як і ў іншых рэгіёнах Расійскай імперыі, паклала пачатак новай. капіталістычнай грамадска-эканамічнай фармацыі. Змест рэформы быў буржуазны. Адмена прыгону

стварыла ўмовы для ўсталявання капіталістычнага спосабу вытворчасці, свабодных дагаворных вытворчых адносін. Сяляне з вытворцаў з пераважна натуральнай гаспадаркай ператвараліся ў таваравытворцаў буржуазнага грамадства, усё больш уцягваліся ў сферу рынку. Буржуазнымі па свайму зместу з'яўляліся таксама іншыя аграрныя рэформы другой паловы XIX ст. Ліквідацыя ў выніку рэформаў саслоўных катэгорый сялянскага насельніцтва і стварэнне класа дробназямельных уладальнікаў аб'ектыўна былі накіраваны на развіццё капіталістычных адносін на беларускай вёсцы.

Павелічэнне вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі на продаж было абумоўлена развіццём прамысловасці, чыгуначным будаўніцтвам, ростам гарадскога насельніцтва і пралетарызацыяй вясковай беднаты. Пашырэнню гандлёвых сувязяў сельскай гаспадаркі Беларусі садзейнічала таксама наяўнасць шырокай сеткі зручных водных зносін і параўнаўча густой сеткі чыгуначных шляхоў, што звязвалі яе са знешнімі і ўнутранымі рынкамі Расіі. Тут была сканцэнтравана вялікая колькасць войскаў, што патрабавала значных паставак сельскагаспадарчых прадуктаў.

Развіццё капіталізму ў сельскай гаспадарцы выяўлялася перш за ўсё ў пашырэнні вытворчасці, асабліва таварнай прадукцыі, інтэнсіфікацыі і паглыбленні спецыялізацыі земляробства, узмацненні ўжывання машын і ўдасканаленых прылад працы, паляпшэнні агракультуры, пашырэнні скарыстання вольнанаёмнай рабочай сілы, выцясненні напаўпрыгонніцкіх формаў гаспадарання капіталістычнымі. Асноўнай галіной земляробства параней шаму заставалася збожжавая гаспадарка. У парэформенны перыяд у вытворчасці збожжа быў зроблены значны крок наперад. Паводле афіцыйных звестак, у 1898 - 1900 гт. у параўнанні з 1861-1870 гг. сярэднегадавы чысты збор (за вылікам насення) збожжавых культур на сялянскіх надзельных і прыватнаўласніцкіх землях Беларусі вырас з 44,5 млн да 106,1 млн пудоў, або ў 2,4 раза. Характэрна, што за гэты час іх пасяўная плошча павялічылася толькі на 28,8 %. Павелічэнне збору збожжавых, асабліва на панскай зямлі, адбывалася пераважна за кошт інтэнсіфікацыі іх вытворчасці. За адзначаны перыяд сярэдняя ўраджайнасць збожжавых культур павысілася з 25,7 да 40 пудоў з дзесяціны (у 1,6 раза).

У канцы XIX ст. Беларусь, як і іншыя рэгіёны Расійскай імперыі, ахапіў аграрны крызіс. Назіралася рэзкае паніжэнне цэн на збожжа, абумоўленае прытокам на еўрапейскія рынкі танных збожжавых і вырабаў з іх з ЗША. Канады, Аргенціны, Аўстраліі. У 1887 г. параўнальна з 1881 г. у пяці заходніх губернях асеннія цэны на жыта панізіліся ў сярэднім у два разы. Істотна, хаця ў меншых памерах, упалі цэны на пшаніцу, авёс. ячмень.

У гэтых умовах памешчыкі і сялянская буржуазія пачалі пераарыентоўваць сваю гаспадарку на жывёлагадоўлю, перш за ўсё малочную, што прыносіла большы прыбытак.

У канцы XIX ст. пры павелічэнні попыту на малочныя прадукты і павышэнні цэн на іх малочная жывёлагадоўля стала вядучай таварнай спецыялізаванай галіной сельскай гаспадаркі Беларусі. Многія памешчыкі, радзей заможныя сяляне, заводзілі жывёлу палепшаных парод - галандскай,

сіментальскай, цірольскай, халмагорскай, швіцкай і інш. Расла тэхнічная перапрацоўка малочных прадуктаў. У маёнтках адкрываліся сыраварныя і масларобчыя эаводы. У гэты перыяд іх налічвалася не менш чым 200. .

Таксама адбывалася спецыялізацыя сельскагаспадарчай вытворчасці на мясной жывёлагадоўлі. У маёнтках і заможных сялянскіх гаспадарках практыкаваўся адкорм буйной рагатай жывёлы на продаж. Яшчэ большае развіццё, асабліва ў сялян, атрымала свінагадоўля і гандаль яе прадукцыяй. У панскіх гаспадарках, галоўным чынам заходніх і цэнтральных паветаў, першы час пасля адмены прыгону важнае прамысловае значэнне захоўвала танкарунная авечкагадоўля. У 1861 г. памешчыкі Беларусі трымалі звыш 600 тыс. авечак-мерыносаў, з якіх было атрымана 28 тыс. пудоў воўны на паўмільёна рублёў. Аднак з-за канкурэнцыі болыш таннай прывазной воўны танкарунная авечкагадоўля паступова прыходзіла ў заняпад. К пачатку 80-х гг. у маёнтках захавалася 183 тыс. мерыносавых авечак, у 1901 г. - толькі 95,4 тыс.

Аб паглыбленні спецыялізацыі сельскай гаспадаркі сведчыць вытворчасць тэхнічных і кармавых культур, сярод якіх першае месца займала бульба.

Рост бульбаводства быў абумоўлены ў першую чарту развіццём вінакурнай вытворчасці. Паволле няпоўных даных, у сярэдзінс 60-х гг. XIX ст. у пяці заходніх туберннях мелася звыў тысячы дзеючых невялікіх вінакурань, к пачатку XX ст. - 430 вінакурных заводаў. Амаль усе яны належалі памешчыкам.

У другой палове 90-х гг. XIX ст. сярэдняя штогадовая вытворчасць 40-градуснага разбаўленага спірту ў пяці беларускіх губернях складала больш за 8 млн. вёдзер. Ен збываўся на мясцовым рынку, вывозіўся ў іншыя рэгіёны імперыі і ў невялікай колькасці за мяжу. Адыходы вінакурства (брага) выкарыстоўваліся на корм жывёле. Бульбу збывалі таксама на крухмала-патачныя заводы.

Бровары ўяўлялі сабою буйныя капіталістычныя прадпрыемствы і надавалі такі ж характар усім тым панскім гаспадаркам, у якіх яны былі пабудаваны. Рост вінакурства, іншых галін сельскагаспадарчага прадпрымальніцтва (мукамольнага, масларобчага, сыраварнага, алейнага, суконнага і г.д.) адыгрываў важную ролю ва ўсталяванні капіталістычных адносін у сельскай гаспадарцы. Пашырэнне гэтага прадпрымальніцтва вяло да перабудовы панскіх і заможных сялянскіх гаспадарак на капіталістычных пачатках.

Выключна важную ролю ва ўсталяванні капіталістычных адпосін у вёсцы адыгрывала прымяненне машын і палепшаных прылад працы. Выкліканае ростам капіталізму ў сельскай гаспадарцы прымяненне машын у земляробстве ў сваю чаргу насіла капіталістычны характар, г.зн. вяло да ўтварэння капіталістычных адносін і іх далейшага развіцця.

Скарыстанне машын і палепшаных прылад працы садзейнічала выцясненню адпрацовак наёмнай працай.

**Прамысловасць. Транспарт. Гандаль. Крэдыт.**

Усе тры асноўныя формы арганізацыі прамысловасці XIX ст. - дробнатаварная, мануфактурная і фабрычная вытворчасць - склаліся яшчэ ў дарэформеннай Беларусі. Пасля адмены прыгоннага права і рэформаў 60-70-х гг. XIX ст. яны захаваліся і атрымалі далейшае развіццё. Пры гэтым значна ўзрасла роля фабрычна-заводскай прамысловасці, якая ўпэўнена заняла дамінуючае мссца ў прамысловым сектары беларускай эканомікі. Яна з'яўлялася лідэрам тэхнічнага прагрэсу, выключна на ёй базіравалася новая для Бсларусі вытворчасць прамысловых тавараў.

Мануфактурная і дробнатаварная вытворчасць хаця і саступала фабрычна-заводскай па тэхнічнаму ўзбраенню і ступені канцэнтрацыі прадукцыйных сіл, у агульным памсры вытворчасці займала значнае месца. Паралельнае існаванне, а не аўтаматычная змена рамяства - мануфактурай і мануфактуры - фабрыкай, не свсдчыла аб агульнай адсталасці беларускай прамысловасці. Справа ў тым, што тэхнічны ўзровень таго часу дазваляў весці машынную перапрацоўку далёка не ўсіх сыравінных рэсурсаў Беларусі, а наяўнасць значнага лішку танных працоўных рук па-свойму стрымлівала тзхнічны прагрэс. Гэтым і тлумачыцца трываласць у эканоміцы Беларусі дробнатаварнай вытворчасці і мануфактуры.

Фабрычна-заводская вытворчасць, заснаваная на скарыстанні машын, засведчыла сваю жыццяздольнасць ва ўсіх галінах беларускай прамысловасці. Асабліва бурнае развіццё фабрыкі і заводы Беларусі атрымалі ў канцы XIXст. Гэты перыяд можна лічыць пачаткам індустрыялізацыі. Прычым на працягу 80-90-х гг. XIX ст. у Бсларусі было пабудавана ў чатыры разы больш прадпрыемстваў, чым у двух папярэдніх дзесяцігоддзях (па Расійскай імперыі - у 2,6 раза).

Важным паказчыкам індустрыялізацыі з'яўляенца рост энергетычнай узброенасці прамысловасці. У пачатку 90-х гг .у Беларусі дзейнічала 294 паравыя рухавікі агулынай магутнасцю 5346 к.с., у 1900 г. - 527 рухавікоў магутнасцю 12 268 к.с.' У 1889 г. пры Добрушскай папяровай фабрыцы (Гомельскі павет) пачала дзейнічаць першая ў Беларусі электрастанцыя.

Да ліку буйнейшых і найбольш тэхнічна дасканалых прадпрыемстваў не толькі Беларусі, але і ўсёй Расійскай імперыі належалі Добрушская (Магілёўская губерня) папяровая фабрыка, суконныя фабрыкі ў Альбярціне (Гродзенская губерня) і Парэччы (Мінская губерня). Яны, як і шэраг іншых беларускіх прадпрыемстваў, неаднаразова ўдзельнічалі ў расійскіх і замежных выстаўках і атрымлівалі высокія ўзнагароды, што сведчыла аб адпаведнасці іх прадукцыі еўрапейскім і сусветным узорам.

Сваю нішу ў прамысловасці Бсларусі знайшла і такая форма арганізацыі вытворчасці, як акцыянсрныя таварыствы. Далёка не ўсе з іх змаглі паспяхова весці эканамічную дзейнасць. але ў канцы XIX ст. у Бсларусі існавала каля дзесяці акцыянерных таварыстваў. Прыкладам найбольш выдатнай канцэнтрацыі рэсурсаў у форме акцыянернага капіталу з'яўлялася "Таварыства Добрушскай князя Паскевіча папяровай фабрыкі".

Яно было заснавана ў 1877 г. з капіталам у 550 тыс. руб., падзеленых на 550 акцый.

Усяго за 40 парэформенных гадоў сума фабрычна-заводскай вытворчасці ў Беларусі ўзрасла з 1,9 да 72,1 млн руб. (у 38 разоў), у той час як мануфактурнай - у 14 разоў, дробнатаварнай — у 3.1 раза. Колькасць фабрык і заводаў узрасла з 76 да 1137 (у 15 разоў), мануфактур - у 5,4 раза, дробных прадпрыемстваў - у 1,2 раза.

Да 80-х гг. XIX ст. чыгункі ў Беларусі будаваліся прыватнымі акцыянернымі кампаніямі, з удзелам замежнага, у прыватнасці англійскага, капіталу. З пачатку 80-х гг., у сувязі з правядзеннем дзяржаўнай рэарганізацыі ўсёй сістэмы чыгуначнага транспарту, пачаўся выкуп прыватных чыгунак у казну.

Індустрыялізацыя ахапіла і водны транспарт. Колькасць паравых суднаў па рэках Беларусі за 1860-1900 гг. узрасла з 20 да 164.

Статыстыка чыгуначных і водных шляхоў зносін дастаткова выразна сведчыць аб эканамічным уздыме беларускіх губерняў у другой палове XIX ст. У 1866-1900 гг. агульны грузаабарот чыгуначнага і воднага транспарту края павялічыўся ў 18,3 раза, з 19,6 млн да 357,7 млн пудоў.

Паштова-тэлеграфная сувязь надзейна звязвала паміж сабою губернскія і павятовыя гарады Беларусі, хаця ў сельскай мясцовасці назіраўся недахоп камунікацыйных сродкаў.

Даволі хутка з’явіўся ў Беларусі новы сродак сувязі - тэлефон, які ў 1876 г. вынайшаў амерыканец А.Бэл. Першая ў беларускіх губернях тэлефонная сетка належала прыватнай асобе. 18 снежня 1882 г. Міністэрства ўнутраных спраў дазволіла будаўніцтва тэлефонных ліній уладальніку Гомельскага маёнтка графу І.Паскевічу-Эрыванскаму. У Мінску тэлефонная сетка для службовага карыстання была наладжана ў 1890 г. У 1896 г. Мінск – першы з беларускіх гарадоў - атрымаў тэлефонную станцыю грамадскага карыстання.

**Фінансава-крэдытныя ўстановы**. Фінансавая сістэма парэформеннай Расійскай імперыі не надта садзейнічала паспяховаму вядзенню эканамічных спраў.

Дзяржаўны банк Расійскай імперыі быў заснаваны ў 1860 г. У адрозненне ад класічных цэнтральных эмісійных банкаў, ён займаўся не толькі эмісійнай справай (г.зн. выпускам грошай у абарот), але і ўзначаліў усю крэдытную сістэму дзяржавы, захаваў функцыю буйнейшага камерцыйнага банка. Аддзяленні Дзяржбанка ў 1881 - 1885 гг. былі арганізаваны ва ўсіх беларускіх губернскіх гарадах. Па колькасці ўлічаных вэксаляў мінскае аддзяленне Дзяржбанка на рубяжы вякоў займала пятае месца ў Расійскай імперыі.

У якасці саслоўных крэдытных устаноў дзейнічалі іпатэчныя дзяржаўныя банкі - Сялянскі пазямельны банк (з 1883 г. ), Дваранскі зямельны банк (з 1885 г.) і прыватны Віленскі акцыянерны зямельны банк. якія мелі ў Беларусі свае філіялы.

У 1873 г. пачаў сваю дзейнасць Мінскі камерцыйны банк - буйнейшы прыватны банк Беларусі. У 1875 г. дэлегаты ад яго прынялі ўдзел у рабоце першага расійскага з'езда прадстаўнікоў акцыянерных банкаў камерцыйнага крэдыту, які разгледзеў пытанні аб аднолькавай форме банкаўскіх справаздач і ўзаемных адносінах акцыянерных банкаў паміж сабой і з Дзяржаўным банкам.

**Беларускі рынак, унутраны і знешні гандаль**. У гандлі імкліва падала значэнне кірмашоў. У 1868 г. на іх было прададзена тавараў крыху больш. чым на 1 млн руб., ці амаль што ўдвая менш, як у 1860 г.

Кірмашы, якія захаваліся, набывалі рысы гандлёвых біржаў, дзе ішоў не столькі непасрэдны гандаль таварамі, колькі адбываліся гандлёвыя аперацыі, заключаліся здзелкі.

Рост урбанізацыі Бсларусі прывёў да значнага пашырэння рознічнага гандлю. Так, у канцы XIX ст. гандаль у крамах сканцэнтраваў 95 % усяго гарадскога ўнутранага гандлёвага абароту.

Як і раней, сярод тавараў, што вывозіліся з беларускіх губерняў, пераважалі прадукцыя сельскай гаспадаркі і лясныя матэрыялы.

Паляпшэнне шляхоў зносін і поспехі ў развіцці беларускай прамысловасці прывялі да значнага павелічэння ў беларускім экспарце гатовых вырабаў. У першую чаргу гэта была прадукцыя фабрык і заводаў - спірт, тытунёвыя вырабы, папера, запалкі, лесахімічная прадукцыя, ваўняныя тканіны, будаўнічыя матэрыялы.

### Тэма 4. Сталыпінская мадэрнізацыя і Беларусь.

Сельскае насельніцтва няспынна расло. 3 1897 да 1913 г. у Беларусі яно павялічылася з 5815,1 тыс. да 7870 тыс. чалавек (34.6 %). Натуральны прырост сям,і прымушаў сялян заворваць пашы, сенажаці, пашыраць плошчу ворнай зямлі.

За кошт "вымывання" серадняцкіх слаёў вёскі ў пачатку XX ст. назіралася далейшае паглыбленне класавай дыферэнцыяцыі сялянства на сялянскую буржуазію, галоўным чынам дробную, і сельскі пралетарыят, пераважна з надзелам. Зыходзячы з размсркавання колькасці коней, зямлі, а таксама скарыстання наёмнай працы парабкаў "верхняй" групай сялян, можна сцвярджаць, што ў Беларусі з канца XIX ст. да пачатку Першай сусветнай вайны ўдзельная вага сялянскіх серадняцкіх двароў зменшылася прыкладна з 30 да 20%, а бядняцкіх - павысілася з 60 да 70 %, сялянскай буржуазіі з 8 да 11 %. Класавая дыферэнцыяцыя сялянства была як акаснай з'явай у сацыяльным развіцці капіталістычнай вёскі. У канцы гэтага перыяду дадзены працэс па-ранейшаму быў яшчэ далёкі ад завяршэння.

Першая Расійская рэвалюцыя 1905-1907 гг. прымусіла царызм зрабіць круты паварот у аграрнай палітыцы, стаць на шлях паскарэння капіталістычнага развіцця вёскі.

Мэтай рэформы было развіццё капіталізму ў сельскай гаспадарцы пры захаванні панскіх латыфундый. Такім чынам урад імкнуўся прадухіліць аграрна-сялянскую рэвалюцыю і ўзмацніць рост эканомікі краіны.

Сталыпінская рэформа ажыццяўлялася шляхам ліквідацыі сялянскага надзельнага землеўладання, насаджэння дробнакапіталістычнай сялянскай зямельнай уласнасці і хутарской формы землеўладання, перасялення часткі беззямельных і малазямельных сялян у Сібір, наДалёкі Усход, у Казахстан, на Каўказ, у Сярэднюю Азію і іншыя ўскраінныя рэгіёны імперыі. Умовай правядзення гэтых мерапрыемстваў з'яўлялася разбурэнне сельскай пазямельнай абшчыны.

Паводле ўказа ад 9 лістапада 1906 г. пры абшчынным землеўлаланні кожны гаспадар дома, які меў у сваім карыстанні надзельную зямлю, атрымаў права выхаду з абшчыны і замацавання зямельнага надзелу ў асабістую ўласнасць. Аднак яна была абмежаваная, бо сялянскія надзельныя землі дазвалялі прадаваць выключна сялянам, а закладваць толькі ў Сялянкім пазямельным банку. Выхад з сельскай пазямельнай абшчыны праводзіўся на працягу месяца з дня падачы заявы рашэннсм (прыгаворам) агульнага сходу сялян-гаспадароў дамоў простай большасцю галасоў. Калі сельская грамада такой згоды не давала, дазволіць выйсці з абшчыны мог земскі ўчастковы начальнік. У тых абшчынах, дзе на працягу апошніх 24 гадоў не было агульных зямельных перадзелаў, гаспадар дома, які жадаў выйсці з абшчыны, меў права атрымаць у асабістую ўласнасць усю зямлю, якой фактычна карыстаўся, апрача арандаванай. У перадзельных жа абшчынах кожны, хто выходзіў, павінен быў заплаціць грамадзе за лішак зямлі, які перавышаў душавую норму па ацэнцы 1861 г. Такая плата была ў два-тры разы больш нізкая, чым рыначная цана на зямлю. Гэта давала магчымасць сялянскай буржуазіі танна скупляць абшчынныя землі. Адзначаны ўказ пакінуў у сіле ранейшае заканадаўчае палажэнне, згодна з якім надзельная зямля падворнага ўладання магла адчужацца шляхам продажу ці дарэння толькі асобам, прыпісаным да сельскай грамады. Гэта рабілася з мэтай забеспячэння побыту сялян і іх падатказдольнасці перад казной. Пры выхадзс з пазямельнай абшчыны за сялянамі захоўвалася права карыстання надзельнымі землямі, што заставаліся ў агульным уладанні, - выганамі, пусткамі, ляснымі і іншымі ўгоддзямі. Указ прадугледжваў і адвядзенне ім хутароў і адрубоў на магчымасці ў адным месцы. Дазваляўся і пераход цэлай грамады з абшчынным або падворным землеўладаннем на адрубы пры згодзе 2/3 членаў сельскага сходу.

У кастрычніку 1908 г. указ ад 9 лістапада 1906 г. быў унесены на разгляд III Дзяржаўнай думы, якая зацвердзіла яго з некаторымі змяненнямі і папраўкамі. Затым ён быў ухвалены Дзяржаўным саветам, зацверджаны Мікалаем II і згодна з датай зацвярджэння стаў называцца законам 14 чэрвеня 1910 г. Гэты закон паскорыў разбурэнне пазямельнай абшчыны і ўсталяванне сялянскай прыватнай уласнасці на зямлю. Калі ўказ ад 9 лістапада дазваляў добраахвотны выхад з абшчыны, то закон ад 14 чэрвеня рабіў яго абавязковым для беспера дзельных ссльскіх абшчын. Такімі лічыліся абшчыны, дзе не было агульных перадзелаў з часу надзялення сялян зямлсй. Уся надзельная зямля ў іх прызнавалася асабістай уласнасцю гаспадароў дамоў, а сяляне лічыліся перайшоўшымі да падворна-ўчастковага

землеўладання. Іншыя артыкулы закона ад 14 чэрвеня 1910 г. прадуглсджвалі абавязковае стварэннс хутарскіх ці адрубных гаспадарак у грамадзе, дзе праводзіўся агульны перадзел. Паводле новага закону, для выхаду на хутары і адрубы ўжо не патрабавалася згоды большасці сялян. Для гэтага дастаткова было набраць толькі 1/5 галасоў у той сельскай грамадзс, у якой колькасць гаспадароў дамоў не перавышала 250 чалавек, а там, дзе перавышала, заручыцца падтрымкай 50 гаспадароў дамоў. У сельскай грамадзе з падворным землеўладаннем і ў беспередзельных абшчынах пры пераходзе на адрубныя ўчасткі згодна з новым законам, патрабавалася рашэнне простай большасці гаспадароў дамоў замест 2/3, як гэта прадугледжвалася ўказам ад 9 лістапада1906 г.

Непасрэднае ажыццяўленне рэформы было ўскладзена на губернскія і павятовыя землеўпарадкавальныя камісіі, створаныя ўрадам яшчэ ў сакавіку 1906 г. Павятовыя землеўпарадкавальныя камісіі з'яўляліся галоўнымі органамі па правядзснні землеўпарадкавання на месцах. Яны складаліся з павятовага маршалка (ён жа старшыня), старшыні павятовай земскай управы. асобы, прызначанай Галоўным упраўленнем землеўпарадкавання і земляробства, павятовага члена акруговага суда, падатковага інспектара, земскага ўчастковага начальніка, трох членаў ад павятовага земскага сходу і толькі трох прадстаўнікоў ад сялян, выбраных на валасных сходах. Такімі ж былі губернскія землеўпарадкавальныя камісіі, якія праводзілі пасяджэнні пад старшынствам губернатара і ўключалі губернскага маршалка, старшыню губернскай зсмскай управы, упраўляючых Казеннай палатай, мясцовымі аддзяленнямі Сялянскага і Дваранскага банкаў, а таксама іншых прадстаўнікоў царскай чыноўнай бюракратыі. Агульнас кіраўніцтва гэтымі камісіямі ажыццяўляў Камітэт па землеўпарадкавальных справах, створаны пры Галоўным упраўлснні землеўпарадкавання і земляробства.

Заходнія губерні належалі да рэгіёнаў, дзе з самага пачатку землеупарадкавальныя работы разгарнуліся паскоранымі тэмпамі. Практычную работу па землеўпарадкаванню праводзілі каморнікі, у дапамогу якім прызначаліся межавыя тэхнікі.

Імкнучыся як мага фарсіраваць ліквідацыю пазямельнай абшчыны, урад 29 мая 1911 г. выдаў новы закон аб землеўпарадкаванні. Згодна з гэтым законам яно магло праводзіцца незалежна ад таго, замацавана зямля ва ўласнасць ці не. Паселішча, у якім праведзена землеўпарадкаванне, ужо ў выніку гэтага факта абвяшчалася перайшоўшым да спадчыннага ўчастковага ўладання. Значна пашыраліся правы і функцыі землеўпарадкавальных камісій. Апошнія цяпер маглі прымусова рассяляць сялян на хутары і адрубы, не лічачыся з воляй сялянскай большасці. Яны таксама мелі права адміністрацыйным шляхам вырашаць усялякія спрэчкі і судовыя справы, звязаныя з землеўпарадкаваннем. Рашэнне камісіі забаронена было абскарджваць у судзе. Сяляне, якія замацавалі зямлю ў асабістую ўласнасць, маглі адасобіцца ад абшчыны толькі шляхам выхаду на хутары ці адрубы.

У выніку сталыпінскага землеўпарадкавання на працягу 1907-1916 гг. у пяці беларускіх губернях на надзельнай зямлі было створана 113,8 тыс.

хутарскіх і адрубных гаспадарак плошчай 1147,2 тыс. дзесяцін. Гэта складала звыш 10 % усіх сялянскіх двароў і 18,7 % плошчы надзельнага землеўладання адзначаных губерняў. Апрача надзельнай зямлі, Сялянскі пазямельны банк прадаў пад хутары і адрубы ў пяці губернях у 1907-1916 гг. 228,7 тыс. дзесяцін банкаўскіх зямель, на якіх узнікла 13,5 тыс. гаспадарак. На прададзенай сялянам казённай зямлі (5,4 тыс. дзесяцін) было створана 813 хутарскіх і адрубных гаспадарак. Усяго за 10 гадоў ажыццяўлення сталыпінскай аграрнай рэформы ў названых губернях узнікла 128,1 тыс. хутароў і адрубоў. Сукупная плошча зямлі пад імі складала 1381,3 тыс. дзесяцін.

У пяці губернях працэнт сялянскіх двароў, што выйшлі на хутары і адрубы, быў некалькі вышэйшы, чым у цэлым па краіне (12 % супраць 10 %), прычым на долю Віцебскай і Магілёўскай губерняў прыпадала звыш 60 % усіх хутароў і адрубоў, створаных у пяці губернях. Пераход на хутары і адрубы ў Беларусі аблягчаўся тым, што ён пачаўся яшчэ да рэформы П. Сталыпіна. Гэтаму працэсу садзейнічала таксама шырокае распаўсюджанне тут сялянскага падворнага землеўладання.

На хутары і адрубы ішлі галоўным чынам крайнія групы сялянства - сялянская буржуазія і бедната. Царскі ўрад прыстасоўваў хутарызацыю да інтарэсаў першай.

Каб паскорыць выхад з пазямельнай абшчыны, царскія ўлады сталі на шлях выдачы актаў пасведчанняў тым сялянам, якія лічыліся перайшоўшымі да аднаасобнага ўладання. Па закону ад 14 чэрвеня 1910 г. усе гаспадары дамоў бесперадзельных абшчын павінны былі атрымаць акты, што замацоўвалі права асабістай уласнасці на зямлю. Калі да іх далучыць сялян, якія самі замацавалі абшчынную зямлю ў асабістую ўласнасць і атрымалі акты пасведчанняў на гэта, тады агульная колькасць двароў, што выйшлі з пазямельнай абшчыны, складала па Магілёўскай губерні 109,5 тыс., Віцебскай - 29,9 тыс., а ўсяго па адзначаных губернях - 139,4 тыс. двароў. Такім чынам, на ўсходзе Беларусі пазямельная абшчына амаль на 2/3 была разбурана.

Важную ролю ў ажыццяўленні аграрнай рэформы адыгрывалі згаданыя вышэй землеўпарадкавальныя камісіі, а таксама земскія ўстановы. Яны аказвалі фінансава-эканамічную падтрымку рэформе, выдавалі сродкі на стварэнне паказальных хутароў, агранамічную дапамогу сялянскаму насельніцтву, стварылі сельскагаспадарчыя склады, забяспечвалі сялян новай земляробчай тэхнікай, палепшаным насеннем, займаліся вогнеўстойлівым будаўніцтвам і інш.

Значнае месца ў стымуляванні рэформы П.Сталыпіна займала арганізацыя паказальных гаспадарак і палёў. К канцу 1914 г. у Віленскай губерні было створана 387 такіх гаспадарак, у Мінскай - 65 паказальных хутароў і больш за 1600 паказальных участкаў. У 1910 - 1911 гг. у Магілёўскай губерні было закладзена 106 адзначаных гаспадарак і 102 палі. У 1913 г. у Віцебскай губерні мелася 33 паказальныя хутары і 316 паказальных палёў, у Гродзенскай - больш за 200 палёў.

Перабудова аграрных адносін вымушала нс мірыцца з захаваннем застою і руціннасцю сельскай гаспадаркі. Адным са сродкаў капіталістычнай перабудовы вёскі было аказанне агранамічнай і тэхнічнай дапамогі сялянам. У заходніх губернях прыкметныя крокі ў аказанні такой дапамогі пачалі рабіць з 1909 г. У Мінскай губерні ў 1913 г. расходы на аграномію выраслі да 74,3 тыс. руб., у той час як усе затраты на агранамічную службу за папярэдняе сямігоддзе (1903-1909) склалі 33 тыс. руб. З 1906 па 1911 г. на патрэбы аграноміі ў Віцебскай губерні было выдзелена земствам і губернскай землеўпарадкавальнай камісіяй 344,6 тыс. руб., а за адзін 1913 г. асігнаванні склалі 237,8 тыс. руб.

Земствы станавіліся на шлях арганізацыі машынапракатных станцый і зернеачышчальных пунктаў. Апошнія разам з некаторай дапамогай насельніцтву мелі прызначэнне прапагандаваць перавагі новай тэхнікі. У Мінскай губерні першыя такія пункты і станцыі былі створаны ў 1910- 1911 гг. З 1911 па 1914г. іх колькасць павялічылася з 11 да 87. У Магілёўскай губерні за перадваенныя гады былі створаны 31 машыннапракатная станцыя. 25 зернеачышчальных пунктаў, 42 злучныя пункты. Значную ўвагу арганізацыі пракатных і зернеачышчальных пунктаў надаваў агранамічны псрсанал Віленскай губерні. Калі ў 1909 г. там зусім не было такіх пунктаў, то ў 1914 г. налічвалася ўжо 59 пракатных, І28 зернеачышчальных і 11 канюшынацёрачных нунктаў. Аднак дапамогу яны аказвалі толькі нешматлікім багатым вярхам вёскі. Так у 1914 г. іх паслугамі карысталіся ўсяго 945 заможных сялян. У Віцебскай губерні ў 1913 г. існавалі 44 пракатныя станцыі. На гэтых станцыях мелася к пачатку 1914 г. каля 2 тыс. машын і сельскагаспадарчых прылад. У 1913 г. яны абслугоўвалі 1480 сялян

Прыкметны ўклад у справу забеспячэння сялян сельскагаспадарчым абсталяваннем, мінеральнымі ўдабрэннямі і насеннем уносіла дзейнасць сельскагаспадарчых складоў. У Мінскай губерні першыя земскія склады былі адкрыты ў 1911 г а ў 1914 г. налічваліся 23 сельскагаспадарчыя склады. У Віцебскай губерні склады сталі адкрывацца ў 1909 г. За гэты год у губерні было адкрыта шэсць сельскагаспадарчых складоў. Калі ў 1911 г. усімі складамі губерні было прададзена тавараў на суму 139,3 тыс. руб., то ў 1913 г. - ужо на 392,9 тыс. руб., г.зн.. у 2,8 раза больш. Па колькасці сельскагаспадарчых складоў адставала Магілёўская губерня, дзе к пачатку 1913 г. меліся толькі чатыры склады.

Агранамічная і тэхнічная дапамога рабіла пэўны ўплыў на павышэнне культуры сялянскага земляробства. Аднак, каб правільна ацаніць яе значэнне, трэба мець на ўвазе, што ў розных паветах і ў адносінах да розных катэгорый сялянскіх гаспадарак уплыў агранамічнай дапамогі быў неаднолькавы. У рэгіёнах шырокай хутарызацыі для заможных сялян агранамічная і тэхнічная дапамога, безумоўна, адыграла станоўчую ролю ў паляпшэнні культуры земляробства. Для масы ж сельскай беднаты яна мела нязначныя вынікі.

Дзяржаўныя і земскія ўстановы аказвалі дапамогу сялянам у паляпшэнні пароднасці жывёлы. Мерапрыемствы, якія праводзіліся ў гэтым плане (метызацыя жывёлы, чытанне лекцый, раздача брашур па

жывёлагадоўлі, стварэнне паказальных ферм і так званых племянных цэнтраў у асобных маёнтках), закраналі пераважна заможных хутаран. Ва ўсіх паветах Віленскай губсрні ў 1913-1914 гг. былі арганізаваны трохтыднёвыя курсы па малочнай гаспадарцы і жывёлагадоўлі з паказальным кармленнем жывёлы. У трох населеных пунктах Віцебскага і Полацкага паветаў Віцебскай губерні ў 1911 г. для тых жа хутаран былі наладжаны курсы малочнай гаспадаркі.

Для папярэджання пажараў, што часта суправаджаліся знішчэннем цэлых вёсак і вялікімі матэрыяльнымі стратамі, эемлеўпарадкавальныя камісіі і земствы праводзілі вогнеўстойлівае будаўніцтва. Ствараліся майстэрні і заводы па вырабу цэглы, чарапіцы, іншых будаўнічых матэрыялаў, адкрываліся школы, курсы па падрыхтоўцы адпаведных спецыялістаў. У Мінскай губерні з 1911 па 1914г. выдаткі на названае будаўніцтва ўзраслі з 21,5 тыс. да 100 тыс. руб., або ў 4.6 раза.

У Беларусі ў перыяд ажыццяўлення аграрнай рэформы П.Сталыпіна значнае развіццё атрымала кааперацыя, асабліва арганізацыя ўстаноў дробнага крэдыту. У 1913 г. у Віцебскай губерні налічвалася 144 крэдытныя кааператыўныя ўстановы, 21 спажывецкае таварыства, 9 маслаbooбчых арцеляў, у Магілёўскай губерні - 139 крэдытных і пазыка-ашчадных таварыстваў з агульнай сумай укладаў каля 4,5 млн руб. Апрача таго, у апошняй дзейнічала 147 валасных пазыка-ашчадных кас. У тым жа годзе ў Мінскай губерні функцыяніравалі 244 установы дробнага крэдыту, у тым ліку 138 валасных пазыка-ашчадных кас. У 1906- 1915 гг. колькасць ашчадных кніжак у сялян Віцебскай, Мінскай і Магілёўскай губерняў павялічылася ў 2,5 раза, а сума грашовых укладаў - амаль у 3 разы, дасягнуўшы 27,4 млн руб. Крэдытныя кааператывы аб’ядноўвалі заможных гаспадароў, даючы ім пазыкі на тэрмін да аднаго года. Сялянская ж бедната фактычна была пазбаўлена магчымасці карыстацца паслугамі сельскіх крэдытных устаноў.

Састаўной часткай рэформы з’яўлялася перасяленне сялян на ўскраіны імперыі, перш за ўсё ў Сібір. Такім шляхам меркавалася згладзіць вастрыню малазямелля ў цэнтры і ўзмацніць землеўладанне сялянскай буржуазіі. Законы ад 9 лістанада 1906 г. і 14 чэрвеня 1910 г. значна аблягчалі ліквідацыю жабрацкай гаспадаркі большасці перасяленцаў. У 1907-1914 гг. з пяці беларускіх губерняў у Сібір і на Далёкі Усход перасялілася 335,4 тыс. чалавек, што складала 11,6 % перасяленцаў па Еўрапейскай Расіі. 3 іх 240,8 тыс. (71,8 %) прыпадала на Магілёўскую і Віцебскую губерні. Найбольш моцная сялянская хваля перасяленняў назіралася ў 1907-1909 гг. 3 пяці губерняў перасялілася 248,4 тыс. чалавск, або 74,1 % перасяленцаў гэтага перыяду.

Асноўную катэгорыю перасяленцаў складала вясковая беднага. Сярод 2170 сем’яў, якія выселіліся ў 1913 г. з Беларусі, беззямельныя складалі 21,2%, малазямельныя (да 6 дзссяцін на двор) - 55,5% . Яны нярэдка за бясцэнак распрадавалі сваю маёмасць і накіроўваліся на ўсход.

У эканамічным плане рэформа мела прагрэсіўнае значэнне, замяняючы архаічную абшчынную форму землеўладання больш рацыянальнай буржуазнай формай зямельнай уласнасці, ствараючы новыя магчымасці для росту прадукцыйных сіл у земляробстве. З выхадам на хутары і адрубы часткі сялян зменшыліся цераспалосіца, дробнапалосіца і далёказямелле сялянскіх палёў, што садзейнічала развіццю сялянскай гаспадаркі. Рэформа вяла да больш шырокага ўцягнення ў гандлёвы абарот прыватнаўласніцкай і сялянскай надзельнай зямлі, канцэнтрацыі капіталістычнай зямельнай уласнасці. Агранамічная і тэхнічная данамога земскіх і ўрадавых устаноў аказвала, безумоўна, станоўчае ўздзеянне на павышэнне культуры земляробства і жывёлагадоўлі.

**Пачатак індустрыялізацыі. Урбанізацыйныя працэсы**

К пачатку XX ст. у Беларусі быў завершаны прамыслова-тэхнічны пераварот, і ў асноўных галінах прамысловасці і транспарту канчаткова зацвердзілася перавага машыннай індустрыі. Пачаўся працэс далейшага ўдасканальвання фабрычна-заводскай вытворчасці. Кожны год толькі ў Мінскай губерні некалькі дзесяткаў прадпрымальнікаў звярталіся да фабрычнай інспекцыі за дазволам на ўсталяванне паравых катлоў.

У паліўна-энергетычным балансе Беларусі ўсё большая роля пачала належаць каменнаму вугалю, а магутнасці паравых катлоў сталі выкарыстоўвацца і для вытворчасці электраэнергіі.

Тэмпы тэхнічнага пераўзбраення ў сельскай мясцовасці не надта саступалі гарадам, а па росту нават перавышалі гарадскія паказчыкі. Так, калі ў 1901 г. у пяці беларускіх губернях налічвалася 1321 фабрычна-заводскі кацёл і 165 сельскагаспадарчых паравых катлоў.то к 1914 г. колькасць фабрычна-заводскіх катлоў узрасла ў 1,7 раза (2267 штук), а сельскагаспадарчых - у 3,3 раза (545 штук).

З 1900 па 1913 г. колькасць прадпрыемстваў цэнзавай прамысловасці павялічылася з 799 да 1280, г. зн. на 60,2 %. Побач з фабрыкамі і заводамі, як і раней, працягвалі сваю дзейнасць шматлікія мануфактуры, дробныя прадпрыемствы, майстэрні. Яны больш арыентаваліся на мясцовага спажыўца і ў значнай ступені залежалі ад перападаў эканамічнай кан’юнктуры.

Пры захаванні той галіновай структуры вытворчасці, якая склалася ў Беларусіў XIX ст. амаль у кожнай галіне адбываліся перамены. Па-першае, больш рэзка вызначылася роля адносна буйных прадпрыемстваў – лідэраў у сваёй галіне, як старых (але значна мадэрнізаваных), так і пабудаваных нанава. Па-другое, ва ўсіх галінах ішла і тэхналагічная перабудова, назіраўся рост энергаўзбраення праз укараненне не толькі паравых рухавікоў, але і рухавікоў унутранага згарання і электрарухавікоў. Гэты працэс ахапіў не толькі буйныя, але і параўнальна невялікія прадпрыемствы, напрыклад друкарні і тыпалітаграфіі. Уладальнік друкарні ў Рэчыцы Д. Шымановіч пачаў справу ў 1889 г., маючы ручны друкарскі станок. У 1912 г. гэта прадпрыемства ўжо мела нафтавы рухавік, пяць хуткадрукавальных машын,

электрычную дынама-машыну і выконвала заказы з 34 губерняў і Вобласці Войска Данскога.

Пра якасныя эмены ў эканоміцы Беларусі пераканаўча сведчыць становішча ў лясной справе. Паралельна з вывазам сырога лесу ў Беларусі ўзнікла шматгаліновая прамысловасць на базе выкарыстання лясных рэсурсаў. Лідэрам папяровай прамысловасці заставалася Добрушская фабрыка (у 1913 г. яе вытворчасць склалала 10 тыс. тон паперы на суму 3 млн руб. пры 1400 рабочых). Значнымі вытворчымі паказчыкамі вызначаліся папяровая фабрыка акцыянернага таварыства ў Шклове і фабрыка “Скіна” ў Лепельскім павеце.

Вытворчасць шпалер была сканцэнтравана ў Мінску. Напярэдадні Першай сусветнай вайны тут налічваліся чатыры шпалерныя фабрыкі.

Адным з буйнейшых прадпрыемстваў у лесахімічнай прамысловасці Расійскай імперыі быў Выдрыцкі завод сухой перагонкі драўніны ў Аршанскім павеце (у 1913 г. выраблена прадукцыі на 500 тыс. руб. пры 540 рабочых).

Высокатэхналагічнай вытворчасцю, дзе беларускім прадпрыемствам належала значнае месца, быў выраб запалак. Запалкавыя фабрыкі меліся ў Пінску, Барысаве, Нова-Барысаве. Мазыры, Слоніме, Рэчыцы, Навабеліцы, Койданаве, Вішневе, Бабруйску. Некалькі даволі буйных прадпрыемстваў выраблялі запалкавую саломку, якая знаходзіла збыт і за межамі беларускіх губерняў.

Вынаходніцтва фанеры прывяло да ўзнікнення на рубяжы XIX-XX стст. шэрагу спецыялізаваных фабрык і асобных цэхаў на лесаапрацоўчых заводах Беларусі. Практычна манапольнае становішча ў Расійскай імперыі мела Пінская шавецка-шпілечная фабрыка, якая належала сямейству Лур’е.

Патрэбы чыгунак абслугоўвалі шпалапрапітныя заводы, буйнейшыя з якіх дзейнічалі на станцыі Лунінец (заснаваны ў 1902 г., у 1910 г. налічвалася 135 рабочых, выраблена прадукцыі на 115 тыс. руб.) і ў Мазыры (у 1910 г. - 334 рабочых, кошт прадукцыі - 216 тыс. руб.).

Апроч лесу, другі традыцыйны беларускі тавар - лён - таксама пачаў выступаць на рынку не толькі ў якасці першапачатковай сыравіны. З 1900 г. выраб ачэсанай суровай і бялёнай льяной пражы пачала льнопрадзільная фабрыка “Дзвіна” ў Віцебску (у 1910 г. — 1000 рабочых, 3 рухавікі ў 1750 к.с., вытворчасць - 120 тыс. пудоў льняной пражы на 1500 тыс. руб.). Другая буйная льнопрадзільная фабрыка была заснавана ў 1902 г. у сяле Высачаны Аршанскага павета (у 1910 г. - 477 рабочых, 4 рухавікі ў 440 к.с., вытворчасць - 445 тыс. руб.).

Адкрыццё ў 1901 г. ткацкай фабрыкі ў мястэчку Дуброўна (Горацкі павет) па вырабу баваўняных, шаўковых і джутавых тканін (у 1910 г. — 488 рабочых, вытворчасць на суму 622,6 тыс. руб.) прывяло да структурных змен у тэкстыльнай прамысловасці, у выніку чаго доля суконных прадпрыемстваў скарацілася. Працягвалі дзейнічаць Альбярцінская (Слонімскі павет) і Ляхозвянская (Навагрудскі павет) шоўкакруцільныя фабрыкі.

У шкляной прамысловасці разгарнулася вытворчасць хрустальнага і лямпавага шкла, шкляных электраізалятараў. На заводзе ў Альбярціне (Слонімскі павет) у 1913 г. пачаўся выраб электралямпачак.

У харчасмакавай прамысловасці буйнейшым прадпрыемствам заставалася Гродзенская тытунёвая фабрыка Шэрашэўскага (у 1913 г. — 1400 рабочых, вытворчасць на 3,5 млн. руб.). Разам з тым менавіта ў гэтай галіне назіраўся самы нізкі ўзровень канцэнтрацыі вытворчасці. Колькасць вінакурных заводаў некалькі паменшылася, але іх вытворчасць узрасла за кошт узбуйнення прадпрыемстваў і паляпшэння тэхналогіі. Напярэдадні Першай сусветнай вайны Мінская губерня выйшла на першае месца ў Расійскай імперыі па вытворчасці спірту.

Хаця акцыянерныя кампаніі вядомы ў эканоміцы Беларусі яшчэ з першай паловы XIX ст., дастаткова прыкметнай эканамічнай з'явай яны сталі толькі на рубяжы стагоддзяў. Справа ў тым, што агульная тэндэнцыя на ўзбуйненне прамысловасці, гандлю і транспартных прадпрыемстваў патрабавала буйных інвестыцый, якія прыходзілі ў форме "калектыўнага" (акцыянернага і паявога) капіталу. Пры гэтым фінансавыя сродкі канцэнтраваліся не толькі ў дзяржаўных, але і ў прыватных акцыянерных камерцыйных банках. Разам з акцыянернымі кампаніямі дзейнічалі таварыствы на паях, вельмі набліжаныя да іх па эканамічных функцыях і ўплыву на развіццё эканомікі. У адносінах да акцыянерных таварыстваў і таварыстваў на паях заканадаўства Расійскай імперыі прытрымлівалася канцэсійнага (дазвольнага) прынцыпу.

Акцыянерна-паявыя прадпрыемствы меліся ва ўсіх галінах беларускай эканомікі, у першую чаргу там, дзе ўзнікала патрэба хуткай мабілізацыі фінансавых сродкаў. Гэта маглі быць як сярэднія прадпрысмствы, так і буйныя фабрыкі і заводы, прадпрыемствы транспартнай і камунальнай сфер. Да ліку першых адносіўся завод у мястэчку Прапойск (Быхаўскі павет), які быў заснаваны ў 1906 г. і належаў таварыству Паўночна-Заходняй канатна-дротавай вытворчасці, а таксама Акцыянернае таварыства фабрыкі канторскіх кніг, перашытных вырабаў і тыпалітаграфіі "Браты І. і М. Харыны", што дзейнічала з 1902 г. у Гродне.

Менавіта ў форме акцыянернага капіталу ў эканоміку Бсларусі ішлі найбольш буйныя замежныя інвестыцыі: бельгійскія акцыянерныя таварыствы з'яўляліся ўладальнікамі віцебскага трамвая і льнопрадзільнай фабрыкі "Дзвіна", французскаму капіталу належалі дзве шоўкакруцільныя фабрыкі і фабрыка грабянёў у Мінску.

Беларусь ніколі не саступала іншым рэгіёнам Расійскай імперыі па ступені канцэнтрацыі і акцыяніравання капіталу ў тых галінах прамысловасці, дзе мела развітую фабрычна-заводскую вытворчасць. Напрыклад, у запалкавай прамысловасці Расійскай імперыі ў 1912 г. налічвалася ссм акцыянерных прадпрыемстваў з агульным капіталам у 4500 тыс. руб., у тым ліку дзве запалкавыя фабрыкі Беларусі - "Прагрэс-Вулкан" і "Маланка", абедзве з акцыянерным капіталам па 300 тыс. руб. Такім чынам,

беларускім прадпрымальнікам належала прыкладна 13 % агульнарасійскага акцыянернага капіталу ў запалкавай прамысловасці.

Сведчаннем канцэнтрацыі і манапалізацыі вытворчасці стала з'яўленне сіндыкатаў і манапалістычных аб'яднанняў. У 1905 г. быў створаны сіндыкат кафельных заводчыкаў у Копысі, у 1906 г. – сіндыкат піваварных заводчыкаў Паўночна-Заходняга краю ў Оршы, у 1911 г. - сіндыкат "Продакон", куды ўвайшлі ўладальнікі канвертавых фабрык Брэста, Вільні і Адэсы, прычым яго праўленне размяшчалася ў Мінску. У чэрвені 1905 г. у Мінску пры аддзяленні Паўночнага банка быў створаны "Камітэт запалкавых фабрыкантаў Заходняга краю". Праз тры гады беларускія запалкавыя фабрыкі ўвайшлі ў склад новаўтворанага "Рускага таварыства запалкавага гандлю".

Часам здаралася, што беларускія прадпрымальнікі былі ініцыятарамі агульнарасійскіх манапольных аб'яднанняў. Так, князь Друцкі-Сакалінскі быў сярод тых, хто ў 1912 г. стварыў трэст дрожджа-вінакурных заводаў, у які першапачаткова ўвайшло 36 прадпрыемстваў з агульным капіталам у 15 млн руб.

У канцы ХІХ - пачатку ХХ ст. у Беларусі склалася дастаткова зладжаная сістэма крэдытна-банкаўскіх устаноў як дзяржаўных, так і прыватных. Яна паспяхова абслугоўвала патрэбы дзяржавы і рыначнай эканомікі. На чале гэтай сістэмы, як і раней, стаяў Дзяржаўны банк і яго губернскія аддзяленні. Праз Дзяржаўны банк ажыццяўлялася і камерцыйнае крэдытаванне. Напрыклад, агульная сума крэдытаў Мінскага аддзялсння Дзяржбанка (2,8 млн руб.) размяркоўвалася наступным чынам: лясная справа - 46,9%, грашовыя аперацыі - 18,9, мясцовы гандаль - 17,3, (фабрычна-заводскія прадпрыемствы - 14,0, сельская гаспадарка - 2,9 %

Сістэма прыватнага банкаўскага камерцыйнага крэдыту ў Беларусі складалася з Мінскага камерцыйнага банка і філіялаў акцыянерных банкаў небеларускага паходжання, часцей за ўсё пецярбургскіх ці маскоўскіх. Мінскі камерцыйны банк перажываў перыяд працяглага крызісу. Кошт яго акцый на Пецярбургскай біржы ў 1899-1906 гт. знізіўся з 325 да 200 руб Пры гэтым э 1905 г. іх продаж вёўся ніжэй за намінальную цану ў 250 руб. З 1906 г. колькасць аперацый банка значна паменшылася. 31 ліпеня 1908 г. агульны сход акцыянераў вырашыў пачаць ліквідацыю спраў. З 15 красавіка 1912 г. актывы і пасівы Мінскага камерцыйнага банка перайшлі да Азова-Данскога банка.

Крах Мінскага камерцыйнага банка не прывёў да распаду ўсёй крэдытна-банкаўскай сістэмы рэгіёна. У Беларусі мелася дастаткова шырокая сетка банкаўскіх устаноў. На працягу 1870-1914 гг. у 14 населеных пунктах Беларусі дзейнічала 57 мясцовых банкаў і аддзяленняў банкаў, праўленне якіх размяшчалася па-за яе межамі. Асаблівасцю іх развіцця ў 1900-1914 гг. было тое, што колькасць улікова-ссудных аперацый прыватных камерцыйных банкаў і іх філіялаў ўзрасла ўдвая і склала прыкладна палову крэдытаў, у той час як колькасць крэдытаў губернскіх аддзяленняў

Дзяржбанка паменшылася амаль што ў 3,5 раза і склала крыху больш чым 15% ад агульнай колькасці ўсіх крэдытаў.

Галоўнымі лзеючымі асобамі ў галіне камерцыйнага крэдыту выступалі банкіраўскія дамы і канторы. Іх уладальнікі нярэдка спалучалі банкаўскія аперацыі з вядзеннем гандлю, бо валодалі прамысловымі прадпрыемствамі. На студзень 1910 г., паводле даных Міністэрства фінансаў, у Расійскай імперыі налічвалася 287 банкірскіх кантор. Першае мсcца па іх колькасці займалі літоўска-беларускія губерні (99), потым ішлі польскія (42) і паўднёвыя (33) губерні. Дробныя крэдыты магчыма было атрымаць праз таварыства ўзаемнага крэдыту і пазыка-ашчадныя касы.

**Транспарт і шляхі зносін.** Пасля некаторага перапынку ў Беларусі зноў пачалося інтэнсіўнае чыгуначнае будаўніцтва. Як і раней, яно вялося з улікам палітычных і стратэгічных інтарэсаў Расійскай імперыі, але ў мірны час чыгункі працавалі менавіта на беларускую эканоміку і з’яўляліся яе сістэмаўтваральнай часткай.

У 1902 г. у выніку будаўніцтва чыгункі Віцебск – Жлобін. Магілёў апошнім з беларускіх губернскіх гарадоў атрымаў чыгуначную сувязь. На поўдні Беларусі ўзнік Жлобінскі чыгуначны вузел. Адразу пасля гэтага пачалося будаўніцтва чыгуначнай лініі Полацк - Сядлец (590 вёрст). Яна прайшла праз Вілейку, Маладзечна, Ліду, Масты, Ваўкавыск, Свіслач і ў 1907 г. была здадзена ў эксплуатацыю.

Характэрнай рысай таго часу стала будаўніцтва чыгуначных адгалінананяў ад асноўных магістралей для абслугоўвання мясцовых патрэб. Гэта былі чыгуначныя веткі Асіповічы - Старыя Дарогі - Урэчча, Вярэйцы - Градзянка, Васілевічы - Хойнікі. Адначасова ішлі мадэрнізацыя ўжо існуючых чыгуначных ліній, будаўніцтва дадатковых пуцей, чыгуначных станцый і прыпыначных пунктаў.

У 1901-1913 гг. увайшло ў эксплуатацыю амаль 30 % чыгуначнага палатна, якое мелася ў Беларусі напярэдадні Першай сусветнай вайны. У 1913 г. насычанасць Беларусі чыгункамі была ў 1,8 раза вышэй, чым па Еўрапейскай частцы Расійскай імперыі.

Рэйкавы транспарт паскорыў прагрэс паштовай сувязі, якая стала больш мабільнай. Разам з тэлеграфам пачаў ужывацца і тэлефон. У 1910 г. тэлефонную сувязь мелі 12 беларускіх гарадоў (усе губернскія, а таксама Быхаў, Бабруйск, Барысаў, Гомель, Горкі, Пінск, Рэчыца, Слонім). Першай беларускай тэлефоннай міжгародняй лініяй стала лінія Мінск-Барысаў.

Водныя шляхі зносін пасля доўгатэрміновага перапынку, у выніку развіцця чыгуначнага транспарту ў пачатку XX ст., зноў прыцягнулі да сябе ўвагу. Быў дэталёва распрацаваны праект Чарнаморска-Балтыйскага воднага шляху (Херсон-Рыга), часткай якога павінна была стаць рэканструяваная Бярэзінская водная сістэма. Існавалі планы перабудовы і іншых бсларускіх водных шляхоў. Напярэдадні Першай сусветнай вайны ў паўночна-заходніх губернях на 1 тыс. квадратных вёрст прыходзілася 46 верст водных шляхоў, у той час як па 50 губернях Еўрапсйскай Расіі гэты паказчык складаў прыкладна 19 вёрст.

Новым сродкам транспарту стаў аўтамабіль. У 1909-1914 гт. некаторыя беларускія гарады і населеныя пункты звязвалі рэгулярныя аўтамабільныя маршруты.

## Тэма 5. Савецкая мадэрнізацыя беларускай вёскі ў 1917 – 1927 гг.

Мэтанакіраваны пачатак ажыццяўлення новай дзяржаўнай палітыкі (НЭПа) паклаў X з'езд РКП(б) (сакавік 1921 г.). Гэта было замацавана шэрагам заканадаўчых рашэнняў цэнтральных і мясцовых партыйных і савецкіх органаў улады. Дазвалялася частковая дэнацыялізацыя, развіццё прадпрымальніцтва ў гандлі, дробнай і саматужнай прамысловасці, нават канцэсій (арэнда дзяржаўных прадпрыемстваў замежнымі прадпрымальнікамі). Новая палітыка павінна была праводзіцца ва ўмовах паслядоўнага навязвання партыяй эканамічнай барацьбы з рыначнымі адносінамі і іх носьбітамі. Гэта рабілася ва ўмовах недапушчэння не тое што шматпартыйнасці, а нават апазіцыйных меркаванняў унутры самой партыі.

Рэалізацыя захадаў па змяненню эканамічнай палітыкі пачалася з падатковай рэформы, замены харчразвёрсткі (стрыжня палітыкі “ваеннага камунізму”) натуральным падаткам - харчпадаткам. а прадуктаабмену - таварна-грашовымі адносінамі. Пры гэтым прадугледжвалася захаваннс класавага характару падаткаабкладання, істотнае памяншэнне памеру харчпадатку параўнальна з развёрсткай, вызначэнне яго памеру для кожнага двара (а не вёскі, таварыства і г. д.) да пачатку веснавой сяўбы, свабодны абмен прадуктамі сельскай гаспадаркі па рынчных цэнах пасля абавязковай здачы харчпадатку. Як і вясной 1918 г., прыярытэтным вызначаўся безграшовы тавараабмен паміж горадам і вёскай праз дзяржаўныя і кааператыўныя гандлёвыя ўстановы. Спачатку абмен, продаж і закупка хлебных прадуктаў неадкладна дазваляліся ў 40 губернях.

Зацікаўленасць таваравытворцаў у паглыбленні рэфармавання эканамічных адносін на аснове заахвочвання іх ініцыятывы і прадпрымальнасці, прымусіла ўлады ўжо з восені 1921 г. зрабіць чарговы крок па шляху адступленпя ад прынцыпаў нярыначнай эканомікі і кардынальна пашырыць сферу дзеяння ў народнай гаспадарцы таварна-грашовых адносін. Пачалося паступоваеператварэнне тавараабмену ў куплю-продаж за грошы, г. зн. у гандаль. У 1921/22 гаспадарчым годзе на ўмовах тавараабмену ў БССР было назапашана толькі 17.8 % усіх дзяржаўных нарыхтовак жыта. Адначасова, насуперак псршапачатковым, афіцыйным устаноўкам, за наяўныя грошы сяляне рэалізавалі прыватнікам не менш чым 40 % агуьнай масы вывезенай на рынак прадукцыі. Да канца 1922 г. тавараабменныя аперацыі ў Беларусі, якія разгарнуліся з лета, былі пераведзены ў грашовыя разлікі, што найбольш адпавядала ўмовам таварнай вытворчасці.

У выніку было адменена абмежаваннс гандлю мясцовымі рынкамі. Быў дазволены гандаль як на мясцовах базарах, так і на кірмашах. З 1922 г. у буйных гарадах пачалі дзейнічаць гандлёвыя біржы, дзе ажыццяўляліся здзелкі значных памераў. Прыватны гандляр найбольш актыўна праяўляў

сябе ў рознічным гандлі, дзяржаўныя органы - у аптовым (буйным), кааператыўныя - спалучалі функцыі аптовых і рознічных гандляроў. У 1922/23 гаспадарчым годзе прыватны сектар кантраляваў 78,2 % усяго абароту і некалькі больш 60 % рознічнага ўнутранага гандлю рэспублікі. У 1923/24 гаспадарчым годзе на долю дробных гандляроў (нэпманаў) у БССР прыпадала 11 % аптовага тавараабмену, у рознічным -71,3%.

У 1922-1923 гг. спешна зробленая сістэма харчпадатку была заменена больш прадуманым адзіным - спачатку натуральным, а потым сельскагаспадарчым - падаткам з правам выплаты яго часткова (небольш за 40 %), а з 1924 г. - толькі грашыма. Тым самым пашыралася сацыяльная апора ўлады, стымулявалася свабода ў развіцці гаспадаркі і паскаралася аздараўленне фінансавай сістэмы. Грашовае абарачэнне станавілася нормай і для горада, і для вёскі. Не выпадкова і тое, што паступленні ад сялян падатковых плацяжоў, якія базіраваліся на прыросце вытворчасці, павялічваліся, да таго ж без колькі - небудзь прыкметнага незадавальнення таваравытворцаў. Сельгаспрадукцыя, якую яны пастаўлялі на рынак, адціскала дзяржаўны гандаль. У той жа час сельгаспадатак, што спаганяўся з сялян, значна пераўзыходзіў тварнасць прадукцыі сялянскіх гаспадарак. Высокая стаўка падатку (да 24 % ад прыбытку) стрымлівала рост эфектыўнасці вытворчасці, а з другога боку - стымулявала раздзел двароў.

Пераход да новай эканамічнай палітыкі прадугледжваў выкарыстанне планавання, рэалізацыя якога ўскладвалася на планавую камісію - Дзяржплан. Да мая 1923 г. яго функцыі ў рэспубліцы ажыццяўляла пераважна Эканамічная нарада пры СНК БССР. Аднаўлялася гаспадарчая самастойнасць аб'яднанняў і аўтаномных прадпрыемстваў як у набыцці сыравіны, паліва, матэрыялаў, грашовых сродкаў, так і ў распараджэнні выраблена прадукцыяй, атрыманымі прыбыткамі.

Нягледзячы на супярэчлівыя ўмовы ўваходу ў НЭП, ініцыятыва вытворцаў усё больш засяроджвалася на стваральнай працы. Да 1923 г. у выніку завяршэння размеркавання памешчыцкай зямлі на тэрыторыі Беларускай ССР (у межах шасці паветаў) сялянскае землекарыстанне павялічылася на 469,4 тыс. дзесяцін і дасягнула 2630,1 тыс. дзесяцін, або 97,4 % зямель сельскагаспадарчага прызначэння. У выніку сярэдні зямельны надзел гаспадаркі ў рэспубліцы ўзрос з 9,5 да 11,2 дзесяціны. Пашырылася землекарыстанне сялян у Гомельскай і Віцебскай губернях, якія ў той час уваходзілі ўсклад РСФСР. Пасяўная плошча ў БССР дасягнула 88,6 % ад узроўню 1916 г. Асабліва хутка пашыраліся плошчы пад харчовыя культуры і травы.

Адначасова працягвалася калгаснае і саўгаснае будаўніцтва, хаця калгасы, арганізаваныя на сялянскіх землях, у сваёй большасці распаліся. На месцы ліквідаваных калгасаў, сетка якіх з вясны 1922 г. уваходзіла ў сістэму сельскагаспадарчай кааперацыі, часта ствараліся яе прасцейшыя формы (садова-агародныя, крэдытныя, машынныя, меліярацыйныя, універсальныя і іншыя таварыствы). З улікам гэтага расла і развівалася агульная сетка сельскагаспадарчай кааперацыі.

Становучыя зрухі меліся ва ўраджайнасці культур, прычым асабліва ў саўгасах. Разам з тым у цэлым ураджай быў на 20-25 % ніжэйшым у параўнанні з даваенным часам. Паляпшэнне спраў у палявой гаспадарцы спрыяла развіццю жывёлагадоўлі. Да 1923 г. пагалоўе буйной рагатай жывёлы, коней і авечак у параўнанні з 1916 г. стала значна большым. Статак свіней павялічваўся павольнаа і заставаўся некалькі меншым, чым у 1916 г.

Акрамя таго. ішоў працэс "асераднячвання" вёскі. Змяншалася колькасць вясковай беднаты. Пашыраліся эканамічныя магчымасці для ўмацавання гаспадарак прадпрымальніцкага тыпу.

Падатак на адзінку плошчы павялічваўся з павышэннем пагалоўя жывёлы. Адсюль сялянам нявыгадна было трымаць яе значную колькасць. У выніку ў 1923 г. назіраліся замаруджваннс росту ссльскагаспадарчай вытворчасці, скарачэнне пасеваў яравых, бульбы, тэхнічных культур і траў. Адбылося змяншэнне статку буйной рагатай жывёлы, асабліва свінапагалоўя, колькасць якога стала нават ніжэй, чым у 1921 г.

Спробы кампартыі і савецкага ўрада паскорыць развіццё індустрыі пераважна за кошт вёскі шляхам узнімання цэн на прамысловыя тавары, атрымаць сродкі з вёскі на развіццё прамысловасці праз падаткі і штучную цэнавую палітыку прывялі восснню 1923 г. да так званага "крызісу збыту". Вяскоўцам сталі не па кішэні востра неабходныя вырабы прамысловасці: імі былі перапоўнены склады і магазіны. Тым часам вёска актыўна абараняла свае інтарэсы шляхам згортвання вытворчасці і замаруджвання збыту прадукцыі дзяржаве.

З мэтай ліквідацыі напружанасці на ўнутраным рынку збыту прадуктаў сельскай гаспадаркі і набліжэння цэн да рэальных вытворчых затрат быў выкарыстаны экспарт збожжа новага ўраджаю. Ужо ўпачатку восені 1923 г. цэны на хлеб павялічыліся ў сярэднім на 30-35 %. Росту рознічных (рыначных) цэн на прадукты спрыяла і масавае выкананне фіксаванай натуральнай часткі адзінага сельскагаспадатку, распачаты ў 1923-1924 гг. пераход ад натуральнага да грашовага абкладання сялян. Адначасова адбывалася зніжэнне цэн на прамысловыя тавары.

Створаны на аснове НЭПа гаспадарчы механізм спрыяьна ўплываў не толькі на захаванне савецкага ладу, але і на стваральную працу народа, у тым ліку земляробаў. Вёска хутка аднаўлялася і мацнела. Адпаведным чынам змяняўся і стан сельскай гаспадаркі.

Адным з важненшых было пытанне землеўпарадкавання - прыстасаванне зямельных плошчаў да новых арганізацыйна-вытворчых задач, якія стаялі перад сельскай гаспадаркай. Яно ўключала ў сябе як пераадоленне беззямелля і малазямелля ў сялян (так званае "аграрнае перанасяленне"), так і распаўсюджанне перадавых прыёмаў агракультуры з мэтай павелічэння ўраджайнасці і прадукцыйнасці працы земляробаў.

Важнае месца ў вырашэнні гэтага пытання адводзілася надзяленню зямлёй беднаты за кошт абрэзкі так званых кулацкіх гаспадарак. Справа ў тым, што, нягледзячы на праведзенае размеркаванне нацыяналізаваных прыватнаўласніцкіх зямель, сярэдняя забяспечанасць беларускага двара

зямлёй не перавышала былую дакастрычніцкую. Большасць размеркаваных зямель былых буйных прыватных уласнікаў паглынулі 117 тыс. нанава створаных гаспадарак з зямсльнай плошчай у 2-2,5 дзесяціны, не здольных весці нават спажывецкую гаспадарку. Уся група малазямельных гаспадарак дасягала 20-25 %. Апрача таго, у вёсцы налічвалася 45,4 тыс. беззямельных двароў.

Для таго каб выправіць становішча, дзяржавай рабіліся захады па надзяленню іх зямлёй не толькі з дзяржаўнага фонду (рэзервовага запасу), але і шляхам перадачы ўгоддзяў, абрэзаных у заможных гаспадарках, даводзячы іх да дырэктыўна ўстаноўленых у 1925 г. тыповых норм землекарыстання двара: прыкладна ў 5-6 дзесяцін і 9-13,8 дзесяціны у залежнасці ад якасці зямлі, наяўнасці члснаў сялянскай сям'і і фактычнага карыстання. Пэўнае павелічэнне максімальных норм дапускалася толькі для нешматлікай групы культурна-паказальных гаспадарак.

Трансфармацыя гаспадарак у адпаведнасці з выпрацаванымі нормамі ўстойлівага сялянскага землекарыстання (мінімальных і максімальных) разглядалася таксама ў якасці меры, якая спрыяла паступоваму пераходу да вытворчай кааперацыі праз стварэнне адпаведных умоў, у тым ліку пасялковай формы землекарыстання і рассялення, а таксама развіцця невытворчых відаў кааперацыі (забеспячэнска-збытавых, машынных, меліярацыйных. крэдытных, спажывецкіх). Прычым, паводле афіцыйных установак, пасялковая форма землекарыстання і рассялення - аб'яднанне 10 - 20 сялянскіх двароў з агульнай сядзібнай аседласцю і агульным шматпольным севазваротам, які ўстанаўліваўся пры пазямельна-гаспадарчым уладкаванні, лічылася найбольш адпавядаючай іх вырашэнню.

Аднак землезабяспечанасць сялянства не пераўзыходзіла дарэвалюцыйную, што тлумачыцца не толькі вялікім прыростам новых гаспадарак, але і абрэзкай шматзямельных двароў. У пачатку 1928 г. у БССР налічвалася 23,1 % гаспадарак з пасевам да 2 дзесяцін, 4365 сялянскіх сем'яў зусім не мелі зямлі. У 1928/29 гаспадарчым годзе работамі па земленадзяленню з запаснога фонду было ахоплена 61,3 тыс. га. З улікам земленадзялення, якое праводзілася сіламі мясцовых саветаў, усяго атрымалі зямлю за гэты год 7552 бядняцкія гаспадаркі, у тым ліку 1224 беззямельныя і 6328 малазямельных.

Бачнае месца займалі блізкія ў сацыяльна-эканамічных адносінах да калгасаў дзяржаўныя гаспадаркі - саўгасы. Пры моцнай падтрымцы дзяржавы яны таксама нярэдка дэманстравалі перавагі буйной сельскагаспадарчай вытворчасці перад індывідуальнай. Сялянства, нават бедная яго частка, нягледзячы на рэалізуемы курс па актыўнаму стымуляванню калгаснай формы каперацыі пры ўшчамленні больш дзеяздольных гаспадарак у атрыманні крэдытаў і іншых сродкаў эфектыўнай арганізацыі вытворчасці, атрыманні з іх павялічаных падаткаў, не спяшалася ўключацца ў калгасна-саўгаснае будаўніцтва. Але ў партыйна-дзяржаўнай улады былі іншыя намеры.

Сельскагаспадарчая вытворчасць. Сукупнасць захадаў улады як эканамічнага, так і адміністрацыйнага парадку спрыяла агульнаму паляпшэнню стану спраў у сельскай гаспадарцы. Да 1926 г. на аснове дробнай сялянскай гаспадаркі сельскагаспадарчая вытворчасць БССР была ў цэлым адноўлена, але пераважна за кошт экстэнсіўных фактараў.

Да сярэдзіны другой паловы 20-х гг. выявілася замаруджванне тэмпаў развіцця раслінаводства. Нізкая ўраджайнасць у спалучэнні з запушчанымі пасяўнымі плошчамі не спрыяла належным чынам развіццю кармавой базы, патрэбы ў якой павялічваліся з-за апераджальнага росту жывёлагадоўлі. У рэшце рэшт гэта акалічнасць не магла не паўплываць на скарачэнне пагалоўя, што назіралася ў другой палове 20-х гг.

На працягу 1925-1928 гг. сярэдняя ўраджайнасць збожжавых дасягнула 7,3 ц з га супраць 6,5 ц у 1910-1915 гг., бульбы - 87,3 і 74 ц.

Адпаведна з рухам у пасяўных плошчах і ўраджайнасці змяняўся аб'ём валавой прадукцыі раслінаводства. У 1925 г. у БССР валавы збор збожжавых склаў 18592,9 тыс. ц, а ў 1928 г. ён раўняўся 17314,2 тыс. ц. Больш спрыяльным было становішча ў вытворчасці бульбы, хаця ў 1928 г. яе валавыя зборы (364 660 дэкатон) былі ніжэйшымі за папярэднія два гады. Некалькі лепшым было становішча ў вытворчасці сена, але і тут пры няўхільным росце валавых збораў у 1928 г. назіралася іх змяншэнне. Зборы тэхнічных культур таксама часам падалі.

Значна большыя зрухі назіраліся ў аднаўленні жывёлагадоўлі. У 1928 г. колькасць жывёлы ў аднаасобных гаспадарках рэспублікі перавысіла пагалоўе 1916 г.: буйной рагатай - на 45,9 %, свіней - на 27.6, авечак на 100,9, коней – на 26%. Аднак у параўнанні з 1916 г. сярэдняя забяспечанасць жывёлай сялянскіх сем'яў стала ніжэйшай. Калі ў 1916 г. на адзін двор прыпадала 4.4 галавы (у пераліку на буйную жывёлу), то ў 1927 г. - 4,2. Гэта сведчыла як аб агульным аслабленні эканамічнага патэнцыялу асобна ўзятых гаспадарак, так і аб больш раўнамерным размеркаванні экспрапрыіраванай маёмасці сярод аслабленых гаспадарак.

## **Тэма 6. Прамысловасць Беларусі ва ўмовах НЭПа**.

Аднаўленне гаспадаркі адбывалася ў асноўным паралельна ў аграрным сектары эканомікі, прамысловасці і на транспарце, аднак прыярытэт захоўваўся за асноўнай у той час сферай вытворчасці - сельскай гаспадаркай. Гэта тлумачыцца яе спецыфікай - меншымі матэрыяльнымі затратамі, неабходнымі для аднаўлення, больш сціслымі тэрмінамі, вопытам працаўнікоў і іншымі фактарамі. Дадзеная акалічнасць прызнавалася кіраўніцтвам камуністычнай партыі і савецкай дзяржавы.

Аднак аднаўляць прамысловасць было значна цяжэй, чым сельскую гаспадарку. Для гэтай мэты патрабаваліся не толькі большыя сродкі, але і спецыяльна падрыхтаваныя рабочыя і інжынерна-тэхнічныя работнікі. Матэрыяльна-тэхнічная база аднаўленчага працэсу ў прамысловасці была значна складаней і даражэй, ды і разбурэнні ў гэтай галіне з'яўляліся

цяжэйшымі. Абсалютная большасць фабрык і заводаў была разбурана ці поўнасцю, ці ў такой ступені, што запусціць іх можна было толькі пасля істотнага аднаўлення. Да таго ж працоўпыя калектывы прадпрыемстваў за гады Першай сусветнай войны, Кастрычніцкай рэвалюцыі, замежных ваенных інтэрвенцый панеслі настолькі вялікія страты, што аднаўленчы працэс пачынаўся пры зусім нязначнай іх частцы. Усё гэта рабіла працэс аднаўлення прамысловасці і транспарту складаным і больш працяглым.

Работа па аднаўленню прамысловасці, якая грунтавалася на новай эканамічнай палітыцы, праходзіла з улікам яе сутнасці і асаблівасцей. На дзейнасць прадпрыемстваў усё больш ўплыў пачалі аказваць фактары гаспадарчага разліку і прыбытку. Іх мэтаю з’яўлялася забеспячэнне самафінансавання вытворчасці. З прычыны таго што дзяржава, асабліва ў першыя гады аднаўлення гаспадаркі, не магла колькі - небудзь істотна фінансаваць фабрыкі і заводы, яны здымаліся з яе забеспячэння. У выніку шмат якія прадпрыемствы аказаліся закрытымі ці закансерваванымі. Частка з іх была дэнацыяналізавана і перададзена ў арэнду іншым арганізацыям ці нават прыватным асобам. Адмянялася ўраўняльная аплата працы, а таксама працоўная павіннасць.

У другой палове 1921 г. пачаўся перавод прадпрыемстваў на гаспадарчы разлік. У Беларускай ССР гэта ў першую чаргу закрапула лёгкую прамысловасць. Яе прадукцыя ў большай ступені была звязана з рынкам. Мелася на ўвазе, што гаспадарчы разлік павінен забяспечыць не толькі панесеныя затраты, але і даць пэўны прыбытак. Гэта праца ў рэспубліцы была ў асноўным завершана ў пачатку 1923 г.

Перавод прамысловасці на закладзеныя ў НЭПе прынцыпы гаспадарання запатрабаваў новых форм арганізацыі прамысловай вытворчасці. Вынікам гатага з'явіўся пераход да гаспадарчых аб’яднанняў як да самастойнай гаспадарчай адзінкі. У шэрагу выпадкаў дадзеную ролю выконвалі і асобныя прадпрыемствы. У адпаведнасці з пастановай цэнтральнага бюро кампартыі Беларусі ад 13 ліпеня 1921 г. на прадпрыемствах саўнаргаса Беларускай ССР было створана 16 гаспадарча-разліковых групавых упраўлснняў і 15 заводаўпраўленняў. Пазнсй колькасць упраўленняў была зменшана да 11. У Віцебскай губерні, якая ў той час не ўваходзіла ў склад БССР, дзейнічалі 12 групавых аб’яднанняў.

На аснове новых падыходаў да арганізацыі прамысловасці пачалася яе перабудова. У першую чаргу яна датычылася перазмеркавання падначаленасці прадпрыемстваў. Да канца 1922 т. у Беларускай ССР, а таксама ў Віцебскай і Гомельскай губернях, якія не ўваходзілі тады ў яе склад, за саўнаргасамі было пакінута толькі 167 прадпрыемстваў з 595. Адбываліся іншыя структурныя ўдакладненні ў арганізацыі прамысловай вытворчасці. Яны былі ў асноўным завершаны ў 1922 г.

Аднак непасрэдная праца па аднаўленню прамысловай вытворчасці праходзіла з вялікімі цяжкасцямі. Яны былі абумоўлены не толькі ўсеагульным разбурэннем, але і шматлікімі негатыўнымі з’явамі. Моцна даймаў, у прыватнасці, паліўны крызіс. Ён ахапіў у першую чаргу гарады.

Без яго вырашэння нельга было не толькі аднаўляць работу прадпрыемстваў, але і наладжваць бытавыя ўмовы жыцця насельніцтва. У пачатку 20-х гт. па чатыры-шэсць і нават больш месяцаў вымушаны былі прастойваць нават тыя прадпрыемствы, якія больш-менш працавалі. Прычынай гэтых прастояў з'яўлялася адсутнасць паліва. Прадпрыемствы Мінска былі забяспечаны палівам усяго на чвэрць. Для пераадолення такога становішча праводзіліся тыдні вывазкі паліва, прымаліся іншыя мсры. Паступова яны дазволілі зменшыць вастрыню паліўнага крызісу .

На адраджэнне прамысловасці негатыўна ўплываў вельмі нізкі жыццёвы ўзровень гарадскога насельніцтва ў пачатку 20-х гг. Неймаверныя цяжкасці з харчаваннем, вострая жыллёвая праблема ставілі перад многімі гарадскімі жыхарамі, у тым ліку работнікамі прадпрыемстваў, праблему выжывання. У мэтах выхаду са складаных абставін гараджане нярэдка шукалі паратунку ў сельскай мясцовасці. У выніку адбылося значнае скарачэнне гарадскога насельніцтва. У 1922 г. у параўнанні з 1917 г. у Беларускай ССР яно паменшылася амаль на 100 тыс. чалавек і склала толькі 184 тыс. Гэта з'ява фактычна прывяла да дэкласавання прамысловых рабочых.

Вялікія памеры набылі інфляцыйныя працэсы, якія фактычна перайшлі ў гіперінфляцыю. У лютым 1922 г. даваенны залаты рубель ацэньваўся ў 150 тыс. савецкіх рублёў. Дзяржаўныя органы вымушаны былі прыняць радыкальныя меры і правесці грашовую рэформу, якая была добра падрыхтавана і дала станоўчыя вынікі. На працягу 1923-1924 гг. адбыўся пераход на чырвонец. Пры гэтым удалося забяспечыць яго дастаткова высокую пакупную здольнасць.

Аднак першыя зрухі ў аднаўленні працы прадпрыемстваў прывялі да ўзнікнення перавытворчасці тавараў і крызісу збыту. Ен быў абумоўлены высокімі цэнамі на прамысловую прадукцыю і нізкім коштам прадуктаў сельскай гаспадаркі. Асаблівай вастрыні крызіс збыту дасягнуў у 1922-1923 гг. У выніку атрымалася вялікае затаварванне прадпрыемстваў, а сяляне не маглі набыць нават самыя неабходныя прамысловыя тавары. Паступова "нажніцы цэн" пераадольваліся.

Цяжкасці па аднаўленню прамысловасці яшчэ больш узрасталі ў сувязі з развалам у пачатку 20-х гг. транспартнай сістэмы. Асноўны від зносін і перамяшчэння грузаў - чыгункі - знаходзіліся ў поўным заняпадзе. У лютым 1922 г. на Заходняй чыгунцы каля 40 % цягнікоў і звыш 80 % вагонаў знаходзіліся ў нерабочым стане. Да поўнага развалу фактычна дайшоў і гарадскі транспарт.

Ва ўмовах новай эканамічнай палітыкі рашаючым фактарам выхаду з крызісу ў прамысловасці і на транспарце з'явілася стаўка на дробную вытворчасць і прыватны капітал. Гэта быў адзін з важнейшых прынцыпаў НЭПа. Дадзеная работа праводзілася на аснове дэкрэта Саўнаркома РСФСР ад 17 мая 1921 г., які абвяшчаў падтрымку дробных прыватных і кааператыўных саматужных прадпрыемстваў. Устанаўлівалася

недапушчальнасць залішняй рэгламентацыі і фармалізму, якія маглі б абмяжоўваць гаспадарчую ініцыятыву.

На аснове гэтага дэкрэта, іншых дзяржаўных актаў разгарнулася шырокая і актыўная праца па аднаўленню дробнай вытворчасці. У кароткі тэрмін былі дасягнуты станоўчыя вынікі. У 1926 г. у Беларускай ССР налічвалася звыш 60 тыс. дробных прадпрыемстваў. На іх працавала боль за 100 тыс. чалавек. Дробная вытворчасць і прыватны капітал адыгралі істотную ролю ў прамысловым аднаўленні Беларускай ССР, як і ўсёй краіны.

Асновай аднаўленчага працэсу з’яўлялася фінансаванне. Акрамя ўнутранага накаплення ў дзяржаўным сектары, гандлю, важнае значэнне мелі дзяржаўныя субсідыі. З утварэннем Саюза ССР надзвычай актуальнай праблемай сталі фінансавыя ўзаемаадносіны паміж саюзнымі рэспублікамі і цэнтрам, дзе канцэнтраваліся эканамічныя рэсурсы. Беларуская ССР уносіла ў саюзны бюджэт вялікую частку сваіх даходаў. У 1923/24 гаспадарчым годзе з усёй даходнай часткі бюджэту рэспублікі 57,6 % было аддадзена ў фонд Саюза ССР. У 1927/28 гаспадарчым годзе гэты паказчык зменшыўся, але заставаўся вельмі значным - 40,2 %

Безумоўна, матэрыяльнае забеспячэнне аднаўленчых работ у прамысловасці было асабліва вялікай праблемай. Ва ўмовах страшэннай разрухі і галечы фарміраванне бюджэту з’яўлялася надзвычай складанай справай.

Асноўнымі яго крыніцамі былі сельская гаспадарка, даходы з прыватных і дзяржаўных прадпрыемстваў, некаторыя іншыя накапленні. Пры гэтым кампартыя і савецкая дзяржава не грэбавалі ніякімі сродкамі, уключаючы канфіскацыю таго, што было накоплена на працягу многіх стагоддзяў служыцелямі розных рэлігій. Як адзначалася ў дакладзе тагачаснага кіраўніка кампартыі Беларусі В.Багуцкага на XII канферэнцыі (VII з'ездзе КП(б)Б), якая адбылася ў Мінску 20-26 сакавіка 1923 г., адной з важных кампаній ЦК кампартыі Бсларусі была канфіскацыя царкоўных каштоўнасцей. Партыя прыняла ў ёй самы дзейсны і рэўнасны ўдзел. У сувязі з супрацьдзеяннем рэлігійных дзеячаў канфіскацыі каштоўнасцей былі арганізаваны тры працэсы: ксяндзоў,служыцеляў праваслаўнай царквы (у Мазыры) і равінаў (у Мінску).

Прынятыя меры на фінансаванні прамысловасці і запуску прадпрыемстваў пачалі даваць пэўныя вынікі. Калі ўлічваць, што зыходныя пазіцыі былі вельмі нізкімі, любы зрух даваў значны прырост. Па Гомельскай губерні ў прыватнасці, якая знаходзілася ў той час у складзе РСФСР, аб'ём прамысловай прадукцыі на працягу 1921 г. павялічыўся на 31 %. У 1922 г. гэты паказчык дасягнуў 50 %.

У 1925 г. валавая прадукцыя буйной прамысловасці Беларускай ССР склала 75 % ад узроўню 1913 г. Для параўнання неабходна зазначыць, што збор зернавых у рэспубліцы ў гэты час перавысіў даваенны ўзровень на 20 %. Значыць, прамысловае будаўніцтва па прычыне сваёй спецыфікі аднаўлялася больш маруднымі тэмпамі, чым сельскагаспадарчая вытворчасць.

У той час дзяржаўныя і кааператыўныя прадпрыемствы давалі 81 % валавой прамысловай прадукцыі. Пэўныя поспехі былі дасягнуты ў вельмі важнай энергетычнай галіне прамысловага будаўніцтва - электрыфікацыі. У 1925 г. было выпрацавана 2925 млн кілават-гадзін электраэнергіі супраць 1945 млн кілават-гадзін у перадваенным 1913 г. Каб больш кардынальна вырашыць гэту праблему, у маі 1927 г. непадалёку ад Оршы пачалося будаўніцтва буйнейшай у рэспубліцы электрастанцыі - БелДРЭС. Яе магутнасць меркавалася давесці да 30 тыс. кВт.

У сярэдзіне 20-х гг. былі ўведзены ў лік дзеючых многія прадпрыемствы. Сярод іх скураны завод "Бальшавік" і галантарэйная фабрыка "Беларуска" ў Мінску, швейная фабрыка імя Дзяржынскага ў Гомелі, завод па вытворчасці дыхты ў Віцебску, запалкавая фабрыка і льночасальны камбінат у Рэчыцы, шэраг цагляных заводаў, прадпрыемстваў сельскагаспадарчага машынабудавання, па перапрацоўцы драўніны і інш. Рэканструіраваны быў мінскі завод "Энергія".

Значная ўвага была звернута на развіццё тарфяной прамысловасці - асновы энергетыкі ў той час. Быў створаны тарфяны трэст. У яго задачу ўваходзіла разведка і павелічэнне здабычы торфу.

Аднаўленне, а тым больш далейшыя зрухі ў прамысловасці былі немагчымымі без транспартых зносін. Асноўная нагрузка прыпадала на чыгунку, якая атрымала ў Беларусі значнае развіццё яшчэ ў дакастрычніцкі час. Аднак за гады ваеннага і рэвалюцыйнага ліхалецця, замежных ваенных інтэрвенцый чыгуначная гаспадарка прыйшла ў надзвычай цяжкі стан. Складаным было яе аднаўленне. Толькі вялікімі намаганнямі ўдалося прывесці ў рабочае становішча амаль 2,5 тыс. км чыгуначнага палатна, аднавіць шмат мастоў, рухомую частку, рэканструяваць некаторыя дэпо. Гэта дазволіла працаўнікам чыгункі выконваць да чатырох пятых грузавых і пасажырскіх перавозак, што на дзяржаўным узроўні ажыццяўлялася ў БССР.

Другое месца - да 10-15 % - у гэтых перавозках належала рачному транспарту. Некаторыя партыі былі рэканструяваны, узводзіўся шэраг новых, праводзіўся рамонт плавучых сродкаў. Нараджаўся аўтамабільны транспарт. У 1928 г. у рэспубліцы мелася каля 200 аўтамашын, у тым ліку да 50 грузавых. У сувязі з гэтым вялікая роля ва ўсёй гаспадарчай дзейнасці належала гужавому транспарту.

Дзякуючы працы рабочых, тэхнічных работнікаў, намаганням партыйных і дзяржаўных структур удалося дасягнуць дастаткова важкіх вынікаў у аднаўленні прамысловасці і транспарту. На працягу 1924 -1928 гг. прадукцыя фабрык і заводаў павялічылася ў Беларускай ССР у 2,3 раза. Сярод прамысловых галін найбольш дынамічна аднаўляліся, а затым атрымалі далейшае развіццё тарфяная, металаапрацоўчая, электратэхнічная.

Тым не менш, нягледзячы на гэта, Беларуская ССР заставалася аграрнай рэспублікай. Прамысловая галіна была развіта слаба. У 1924/25 гаспадарчым годзе прадукцыя заводаў і фабрык у агульным аб'ёме вытворчасці складала толькі 18,3 %. Удзельная вага БССР у прамысловай прадукцыі Саюза ССР заставалася надзвычай нізкай. Рэспубліка давала

толькі 1,16 % прадукцыі ўсёй цэнзавай прамысловасці. Пры гэтым металаапрацоўка займала ўсяго 0,7 % агульнадзяржаўнага аб'ёму валавой прадукцыі гэтай галіны.

Нягледзячы на такія паказчыкі, у 1926/1927 гаспадарчым годзе працэс аднаўлення прамысловасці ў Беларускай ССР быў завершаны. Гэта было характэрна і для ўсёй краіны. Дадзеная акалічнасць з'явілася падставай для рашучага наступу з боку камуністычнай партыі і савецкай улады на асабліва важныя кампаненты новай эканамічнай палітыкі - арэндныя адносіны, дробную вытворчасць, прыватны капітал, г. зн. на тую сферу эканомікі, якая адыграла істотную ролю ў аднаўленчым працэсе.

Гэта наступленне ажыццяўлялася дастаткова паспешліва нават тады, калі новая эканамічная палітыка яшчэ актыўна працавала на аднаўленне. а затым далейшае развіццё прамысловасці, транспарту, ссльскагаспадарчай вытворчасці. Дастаткова сказаць, што на працягу 12 месяцаў, пачынаючы з 1 мая 1924 г., колькасць прадпрыемстваў Вышэйшага савета народнай гаспадаркі Беларусі, якія былі здадзены ў арэнду, зменшылася са 192 да 6.

Больш таго, 8 верасня 1926 г. Саўнаркам Саюза ССР пастанавіў максімальна ўзмацніць абкладанне прыватнага капіталу, перайсці да адзяржаўлення дробнай вытворчасці і гандлю. Гзта пастанова з,явілася падставай для моцнага націску партыйна-дзяржаўнай улады на прыватны сектар; прыватнікам рэзка скарачаліся крэдыты, касаваліся арэндныя дагаворы, павялічваліся падаткі, прымаліся іншыя арганізацыйныя і фінансавыя меры па выцясненню гэтага сектара з эканомікі краіны. Напрацягу 1924-1927 гг. падатковае абкладанне прыватных прадпрыемстваў узрасло з 25 да 70 % ад іх даходаў.

Такія жорсткія меры не маглі не прывесці да адпаведных вынікаў. Удзельная вага прыватнага сектара ў агульнай прамысловай прадукцыі на працягу 1925/26-1927/28 гаспадарчых гадоў знізілася ў Беларускай ССР да 28,6 %. Дадзеная сфера эканомікі была пастаўлена ва ўмовы поўнага знікнення. Гэта рабілася ў той час, калі дзяржаўнаму сектару ў прамысловасці і на транспарце аказвалася ўсё большая дапамога і ён пачаў займаць дамінуючыя пазіцыі.

У яго аднаўленні і развіцці важную ролю адыгралі больш шырокія магчымасці фінансавання. На працягу 1926-1929 гг. даходы ад дзяржаўнай прамысловасці склалі ў БССР 27,8 млн руб. У прамысловую галіну накіроўвалася вялікая частка даходаў, што ўлівалася ў дзяржаўны бюджэт ад сельскагаспадарчай вытворчасці. Толькі ў выглялзе сельскагаспадарчага падатку ў бюджэт рэспублікі за гэтыя гады паступіла больш за 25 млн руб.

Для павелічэнння рэсурсаў на патрэбы прамысловасці з сярэдзіны 20-х гг. актыўна праводзілася работа па прыцягненню сродкаў насельніцтва. З гэтай мэтай пачалі выпускацца пазыкі індустрыялізацыі. Для іх больш паспяховага распаўсюджвання арганізоўваліся масіраваныя агітацыйна-прапагандысцкія кампаніі. У рэшце рэшт яны давалі адпаведныя вынікі. Калі першая пазыка індустрыялізацыі прынесла ў бюджэт Беларускай ССР 2,7 млн руб., дык другая - 10,3 млн руб. Прыцягненне ў значных памерах сродкаў

насельніцтва для прамысловага будаўніцтва адбывалася і ў наступныя часы. Розныя пазыкі выпускаліся не радзей чым адзін раз у год. Яны сталі важнай крыніцай папаўнення дзяржаўнага бюджэту, хаця іх вяртанне жыхарам Беларусі расцягнулася на многія дзесяцігоддзі.

Далейшае развіццё прамысловасці і транспарту стрымлівалася малалікасцю інжынерна-тэхнічных кадраў. Дастаткова сказаць, што ў 1928 г. на тых прадпрыемствах, што былі падпарадкаваны Вышэйшаму савету народнай гаспадаркі Беларусі, працавалі толькі 99 інжынераў і 166 тэхнікаў з закончанай спецыяльнай адукацыяй. Такое становішча прымушала актыўна шукаць шляхі папаўнення інжынерна-тэхнічных работнікаў. Іх падрыхтоўка вялася пераважна метадам брыгаднага і індывідуальнага навучання непасрэдна на прадпрыемствах. Паступова ўзнікла сістэма прафесійных навучальных устаноў - прафшкол, школ фабрычна-заводскага навучання, вучэбна-практычных майстэрань, прафесінных курсаў. Ужо ў 1928 г. у гэтай сістэме ў БССР навучалася звыш 8 тыс. чалавек.

Прынцыповым пытаннем, што ўзнікла ў ходзе аднаўлення гаспадаркі, у першую чаргу прамысловай і транспартнай галін, быў характар іх далейшага развіцця. Гэта праблема асабліва востра паўстала ў сярэдзіне 20-х гг. у сувязі з заканчэннем аднаўленчага працэсу. Характэрна, што ўжо ў ходзе аднаўлення прамысловасці і транспарту сталінская большасць у кіраўніцтве камуністычнай партыяй і савецкай дзяржавай мела на ўвазе іх далейшае развіццё толькі ў сацыялістычным напрамку. Дадзеная палітыка была сфармулявана на XIV з’ездзе ВКП(б), які праходзіў у снежні 1925 г., і фактычна пацверджана XV з’ездам (снежань 1927 г.). Альтэрнатыўныя шляхі, якія прапаноўваліся апазіцыяй на розных этапах выпрацоўкі лініі на індустрыялізацыю, былі адкінуты. У аснове афіцыйнай палітыкі ляжала сталінскае ўяўленне аб сацыялізме як унітарнай сістэме кіравання грамадствам.

Савецкая індустрыялізацыя была заснавана фактычна толькі на дзяржаўнай форме ўласнасці і аўтарытарным партыйна-дзяржаўным кіраўніцтве. У той час як у канцы XIX - пачатку XX ст. прамысловае будаўніцтва, якое нярэдка перарастала ў індустрыяльнае, вялося на аснове шматукладнай эканомікі, канкурэнцыі, фарміравання рыначных адносін пры адпаведным удзеле тагачаснай дзяржаўнай улады.

## Тэма 7. Асноўныя кірункі мадэрнізацыйных працэсаў у БССР (1943-1991 гг.)

Аднаўленчы перыяд у розных галінах эканомікі, грамадска-палітычным і культурным жыцці з цягам часу не заўсёды супадаў. Прамысловасць цалкам і большасць яе галін (за выключэннем лёгкай і харчовай) ужо ў 1950 г. (апошнім годзе 4-й пяцігодкі) дасягнула і перавысіла даваенны ўзровень па выпуску прадукцыі. У той жа час

сельская гаспадарка выйшла з пасляваеннага крызіснага стану і ўступіла на шлях далейшага развіцця толькі ў сярэдзіне 50-х гг.

Паняцце «пасляваеннае аднаўленне» ўключала ў сябе не толькі пераадоленне ваенных разбурэнняў, але і вяртанне да той мадэлі развіцця СССР, якая вызначылася ў 30-я гг. Яе сутнасцю з'яўлялася мадэрнізацыя. Мадэрнісцкі курс развіцця краіны, у тым ліку і Беларусі, дастаткова выразна вызначыўся ўжо ў гады першай пасляваеннай пяцігодкі. Выявілася гэта ў апераджальных тэмпах аднаўлення і развіцця цяжкай прамысловасці ў параўнанні з лёгкай. У Беларусі асабліва высокімі тэмпамі развіваліся машынабудаванне і электраэнергетыка. Пасляваеннае аднаўленне Беларусі адбывася ў двух вымярэннях. Эканоміка і перш за ўсё прамысловасць аднаўляліся пры адначасовым працягу яе мадэрнізацыі, што вяла яе на больш высокі тэхнічны ўзровень у параўнанні з даваенным часам. У той жа час грамадска-палітычная сістэма краіны не мадэрнізавалася і аднаўлялася ў нязменным выглядзе. На гэтай падставе ствараліся перадумовы для ўзнікнення абвастрэння супярэчнасцей паміж неабходнасцю далейшай мадэрнізацыі краіны і ўстарэлымі формамі кіраўніцтва.

У выніку вайны і злачынстваў нямецка-фашысцкіх захопнікаў беларускі народ страціў звыш паловы нацыянальнага багацця. Былі спалены і зруйнаваны 209 гарадоу і гарадскіх пасёлкаў, 9200 вёсак, разбурана 10338 заводаў і фабрык, знішчана 96 % электрычных магутнасцей. Вялікія страты панеслі ўсе віды транспарту і сувязі.

У Мінску пасля яго вызвалення ад нямецкіх акупантаў 3 ліпеня 1944 г. захавалася толькі некалькі буйных будынкаў. У іх ліку — Дом урада, Дом Чырвонай Арміі, Тэатр оперы і балета. Аднак самымі вялікімі былі чалавечыя страты: яны склалі 1/3 насельніцтва Беларусі.

Аднаўленне прамысловасці і іншых галін эканомікі пачалося з восені 1943 г., калі частка тэрыторыі на ўсходзе Беларусі была вызвалена Чырвонай Арміяй ад акупацыі. Па меры далейшага вызвалення тэрыторыі рэспублікі пашыраўся і фронт аднаўленчых работ. А ў верасні 1946 г. Вярхоўны Савет БССР прыняў «Закон аб плане аднаўлення і развіцця народнай гаспадаркі рэспублікі на 1946—1950 гг.», які з'яўляўся састаўной часткай агульнасаюзнага плана. Да канца пяцігодкі прамысловая прадукцыя БССР павінна была не толькі дасягнуць даваеннага ўзроўню, але і перавысіць яго, прычым найбольш значна па машынабудаванні, энергетыцы, торфаздабычы, хіміі. Выйсці на даваенны ўзровень і пераўзысці яго павінны былі ўсе галіны эканомікі.

Неабходна было спалучыць вялізныя матэрыяльна-сыравінныя і чалавечыя рэсурсы ў адзіным, добра арганізаваным вытворчым працэсе, каб выканаць такую буйнамаштабную задачу. Ад гэтага залежаў не толькі лёс планаў, што намячалі, але грамадства і дзяржавы ў цэлым.

Цяжкасці ўскладняліся тым, што Беларусь не мела сваіх неабходных разведаных крыніц сыравіны, за выключэннем багатых запасаў торфу, а яе матэрыяльна-тэхнічная база за гады вайны аказалася амаль поўнасцю знішчанай. У гэтых умовах найбольш істотным для Беларусі з'яўлялася тое, што амаль усё неабходнае для разгортвання аднаўленчых работ яна атрымлівала з агульнасаюзных крыніц. Саюзны ўрад на аднаўленне народнай гаспадаркі Беларусі і на дапамогу насельніцтву вылучыў значныя грашовыя сродкі, шмат станкоў, металу, будаўнічых матэрыялаў, харчавання, адзення, абутку, медыкаментаў і інш.

Дапамогу Беларусі ў аднаўленні яе гаспадаркі аказвалі іншыя рэспублікі СССР, якія пазбеглі гітлераўскай акупацыі. Акрамя таго, згодна з пасляваеннымі міжнароднымі дамоўленасцямі рэспубліка атрымала пэўную частку германскіх рэпарацый. Магчымасць атрымання Беларуссю неабходных сыравінных матэрыяльна-тэхнічных рэсурсаў азначала, што поспехі ў аднаўленні народнай гаспадаркі ў тых канкрэтных умовах цалкам залежалі ад чалавечага фактару. У цяжкіх умовах разрухі патрабаваліся не проста рабочыя рукі, а людзі, адданыя працы, гатовыя да самаахвяравання, пераадолення вялікага цяжару і няўзгод. Такія людзі ў Беларусі не проста былі, а складалі пераважную большасць. Уласцівыя беларускаму народу працавітасць, вынаходніцкі талент, цярпімасць і сіла волі ў пасляваенныя гады дапоўніліся ўзрослай яго самасвядомасцю, што стала вынікам перамогі над такім моцным і небяспечным ворагам, якім з’яўлялася фашысцкая Германія. Вера ў сябе і ў свае сілы ўсяляла ў людзей надзеі на паспяховае пераадоленне і ваенных разбурэнняў, і пасляваеннага цяжару жыцця. У савецкай гістарыяграфіі аднаўленне народнай гаспадаркі ў СССР у пасляваенныя гады трактуецца як гераічны подзвіг народа-пераможцы, у якім адлюстраваліся ўсе яго лепшыя якасці. І гэта сапраўды так. Сярод рабочых краіны разгарнулася шырокае спаборніцтва за высокія працоўныя дасягненні, якія адпавядалі лепшым узорам перадавікоў і наватараў вытворчасці.

У Беларусі да іх ліку адносіліся: фрэзероўшчык Віцебскага завода заточных станкоў І. Жамчужны і токар Г. Клімаў, токар Віцебскага станкабудаўнічага завода «Камінтэрн» І. Пасаманаў, закройшчыца Гродзенскай абутковай фабрыкі Г. Радчанкава, мінскія муляры А. Філіпаў, Д. Булахаў, П. Дудко, тынкоўшчык А. Дзігілевіч, сталявар Мінскага аўтазавода Д. Барашкін і інш. Шырокі размах набыў рух рацыяналізатараў і вынаходнікаў, якія ўнеслі дзясяткі тысяч прапаноў па ўдасканаленні тэхнікі і прылад працы, эканоміі сыравіны і зберагані энергарэсурсаў. У рэспубліцы і за яе межамі сталі вядомымі імёны рацыяналізатараў і вынаходнікаў: В. Нарбутовіча («Гомсельмаш»), Л. Калеснікава (Магілёўскі гарбарны завод), В. Вяселіка (Ваўкавыскі цэментны завод), В. Шышэнька (Крычаўскі цэментны завод), І. Дывень (Гомельскі станкабудаўнічы завод імя С. М. Кірава), І. Шышкіна (Мінскі трактарны завод), А. Валюжынца (Магілёўскі металаапрацоўчы камбінат) і інш.

Менавіта людзі працы вырашылі лёс першай пасляваеннай, як і ўсіх наступных, пяцігодкі. Ужо ў 1950 г. аб'ём прадукцыі прамысловасці перавысіў даваенны ўзровень на 15 %, а яе вядучых галін — машынабудавання і металаапрацоўкі — у 2,4 раза. Упершыню ў рэспубліцы быў асвоены выпуск аўтамабіляў, трактараў, веласіпедаў. У лёгкай прамысловасці, якая хаця і не дасягнула ў канцы пяцігодкі даваеннага ўзроўню, увайшлі ў строй дзеючых шэраг новых буйных прадпрыемстваў. Сярод іх Віцебскі дыванова-плюшавы камбінат, Мінскі і Гродзенскі тонкасуконныя камбінаты. Расшыралася энергетычная і паліўна базы. У 1950 г. выпрацоўка элекграэнергіі перавысіла даваенні ўзровень на 47%, здабыча торфу— на 16 %, будаўнічых матэрыялаў — на 34 %. Асабліва высокімі тэмпамі ішло аднаўленне і развіццё прамысловасці заходніх абласцей Беларусі: у 1950 г. выпуск прамысловай прадукцыі тут амаль у 2 разы перавысіў узровень 1940 г. Такім чынам, аднаўленне народнай гаспадаркі перш за ўсё прамысловасці Беларусі ў першыя пасляваенныя гады адбылося ў надзвычай сціслыя тэрміны. Гэтаму спрыяла ўнутраная грамадска-палітычная стабільнасць, узрастанне міжнароднага аўтарытэту СССР і БССР. Важную ролю адыграла дапамога, якую атрымаў беларускі народ ад іншых рэспублік і ўрада СССР. У аднаўленні разбураных вайной тэрыторый зацікаўлены быў увесь савецкі народ. Уключэнне гэтых тэрыторый гаспадарчую дзейнасць краіны вяло да павышэння жыццёвага ўзроўню ўсяго насельніцтва. Аднак галоўным з'яўлялася самаадданая праца рабочых, ІТР і служачых, іх вера ў лепшую будучыню. Калі параўнаць аднаўленчыя працэсы 20-х і 40-х гг. у Беларусі, то відаць, што яны істотна адрозніваліся.

Для вызначэння шляхоў далейшага індустрыяльнага развіцця рэспублікі важнае значэнне мела тое, што ў выніку пасляваеннага аднаўлення істотна змянілася структура прамысловай вытворчасці. Калі да вайны пераважаючай у прамысловасці была прадукцыя такіх галін, як лёгкая, харчовая, лясная, дрэваапрацоўчая, то цяпер — машынабудавання і металаапрацоўкі. Узяты ў ходзе пасляваеннага аднаўлення народнай гаспадаркі напрамак развіцця прамысловасці стаў вызначальным на ўвесь далейшы перыяд існавання БССР. Першым пацвярджэннем гэтаму стала пятая пяцігодка (1951—1955 гг.). Буйнамаштабны рост прамысловай вытворчасці забяспечваўся перш за ўсё будаўніцтвам і ўвядзеннем у эксплуатацыю звыш 150 новых буйных прадпрыемстваў. Толькі ў Мінску ўвайшлі ў строй дзеючых завод ацяпляльнага абсталявання і каналізацыйных труб, камвольны камбінат, радыёзавод, падшыпнікавы завод. У Оршы пачаў дзейнічаць завод швейных машын, у Віцебску— шоўкаткацкая фабрыка. Значна пашырылі выпуск прадукцыі ўжо дзеючыя прадпрыемствы, асабліва МТЗ, МАЗ, «Гомсельмаш», станкабудаўнічыя заводы. Рашаючым фактарам забеспячэння высокіх тэмпаў развіцця прамысловасці ў рэспубліцы па-ранейшаму з’яўляўся працоўны энтузіязм рабочых і служачых. Ён выявіўся ва ўсеагульным спаборніцтве за лепшыя вытворчыя паказчыкі, укараненні наватарскіх метадаў працы, развіцці рацыяналізацыі і вынаходніцтва і інш. Вядомымі сталі імёны наватараў вытворчасці токара МТЗ П. Арахоўскага,

токараў Аршанскага станкабудаўнічага завода «Чырвоны барацьбіт» Р. Палякова і У. Станкевіча, слесара З. Атрашкевіча, брыгадзіра Магілёўскага завода штучнага валакна Н. Волкавай і інш.

**Сельская гаспадарка.** У першыя пасляваенныя гады яна знаходзілася ў цяжкім становішчы. Маёмасць калгасаў і саўгасаў была разрабавана, поўнасцю быў знішчаны парк сельскагаспадарчых машын. Таму прадукцыйнасць аднoўленых пасля вызвалення калгасаў і саўгасаў ва ўсходніх абласцях Беларусі заставалася надзвычай нізкай. Для падняцця іх матэрыяльна-тэхнічнай базы неабходны былі значныя сродкі, выдзяліць якія дзяржава аказалася не ў стане. Увогуле аграрная палітыка партыйнага кіраўніцтва ў гэтыя гады вызначалася падпарадкаваннем сельскай гаспадаркі інтарэсам прамысловасці. Палажэнне ў сельскай гаспадарцы Беларусі ўскладнялася яшчэ тым, што адначасова з аднаўленнем калгасна-саўгаснай вытворчасці ў яе ўсходніх абласцях адбывалася калектывізацыя сельскай гаспадаркі заходніх абласцей. А яна, як вядома, звязана з ломкай сялянскай гаспадаркі, якая складвалася стагоддзямі. Да таго ж, калектывізацыя праводзілася ў сціслыя тэрміны, з прымяненнем прымусовых мер. У адпаведнасці з вопытам, набытым у пачатку 30-х гг., заможныя гаспадаркі былі ліквідаваны, а звыш 10 тыс. сялянскіх сямей былі высланы ў Сібір і Казахстан. У выніку да канца 1950 г. калектывізацыя ў заходніх абласцях Беларусі амаль што завяршылася. Аднак палажэнне ў сельскай гаспадарцы рэспублікі не толькі не палепшылася, а яшчэ больш пагоршылася. Калі ў 1950 г. былі амаль што дасягнуты даваенныя паказчыкі па плошчы пасеваў, валаваму збору збожжа, па жывёлагадоўлі, то у 1953 г. збор збожжа зноў скараціўся на 40 %, адбылося скарачэнне і іншых паказчыкаў. Гэта азначае, што сельская гаспадарка Беларусі, як і ўсёй краіны, у пасляваенныя гады перажывала глыбокі крызіс, таму становішча сялян было вельмі цяжкім. Платай калгаснікам за іх знясільваючую працу былі працадні, за якія яны амаль нічога не атрымлівалі і жылі толькі за кошт таго, што мелі з асабістых агародаў. Пры такіх умовах ў калгаснікаў не было эканамічнага стымулу да працы. Але не працаваць яны не маглі: ад іх гэтага патрабавала калгаснае кіраўніцтва. Існавала і судовая адказнасць за неўдзел у калгаснай вытворчасці. Аднаўленне сельскай гаспадаркі па часе заняло больш працяглы перыяд, чым у прамысловасці, і яго завяршэннем умоўна можна лічыць сярэдзіну 50-х гг. Пераломным стаў верасень 1953 г., калі партыйнае кіраўніцтва і ўрад краіны змянілі аграрную палітыку ў напрамку выкарыстання, поруч з каманднымі, эканамічных метадаў кіравання сельскай гаспадаркай: павысіліся закупачныя цэны на сельгаспрадукцыю, уводзілася абавязковая грашовая аплата працы калгаснікаў, рэзка ўзрастала вытворчасць сельскагаспадарчай тэхнікі і аснашчэнне ёю калгасаў і саўгасаў і г. д. Вынікі гэтага праявіліся ў тым, што становішча ў сельскай гаспадарцы пачало паляпшацца, а з сярэдзіны 50- х гг яна ўступіла ў перыяд стабільнага развіцця.

Сярэдзіна 50-х гг. ХХ ст. вызначалася жорсткай крытыкай метадаў кіраўніцтва краінай з боку І. В. Сталіна і наступстваў яго культу. Тым не

менш, у другой палове 50-х гг. М. С. Хрушчоў, як і ў свой час І. В. Сталін, зноў паставіў задачу ў сціслыя тэрміны дагнаць і пераўзыйсці буйнейшыя капіталістычныя краіны па вытворчасці важнейшых відаў прадукцыі на душу насельніцтва. Да іх адносіліся: чугун, сталь, вугаль, нафта, газ, а таксама машыны, станкі, абсталяванне і інш. Увогуле гэта азначае, што прыярытэт па-ранейшаму аддаваўся развіццю цяжкай прамысловасці. Беларусь сваіх сыравінных крыніц практычна не мела, але ж у яе была кваліфікаваная рабочая сіла і спрыяльнае геаграфічнае становішча, што стварала выгадныя ўмовы для развіцця вытворчасці. Таму яе ўдзел у вырашэнні пастаўленай перад краінай задачы непазбежна звязваўся з развіццём перапрацоўчай прамысловасці. Такім чынам, узяты ў аднаўленчы перыяд курс на апераджальнае развіццё ў прамысловасці рэспублікі машынабудавання атрымаў новы імпульс у гады кіраўніцтва краінай М. С. Хрушчова. Паскоранымі тэмпамі павінны былі развівацца таксама хімічная прамысловасць, электраэнергетыка, металаапрацоўка і інш. Калі агульны аб’ём прамысловай і прадукцыі БССР у 1965 г. павялічыўся ў параўнанні з 1950 г. на 606%, то прадукцыя машынабудавання і металаапрацоўкі - у 20 разоў, а электраэнергетыкі — у 16. Дзейнічалі такія галіны машынабудавання, як станкабудаўнічая, аўтамабільная, трактарная, падшыпнікавая, электратэхнічная, радыётэхнічная, прыборабудаўнічая і інш. У гэтыя гады выйшлі на поўную магутнасць трактарны, аўтамабільны і мотавеласіпедны заводы ў Мінску. Былі пабудаваны новыя заводы: Беларускі аўтамабільны завод (БелАЗ) у Жодзіна, Бабруйскі завод аўтатрактарных дэталей, Мінскі маторны завод, Мінскі завод трактарных запасных частак, Баранавіцкі завод аўтамабільных агрэгатаў, Барысаўскі завод аўтамабільнага электраабсталявання, Віцебскі завод радыёдэталей, Гомельскі завод электраапаратуры, Мінскі гадзіннікавы завод, Мінскі электратэхнічны завод, Мінскі завод аўтаматычных ліній, Мазырскі завод міліяратыўных машын, Мінскі завод электрахаладзільнікаў і інш. Такіх тэмпаў развіцця машынабудавання раней рэспубліка не ведала.

Ужо ў другой палове 50-х гг. кіраўніцтва краіны ўзяло курс на хімізацыю народнай гаспадаркі. Гэта неабходна было як для хутчэйшага ўздыму сельскай гаспадаркі, так і для забеспячэння далейшай мадэрнізацыі краіны. Уласнай сыравіны для развіцця хімічнай прамысловасці ў Беларусі было няшмат. Існавала вытворчасць прадукцыі лесахіміі, фарбаў, лакаў, штучнага валакна і інш. І толькі адкрыццё вялікіх запасаў калійных солей у Салігорскім раёне дазволіла развярнуць у рэспубліцы шырокамаштабную вытворчасць мінеральных угнаенняў. А ў раёне Рэчыцы пачалася здабыча ўласнай нафты. Але залежы яе невялікія, таму ўласная нафта забяспечвае патрэбнасці Беларусі не больш як на 10 %.Тым не менш умовы для развіцця хімічнай прамысловасці Беларусі ў гэтыя гады аказаліся спрыяльнымі. Як вядома, галоўнай крыніцай сыравіны для яе з'яўляюцца прыродны газ і нафта. Па трубах з Расіі праз Беларусь яны пачалі пастаўляцца ў краіны Заходняй Еўропы. Таму праблемы пастаўкі нафты і газу ў Беларусь не ўзнікала. З улікам гэтага ў другой палове 50-х першай палове 60-х гг. у

Беларусі ажыццявілася будаўніцтва шэрагу буйных прадпрыемстваў, якія сталі называцца гігантамі вялікай хіміі. Сярод іх - Полацкі нафтаперапрацоўчы завод, першы і другі Салігорскія калійныя камбінаты, Светлагорскі завод штучнага валакна, Гомельскі суперфасфатны і Гродзенскі азотнатукавы заводы і інш. У 1965 г. выпуск прадукцыі хімічнай і нафтахімічнай прамысловасці ў рэспубліцы павялічыўся ў параўнанні з 1950 г. у 27 разоў. Сапраўды, БССР стала рэспублікай вялікай хіміі. Развіваліся і ўсе іншыя галіны прамысловасці, у тым ліку лёгкая, харчовая, лясная, дрэваперапрацоўчая і цэлюлозна-папяровая. Аднак па тэмпах развіцця яны істотна ўступалі тым галінам, якія адносіліся да цяжкай прамысловасці. Асаблівасцю гэтых гадоў з'яўлялася і тое, што адбывалася бесперапыннае тэхнічнае ўдасканаленне прамысловай вытворчасці. Ва ўсіх яе галінах устанаўліваліся механізаваныя паточныя і аўтаматычныя лініі, былі створаны сотні комплексна механізаваных і аўтаматызаваных участкаў, цэхаў, дзесяткі прадпрыемстваў. Апераджальнымі тэмпамі развіваліся неметалаёмісныя галіны — прыборабудаванне, электроніка і радыёэлектроніка. У той жа час эканамічныя паказчыкі ў развіцці прамысловасці ў першай палове 60-х гг. значна пагоршыліся. Знізіліся тэмпы прыросту прадукцыйнасці працы. Адбылося зніжэнне фонда- і капіталааддачы, рэнтабельнасці прадпрыемстваў. У гэтым адбілася неэфектыўнасць кіраўніцтва з адзінага цэнтра надзвычай складанай народнай гаспадаркай СССР, недастатковае пазнанне эканамічных законаў, суб'ектывізм і валюнтарызм у кіраванні эканомікай.

Такім чынам, перыяд з сярэдзіны 50-х да сярэдзіны 60-х гг. у развіцці прамысловасці Беларусі характарызаваўся завяршэннем фарміравання прамысловага комплексу рэспублікі. У складзе СССР Беларусь ператварылася ў адзін з важных цэнтраў машына-, станка- і прыборабудавання, электронікі і радыёэлектронікі, нафтаперапрацоўкі і хімічнай вытворчасці.

**Сельская гаспадарка.** Вераснёўскі (1953 г.) Пленум ЦК КПСС прыняў меры па вываду сельскай гаспадаркі з крызісу. Яны далі станоўчыя вынікі. Ужо ў другой палове 50-х у рэспубліцы вырасла ўраджайнасць палёў, павялічылася пагалоўе жывёлы, а адпаведна і нарыхтоўка мяса, малочных прадуктаў. З сярэдзіны 50-х гг. сельская гаспадарка Беларусі ўпершыню за пасляваенныя гады стала рэнтабельнай. З мэтаю павышэння матэрыяльнай зацікаўленасці калгаснікаў у выніках сваёй працы з 1956 г. пачалі кожны месяц выплачваць грашовыя авансы на працадні. У калгасах ствараліся грашовыя і прадуктовыя фонды, што ў пэўнай меры гарантавала рэгулярную аплату працы. Каб палепшыць выкарыстанне сельскагаспадарчай тэхнікі, пашырыць гаспадарчую самастойнасць калгасаў і саўгасаў, у 1958 адбылася рэарганізацыя МТС. Яны былі ліквідаваны, а тэхніка перададзена калгасам і саўгасам, якую яны павінны выкупіць. На гэтай падставе многія, асабліва заможныя калгасы, ператвараліся ў буйныя шматгаліновыя гаспадаркі. Яны значна палепшылі прадукцыйнасць вытворчасці. У іх ліку быў калгас «Рассвет» Кіраўскага раёна Магілёўскай

вобласці. Яго высокімі дасягненнямі ў пад'ёме сельскагаспадарчай вытворчасці ганарылася ўся краіна. Заслуга ў гэтым належала перш за ўсё таленавітаму кіраўніку калгаса К. П. Арлоўскаму, а таксама калгаснікам, якія сваёй цяжкай самаадданай працай паднялі пасля вайны калгас з руін і пераўтварылі яго ў магутную гаспадарку.

БССР разам з іншымі савецкімі рэспублікамі ўнесла свой уклад у ажыццяўленне буйнамаштабнага эканамічнага мерапрыемства, якое было звязана з асваеннем цалінных і абложных зямель Казахстана. БССР пастаўляла туды сельскагаспадарчую тэхніку, укамплектавала кадрамі 24 новыя саўгасы. На асваенне цаліны выехала 50 тыс. сямей (амаль 180 тыс. чалавек). Дзякуючы самаадданай працы краіна атрымала істотную прыбаўку зерня, а цаліна стала значным гаспадарчым і палітычным дасягненнем СССР.

Аднак пагаршэнне эканамічнай сітуацыі ў пачатку 60-х гг. адмоўна адбілася і на развіцці сельскай гаспадаркі Беларусі. У 1960 г. паказчыкі яе росту былі ніжэй, чым у 1958 г. Таму прымаліся новыя захады па павышэнні рэнтабельнасці сельскагаспадарчай вытворчасці і матэрыяльнай зацікаўленасці калгасаў і саўгасаў. На развіцці сельскай гаспадаркі адмоўна адбіўся суб'ектывізм у кіраўніцтве гэтай галінай эканомікі. Калгасы і саўгасы атрымлівалі шаблонныя ўказанні з цэнтра без уліку мясцовых умоў. Пад уплывам такіх указанняў у Беларусі былі ліквідаваны севазвароты, аслаблена ўвага да лугоў і культурных пасеваў, адбылася «кукурузная ліхаманка» і інш.

50—60-я гг. засталіся ў памяці народа як час відавочнага павышэння іх матэрыяльнага дабрабыту. Асноўнай крыніцый гэтага павышэння з'явіўся рост нацыянальнага даходу, што было вынікам паспяховага развіцця ўсіх галін эканомікі. Формамі павышэння дабрабыту з'яўляліся: 1) павелічэнне рэальных даходаў насельніцтва; 2) удасканаленне сацыяльнага забеспячэння; 3) развіццё гандлю і бытавога абслугоўвання; 4) паскарэнне жыллёвага будаўніцтва; 5) паляпшэнне сістэмы аховы здароўя. Рэальныя даходы насельніцтва павялічыліся дзякуючы аднаразоваму зніжэнню рознічных цэн на прадукты харчавання, прамысловыя тавары. Адначасова сістэматычна змяншаліся падаткі з рабочых, служачых і калгаснікаў, былі адменены на халасцякоў і маласямейных. Хутка расла і заработная плата рабочых і служачых. З 1953 да 1964 г. яна павялічылася больш чым на 44,5 %, ІТР — на 26 %, служачых — на 33 %. Рэальнае павышэнне даходаў насельніцтва адбывалася і за кошт грамадскіх фондаў спажывання, выплаты з якіх за гэты перыяд павялічыліся больш як у 2 разы. У гэтыя гады раслі і рэальныя даходы калгаснікаў. У 1965 г яны былі ў некалькі разоў вышэйшыя, чым у 1950 г. Значна павысіліся памеры пенсій. У 1965 г. быў прыняты закон аб пенсіях калгаснікам, які ўпарадкаваў іх пенсіённую справу. Хутка развівалася сфера абслугоўвання, якая ўключала ў сябе гандаль, грамадскае харчаванне, бытавыя паслугі жыллёва-камунальную гаспадарку, ахову здароўя, адукацыю.

Першая палова 60-х гг. у СССР, у тым ліку і ў Беларуі вызначылася пагаршэннем эканамічнай сітуацыі. Знізіліся сярэднегадавыя паказчыкі прыросту прадукцыйнасці працы ў прамысловасці, фонда- і капіталааддачы,

рэнтабельнасці прадпрыемстваў. Прычынамі з'яўляліся: 1) адсутнасць рыначнага механізму рэгулявання эканамічнага развіцця; 2) неэфектыўнасць кіравання з адзінага цэнтру надзвычай складанай гаспадаркай СССР у рамках якой функцыяніравала больш за 1,5 млн прадпрыемстваў; 3) непаўната пазнання і ігнараванне эканамічных законаў, суб'ектывізм і валюнтарызм у кіраванні экономікай; 4) змены ў сусветных цэнах на сыравіну, прамысловыя вырабы, неўраджай, засухі і інш. З мэтай пераадолення гэтых адмоўных з’яў была зроблена адна з рашучых у пасляваенныя гады спроб радыкальных змен у экономіцы на аснове рэформы 1965 г. Яна прадугледжвала ўдасканаліць сістэму планавання ў прамысловасці. Замест 100 абавязковых планавых паказчыкаў заставаліся толькі 8, астатнія планавалі самі прадпрыемствы. Галоўнае заключалася ў тым, што існаваўшы раней паказчык работы прадпрыемства — аб'ём валавай прадукцыі — саступіў месца аб’ёму рэалізаванай прадукцыі. На прадпрыемствах уводзіўся гаспадарчы разлік, што вяло да пашырэння іх гаспадарчай самастойнасці. У прыватнасці яны атрымалі права самастойна распараджацца часткай прыбытку, ствараць грашовыя фонды для развіцця вытворчасці, матэрыяльнага заахвочвання працаўнікоў, паляпшэння іх умоў працы. Змянялася і арганізацыя кіравання прамысловасцю. Створаныя ў 1957 г. саўнаргасы былі ліквідаваны, а міністэрствы адноўлены. Гэта значыць, што ад тэрытарыяльнай сістэмы ўпраўлення экономікай зноў вярнуліся да галіновай.

Рэформа была разлічана на шэраг гадоў, і першыя яе крокі ўсялялі надзеі. Восьмая пяцігодка (1966—1970 гг.) была выканана па ўсіх асноўных паказчыках. У рэспубліцы было ўведзена ў строй 78 буйных прамысловых прадпрыемстваў. Як і раней, больш высокімі тэмпамі развіваліся хімічная, нафтахімічная, паліўная галіны. Нарошчваліся магутнасці ў электраэнергетыцы, машынабудаванні, металаапрацоўцы і інш. Але поспех пачатковага этапа эканамічнай рэформы быў непрацяглым. Пасля шматлікіх карэктыровак, паправак і дапаўненняў яна з буйнамаштабнай пераўтварылася ў касметычную, а да пачатку 70-х гг. фактычна перастала дзейнічаць. Рэформа аказалася наборам супярэчлівых мер. Немагчыма было, напрыклад, спалучыць пашырэнне самастойнасці прадпрыемстваў і ўзмацненне паўнамоцтваў міністэрстваў і ведамстваў. Рэформа не зжывала старую камандна-адміністрацыйную сістэму, таму ўжо першапачаткова асуджала сябе на няўдачу. Да таго ж, непахіснымі аказаліся старыя догмы аб рынку, рынычных адносінах, таварна - грашовых адносінах, законевартасці, якія, на думку партыйнага кіраўніцтва краінай, пярэчылі сацыялізму, таму адхіляліся. Спыненне рэформы станавілася паступова адчувальным, а наступствы выразна праявіліся толькі ў сярэдзіне 80-х гг. Планы развіцця прамысловасці Беларусі ў гэтыя гады ў цэлым выконваліся. Але гэты перыяд для народнай гаспадаркі быў супярэчлівым. Ствараліся новыя галіны прамысловасці, уводзіліся ў строй новыя прадпрыемствы, і адначасова адбывалася скарачэнне тэмпаў эканамічнага росту. Перадавы ўзровень у

аэракасмічнай і абароннай галінах прамысловасці спалучаўся з захаваннем застарэлага абсталявання і тэхналогій ў большасці іншых галін. Адбываўся рост дабрабыту і рэальных даходаў насельніцтва і адначасова рост дэфіцыту тавараў першай неабходнасці. У Беларусі паказчыкі развіцця прамысловасці ў 70-я — першай палове 80-х гг. былі аднымі з самых высокіх у СССР. За гэтыя 15 гадоў прадукцыя прамысловасці рэспублікі павялічылася больш чым у 3 разы. У строй дзеючых былі ўведзены звыш 170 прадпрыемстваў. У іх ліку нафтаперапрацоўчы завод у Мазыры, металургічны — у Жлобіне, сінтэтычных валокнаў у Гродна, інструментальны — у Оршы, чацвёрты калійны камбінат у Салігорску і інш. Апераджальнымі тэмпамі расла вытворчасць прадукцыі галін прамысловасці, якія вызначалі навукова-тэхнічную рэвалюцыю: прыборабудавання, электроннай і радыётэхнічнай прамысловасці, вытворчасці сродкаў сувязі. Узрос тэхнічны ўзровень вытворчасці. У 1985 г. дзейнічалі 227 комплексна-механізаваных і аўтаматызаваных прадпрыемстваў і 4100 такіх жа вытворчасцей, цэхаў і ўчасткаў. Гэтыя гады былі перыядам далейшага развіцця чыгуначнага, аўтамабільнага, трубаправоднага і паветранага транспарту. Працягваў удасканальвацца гарадскі транспарт. У 1984 г. была здадзена ў эксплуатацыю першая чарга Мінскага метрапалітэна. Хутка развіваўся і самы малады і эканамічны від транспарт трубаправодны. Агульная працягласць газа- і нафтаправодаў у Беларусі ў 1985 г. дасягнула амаль 3 тыс. км. Аднак эканоміка Беларусі, як і ўсяго СССР, да першай паловы 80-х гг. былы дынамізм страціла. Калі сярэднегадавыя тэмпы прыросту нацыянальнага даходу Беларускай ССР у 1971—1975 гг. складалі 8,3 %, то у 1981—1985 гг,— 5,6 %, прадукцыі прамысловасці — адпаведна 10,4 і 5,4, прадукцыйнасці працы — 7,4 і 5,3. Гэта азначала, што ў эканоміцы СССР, у тым ліку і Беларусі, склаўся механізм тармажэння. Прычыны яго ўзнікнення заключаліся ў тым, што існаваўшы гаспадарчы механізм з манапольнай дзяржаўнай уласнасці, каманднa-адміністрацыйнымі метадамі кіравання, цэнтралізаваным планаваннем і размеркаваннем стаў архаічным і ператварыўся ў тормаз на шляху развіцця прадукцыйных сіл. Вытворчыя адносіны не проста адсталі ад развіцця прадукцыйных сіл, але і поўнасцю сябе вычарпалі. Аднак галоўнай прычынай з'яўлення механізму тармажэння стала нежаданне палітычнага кіраўніцтва краіны праводзіць радыкальнае рэфармаванне форм і метадаў гаспадарання, якія б садзейнічалі высокай працоўнай актыўнасці і развіццю прадпрымальніцтва. Існаваўшы гаспадарчы механізм прыводзіў да таго, што і. задачы эканамічнага і сацыяльнага развіцця вырашаліся пераважна на экстэнсіўнай аснове, за кошт новага будаўніцтва, дадатковага прыцягнення матэрыяльных і працоўных рэсурсаў.

Палажэнне сельскай гаспадаркі Беларусі, як і СССР, к сярэдзіне 60-х гг. пагоршылася. У пошуках шляхоў да яе больш інтэнсіўнага развіцця сакавіцкі (1965 г.) пленум ЦК КПСС прыняў пастанову «Аб неадкладных мерах па далейшаму развіццю сельскай гаспадаркі СССР». У адпаведнасці з пастановай пленума закупачныя цэны на сельгаспрадукцыю павялічыліся ў

сярэднім у 2 разы, значна павялічвалася пастаўка на вёску сельскагаспадарчай тэхнікі. З мэтай арганізацыйна-гаспадарчага ўмацавання калгасаў у 1969 г. быў прыняты новы Статут сельскагаспадарчай арцелі, які павінен быў спрыяць пашырэнню калгаснай дэмакратыі.У рэспубліцы ў другой палове 60-х гг. разгарнулася будаўніцтва буйных адкормачных комплексаў у жывёлагадоўлі, птушкафабрык. Было асушана каля 1 млн га зямельных плошчаў, значна ўзраслі пастаўкі сельскай гаспадарцы мінеральных угнаенняў. Увыніку за 5 гадоў валавы збор збожжа павялічыўся ў 1,5 раза, а прадукцыйнасць жывёлагадоўлі ўзрасла на 34 %.Аднак новыя метады гаспадарання не ўпісаліся ў старую сістэму кіравання сельскай гаспадаркай. Вырас апарат кіравання, абмен паміж горадам і вёскай працягваў заставацца неэквівалентным. Таму як і прамысловасць, так і сельская гаспадарка ў 70-я — першай палове 80-х гг. развівалася вельмі супярэчліва. Гэта азначае, што разам з дасягненнямі былі і бясспрэчныя правалы. У ліку дасягненняў найбольш істотным было ўмацаванне матэрыяльна-тэхнічнай базы аграрнага сектара. У 1985 г. парк сельскагаспадарчай тэхнікі ў Беларусі павялічыўся ў параўнанні з 1970 г. у сярэднім напалавіну. У выніку ўжо ў другой палове 70-х гг. на кожны калгас і саўгас рэспублікі прыпадала 26 трактароў і 15 камбайнаў рознага прызначэння. Былі электрыфікаваны ўсе калгасы, саўгасы і населеныя пункты. У структуры энергетычных магутнасцей 99 % прыходзілася на машыны і толькі 1 % — на коней. Аднак амаль поўная адмова ад выкарыстання коней у сельскай гаспадарцы Беларусі аб'ектыўных падстаў не мела і ў будучым сябе не апраўдала. Значна ўзраслі за 1970—1985 гг. капіталаўкладанні ў аграрны сектар. Аднак чакаемых вынікаў яны не далі, таму што яны расходаваліся неэфектыўна. У гэтыя гады сельская гаспадарка Беларусі працягвала спецыялізавацца на развіцці мяса-малочнай жывёлагадоўлі, вытворчасці бульбы, льну-даўгунца, цукровых буракоў. Працягвалі ўводзіцца буйныя механізаваныя фермы і комплексы, ствараліся міжгаспадарчыя сельскагаспадарчыя аб’яднанні па адкорму жывёлы і птушак, вытворчасці мяса, малака і яек. Спецыялізацыя і канцэнтрацыя сельскай гаспадаркі Беларусі, рост міжгаспадарчай кааперацыі і аграрна-прамысловай інтэграцыі станоўча паўплывалі на рост вытворчасці прадукцыі жывёлагадоўлі. Разам з тым гэта парушала комплекснае развіццё аграрнага сектара народнай гаспадаркі рэспублікі, павялічвала дыспрапорцыю паміж яго галінамі, несла вялікія страты экалагічнаму становішчу Беларусі. У выніку ў пачатку 80-х гг. сельская гаспадарка СССР апынулася ў крызісным становішчы. Ураджаі збожжавых практычна не раслі і склалі 16 ц/га. У Беларусі некаторы рост валавых збораў збожжа адбываўся, але ўраджайнасць у 1971—1985 гг. заставалася на адным узроўні — 21,5 ц/га. Крызіснае становішча ў сельскай гаспадарцы прывяло да абвастрэння харчовай праблемы. Вырашыць яе шляхам імпарту таксама не атрымалася.

У сярэдзіне 80-х гг. прамысловасць Беларусі, як і СССР, працягвала развівацца. Трывогу выклікала толькі тое, што тэмпы росту прамысловай прадукцыі ўхільна зніжаліся. Разам з падзеннем росту вытворчасці

пагаршалася становішча ў сацыяльнай сферы. Таму кіраўніцтва краіны павінна было шукаць выйсця. Вядома, што шлях у такіх умовах адзіна магчымы — правядзенне рэформы. Праблема, аднак заключалася ў тым, што рэформы на працягу пасляваенных гадоў праводзіліся неаднаразова, а вынікаў не было. А ў гэты час у краінах Захаду навукова-тэхнічная рэвалюцыя ахапіла ўсе сферы жыцця грамадства. І пагроза адставання ўсё больш павялічвалася. Такім чынам, непазбежнасць новай эканамічнай рэформы для кіраўніцтва Савецкай краіны была відавочнай. Пытанне заключалася толькі ў тым, якой яна павінна была стаць. Магчымых шляхоў было два: альбо хуткі пераход да рынку рынкавай эканомікі, альбо чарговыя спробы ўдасканалення існаваўшай каманднa-адміністрацыйнай сістэмы. Партыйнае кіраўніцтва на чале з М. С. Гарбачовым выбрала апошні варыянт. На красавіцкім (1985 г.) пленуме ЦК КПСС гэты курс атрымаў назву курсу на паскарэнне сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны. Пад ім разумелася павышэнне тэмпаў эканамічнага развіцця шляхам усямернай інтэнсіфікацыі вытворчасці на падставе навукова-тэхнічнага прагрэсу, структурнай перабудовы эканомікі, новых форм арганізацыі працы. У адпаведнасці з гэтым курсам і быў распрацаваны пяцігадовы план развіцця Беларусі на 1986—1990 гг. Ён прадугледжваў павялічыць за пяць гадоў нацыянальны даход на 26 %. Пры гэтым рост прадукцыйнасці працы ва ўсіх галінах эканомікі павінен быў перавысіць 20 %. Гэта азначала, што прырост вытворчасці па плану поўнасцю забяспечваўся на падставе яе інтэнсіфікацыі. Што тычыцца перабудовы эканамічнага механізму, то мелася на ўвазе пашырэнне самастойнасці прадпрыемстваў, укараненне гаспадарчага разліку і самафінансавання. Аднак галоўныя надзеі ўскладаліся на адміністрацыйныя меры, умацаванне адказнасці, працоўнай дысцыпліны і інш. Ужо ў 1987 г. у Беларусі 20 % прамысловай прадукцыі давалі прадпрыемствы, пераведзеныя на самафінансаванне. Сутнасць самафінансавання заключалася ў тым, што прадпрыемствы пры яго ўвядзенні атрымалі магчымасць большую частку прыбытку пакідаць у сябе і свабодна ім распараджацца. Гэта быў прагрэсіўны прынцып, які з’яўляўся першым крокам да рынкавых адносін. Аднак без змен у іншых сістэмах кіравання: устанаўленні цэн зверху, планаў выпуску прадукцыі і інш.— ён працаваць не змог. Народная гаспадарка працягвала працаваць па старой схеме, выкарыстоўваючы загады, штурмаўшчыну, адшукванне рэсурсаў і г. д. Таму пераход ад курсу паскарэння да радыкальнай эканамічнай рэформы станавіўся непазбежным. У 1987 г. быў прыняты закон “Аб дзяржаўным прадпрыемстве” і шэраг іншых дакументаў аб радыкальнай рэформе. Усе яны мелі асноўнай задачай ажыццявіць пераход ад пераважна адміністрацыйных метадаў кіравання да эканамічных. У прыватнасці, існуючая цэнтралізаваная сістэма планавання замянялася на дзяржзаказ, які не павінен быў ахопліваць 100% магутнасцей прадпрыемства. Цэнтралізаванае размеркаванне рэсурсаў павінна было замяняцца аптовым гандлем сродкамі вытворчасці. Увогуле гэта рэформа для таго часу была маштабнай і радыкальнай. Яна была накіравана на паступовыя змены

дырэктыўнага планавання натуральных аб’ёмаў вытворчасці і паставак эканамічнымі метадамі рэгулявання праз цэны і нарматывы. Першымі шагамі ў гэтым кірунку з'явілася самафінансаванне і гасразлік. У 1988 г. у Беларусі на такіх умовах працавала ўся прамысловасць, транспарт, аграпрамысовы комплекс. На гаспадарчы разлік былі пераведзены і навуковыя арганізацыі. Гэта спрыяла ўмацаванню сувязі навукі і вытворчасці, паскарэнню навукова-тэхнічнага прагрэсу ў эканоміцы. З мэтай павышэння якасці прадукцыі, якая выпускалася, была ўведзена пазаведамасная кантрольная служба — Дзяржпрыёмка. Перавод прадпрыемстваў на гасразлік і самафінансаване садзейнічаў росту прамысловасці рэспублікі. За 1986—1989 гг. аб'ём прамысловай прадукцыі павялічыўся на 27 %, прадукцыйнасць працы павысілася на 26 %. Былі дасягнуты поспехі ў капітальным будаўніцтве, рабоце транспарту і сувязі. Вынікі былі б яшчэ лепшымі, але памяшала Чарнобыльская катастрофа.
Чарнобыльская катастрофа— аварыя на Чарнобыльскай АЭС у 1986 г., якая знаходзіцца на ўкраінскай тэрыторыі на мяжы з Беларуссю. Ад радыацыі пацярпела пятая частка тэрыторыі рэспублікі. З забруджаных тэрыторый на новае месцажыхарства было адселена звыш 130 тыс. чалавек. Выдаткі на рэалізацыю праграмы па пераадоленні наступстваў аварыі 1986—1992 гг. складалі каля 16% рэспубліканскага бюджэту.

У 1988 г. у кіраўніцтве асобных рэспублік узнікла ідэя перайсці на адносіны рэгіянальнага, ці рэспубліканскага гаспадарчага разліку. У выніку ўплыў цэнтра на чале з прэзідэнтам СССР аслабеў. Урад аказаўся не ў стане ажыццявіць комплексную радыкальную эканамічную рэформу. У той жа час склаўшаяся сістэма кіравання ўсім народнагаспадарчым комплексам аказалася разбалансаванай. З сярэдзіны 1990 г. да гэтага дадаўся канфлікт паміж цэнтральнымі і мясцовымі ўладамі, якія адказваліся выконваць абавязкі па гаспадарчых дагаворах. У выніку з гэтага года пачалося некантраляванае падзенне вытворчасці. Эканамічны крызіс у СССР, які пачаўся ў трэцім квартале 1988 г., станавіўся глыбокім і вострым. Толькі за 1989—1991 гг. падзенне нацыянальнага даходу дасягнула 33%. Крызіс у эканоміцы Беларусі пачаў праяўляцца крыху пазней, чым у другіх рэспубліках СССР. Але пачатак 90-х гг. адзначаны пагаршэннем становішча і ў прамысловасці, і ў іншых галінах эканомікі. У 1989 г. інфляцыя ў рэспубліцы склала каля 10%, а з пачатку 1991 г. эканамічная сітуацыя набыла ярка выяўлены крызісны характар, адбылося абсалютнае падзенне вытворчасці прадукцыі. Напрамак выхаду з крызісу ў СССР канчаткова вызначыўся на XVIII з'ездзе КПСС, які праходзіў у ліпені 1990 г. З’езд прыйшоў да вываду, што далей жыць з існуючай сістэмай гаспадарання нельга. Альтэрнатывай зжыўшай сябе камандна - адміністрацыйнай сістэме кіравання народнай гаспадаркай была прызнана рыначная эканоміка.

Рынак— гэта такая сістэма эканамічных адносін, якая забяспечвае эфектыўнае функцыяніраванне народнай гаспадаркі на аснове зацікаўленасці таваравытворцаў у атрыманні прыбытку. Асяродкам рыначных адносін з'яўляецца рынак тавараў, які можа эфектыўна дзейнічаць толькі ва

ўзаемасувязі з другімі рынкамі— капіталаў, працоўнай сілы, сродкаў вытворчасці, жылля, інфармацыі, тэхнічных навінак і г. д. Агульнай рысай для ўсіх іх з'яўляецца арыентацыя на спажыўца і збалансаванасць паміж попытам і прапановай з пастаянным перавышэннем прапановы. Гэта выклікае канкурэнцыю таваравытворцаў за рынак збыту, што робіць іх успрымальнымі да тэхнічных навінак, прымушае быць ініцыятыўнымі, дабівацца высокай якасці прадукцыі і паслуг і інш. Аднак рэфармаванне народнай гаспадаркі Беларусі на рыначных асновах у гэтыя гады праводзілася маруднымі тэмпамі, непаслядоўна, недастаткова прадумана і неэфектыўна. У той жа час кіраўніцтва ёю аказалася разбалансаваным. Усё гэта прывяло да рэзкага абвастрэння эканамічнага крызісу, у аснове якога ляжала скарачэнне выпуску прамысловай прадукцыі. За 1991—1994 гг. выпуск прамысловай прадукцыі ў рэспубліцы — асноўнай галіны народнай гаспадаркі — скараціўся на 31 %. А з улікам нерэалізаваных таварных запасаў вытворчасць прамысловасці скарацілася амаль удвая. Прычынамі падзення аб’ёмаў вытворчасці ў прамысловасці сталі распад адзінай эканамічнай прасторы, абвастрэнне праблемы збыту прадукцыі, рэзкае падаражанне матэрыяльных рэсурсаў, неплацяжы, што абумовіла цяжкае фінансавае становішча большасці прамысловых прадпрыемстваў рэспублікі.

Сельская гаспадарка як састаўны элемент эканомікі адчувала на сабе ўсе яе поспехі і няўзгоды. Як і прамысловасць, сельская гаспадарка рэспублікі ў 1986—1989 гг. мела пэўныя поспехі. У 1989 г., у параўнанні з 1985 г., збор збожжа павялічыўся на 28 %, бульбы — на 5 %, агародніны — на 12 %. Аднак ў 1990 г. у сувязі з агульным крызісам эканомікі становішча ў сельскай гаспадарцы таксама пагоршылася. Дэфіцыт фінансаў з-за нізкіх закупачных цэн на сельскагаспадарчую прадукцыю стаў галоўнай прычынай падзення вытворчасці. Адсутнасць парытэту цэн на прамысловую і сельскагаспадарчую прадукцыю прывяла да таго, што вёска ў першай палове 90-х гг. амаль што не купляла тэхніку, у 3 разы зменшылася набыццё ўгнаенняў, да мінімуму скараціліся пастаўкі хімічных сродкаў для абароны раслін. Такім быў вынік палітыкі штучнага стрымлівання закупачных і рознічных цэн на прадукцыю аграпрамысловага комплексу, якую недальнабачна праводзіў тагачасны ўрад Беларусі.

## ПРАКТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ

### Планы семінарскіх заняткаў

**Тэма 1. Змены ў сельскагаспадарчай вытворчасці**.
1. Памешчыцкая і сялянская гаспадаркі як адзіны эканамічны комплекс.
2. Палітыка ўрада па сялянскім пытанні. Рэформа П. Кісялёва.
3. Інвентарная рэформа.

**Тэма 2. Якасныя змены ў прамысловасці**
1. Тэхнічны пераварот у прамысловасці.
2. Мадэрнізацыя шляхоў зносін.

**Тэма 3. Аграрная рэформа1861 г. як фактар мадэрнізацыі сацыяльна-эканамічных адносін у аграрным сектары**.
1. Рэформа 1861 г.
2. Уплыў паўстання 1863-1864 гг. на рэалізацыю рэформы ў Беларусі.
3. Змяненні ў становішчы дзяржаўных сялян і іншых сацыяльных груп сельскага насельніцтва.
4. Мадэрнізацыйныя працэсы ў сельскагаспадарчай вытворчасці.

**Тэма 4. Асаблівасці прамысловай рэвалюцыі ў Беларусі.**
1. Прамысловая рэвалюцыя
2. Трансфармацыя фінансава-крэдытнай сістэмы.
3. Развіццё сухапутных і водных шляхоў зносін і сродкаў сувязі. Чыгуначнае будаўніцтва.

**Тэма 5. Мадэрнізацыйныя працэсы ў прамысловасці**.
1. Узнікненне новых галін і далейшая спецыялізацыя прамысловай вытворчасці.
2. Рост акцыянернага капіталу.
3.Замежны капітал у Беларусі.

**Тэма 6. Мадэрнізацыя сельскай гаспадаркі**.
1. Аграрная рэформа П. Сталыпіна, асаблівасці яе рэалізацыі ў Беларусі.
2. Дыферэнцыяцыя сялянства.
3. Рост прыватнай асабістай зямельнай уласнасці.

**Тэма 7. Беларуская вёска ў 1917-1927 гг**.
1. Ліквідацыя памешчыцкага землеўладання.
2. Харчразвёрстка.
3. Першыя камуны.
4. Беларуская вёска ў перыяд новай эканамічнай палітыкі. Харчовы падатак.

**Тэма 8. Сацыялістычная рэканструкцыя сельскай гаспадаркі.**
1. Стварэнне калгасаў і саўгасаў.
2. Машынна-трактарныя станцыі.
3. Сацыякультурная трансфармацыя беларускай вёскі.

**Тэма 9. Прамысловасць Беларусі ва ўмовах НЭПа**.
1. Развіццё рынкавых адносін.
2. Увядзенне гаспадарчага разліку.
3. Рэарганізацыя кіравання народнай гаспадаркай.
4. Змены ў дачыненні да прыватнаму капіталу**.**

**Тэма 10. Фарсіраваная індустрыялізацыя.**
1. Стварэнне новых галін прамысловасці.
2. Змены ў складзе рабочага класа.
3. Вынікі індустрыялізацыі ў БССР.

**Тэма 11. Асноўныя напрамкі мадэрнізацыйных працэсаў у БССР (1943 – 1991 гг.).**
1. Асаблівасці пасляваеннай мадэрнізацыі, яе асноўныя этапы.
2. Будаўніцтва новых і мадэрнізацыя дзеючых прамысловых прадпрыемстваў.
3. Меліярацыя і хімізацыя сельскагаспадарчых угоддзяў і іх наступствы.
4. Урбанізацыйныя працэсы.
5. Навукова-тэхнічны прагрэс.

**Тэма 12.Мадэрнізацыйныя працэсы ў Рэспубліцы Беларусь**.
1. Мадэрнізацыя прамысловасці, шляхоў зносін.
2. Рэформы ў аграрным сектары эканомікі, гандлі, сферы абслугоўвання.
3. Дзяржаўная і прыватная ўласнасць, замежны капітал і інвестыцыі.

## РАЗДЗЕЛ КАНТРОЛЮ ВЕДАЎ

### Пытанні да заліку па дысцыпліне “Эканамічная мадэрнізацыя ў Беларусі (IX – пачатку XXI ст.)”

1. Вебераўская і марксісцкая канцэпцыі мадэрнізацыі.
2. Сучасныя мадэрнізацыйныя тэорыі.
3. Палітыка ўрада па сялянскім пытанні. Рэформа П. Кісялёва.
4. Інвентарная рэформа.
5. Тэхнічны пераварот у прамысловасці.
6 Мадэрнізацыя шляхоў зносін у канцы XVIII - сярэдзіна XIX ст .
7. Рэформа 1861 г.
8. Уплыў паўстання 1863-1864 гг. на рэалізацыю рэформы ў Беларусі.
9. Змяненні ў становішчы дзяржаўных сялян і іншых сацыяльных груп сельскага насельніцтва.
10. Мадэрнізацыйныя працэсы ў сельскагаспадарчай вытворчасці у другой палове XIX ст.
11. Прамысловая рэвалюцыя.
12. Трансфармацыя фінансава-крэдытнай сістэмы.у другой палове XIX ст.
13. Развіццё сухапутных і водных шляхоў зносін і сродкаў сувязі. Чыгуначнае будаўніцтва.
14. Узнікненне новых галін і далейшая спецыялізацыя прамысловай вытворчасці у пачатку XX ст.
15. Рост акцыянернага капіталу.
16.Замежны капітал у Беларусі.
17. Аграрная рэформа П. Сталыпіна, асаблівасці яе рэалізацыі ў Беларусі.
18. Дыферэнцыяцыя сялянства у пачатку XX ст.
19. Рост прыватнай асабістай зямельнай уласнасці у пачатку XX ст.
20. Ліквідацыя памешчыцкага землеўладання.
21. Харчразвёрстка.
22. Першыя камуны.
23. Беларуская вёска ў перыяд новай эканамічнай палітыкі. Харчовы падатак.
24. Стварэнне калгасаў і саўгасаў.
25. Машынна-трактарныя станцыі.
26. Сацыякультурная трансфармацыя беларускай вёскі ў 1917-1927 гг.
27. Развіццё рынкавых адносін ва ўмовах НЭПа.
28. Увядзенне гаспадарчага разліку ў перыяд НЭПа
29. Рэарганізацыя кіравання народнай гаспадаркай у 1920-х гг.
30. Змены ў дачыненні да прыватнага капіталу ў 1920-х гг.
31. Стварэнне новых галін прамысловасці ў ходзе індустрыялізацыі.
32. Змены ў складзе рабочага класса ў ходзе індустрыялізацыі.
33. Вынікі індустрыялізацыі ў БССР.
34. Асаблівасці пасляваеннай мадэрнізацыі, яе асноўныя этапы.
35. Будаўніцтва новых і мадэрнізацыя дзеючых прамысловых прадпрыемстваў у 1943 – 1991 гг.

36. Меліярацыя і хімізацыя сельскагаспадарчых угоддзяў і іх наступствы.
37. Навукова-тэхнічны прагрэс у БССР.
38. Мадэрнізацыя прамысловасці, шляхоў зносін у Рэспубліцы Беларусь.
39. Рэформы ў аграрным сектары эканомікі, гандлі, сферы абслугоўвання ў Рэспубліцы Беларусь.
40. Дзяржаўная і прыватная ўласнасць, замежны капітал і інвестыцыі ў Рэспубліцы Беларусь.

## ДАПАМОЖНЫ РАЗДЗЕЛ

### Вучэбная праграма

### СОДЕРЖАНИЕ УЧЕБНОГО МАТЕРИАЛА

**1. Введение.** Предмет, цель и задачи дисциплины, ее структура. Историография и источники, их значение для разработки и изучения проблемы. Современное состояние исследований по данной проблеме. Основные научные работы и учебные пособия.

Понятия «индустриальная цивилизация» и «модернизация». Характерные черты европейской модернизации. Веберовская и марксистская концепции модернизации. Современные модернизационные теории.

**2. Модернизационные процессы в Российской империи в первой половине XIX в. и Беларусь.**

Разложение феодально-крепостнического строя и формирование капиталистических отношений. Структура и формы организации производства. Вотчинная и городская промышленность. Особенности предпринимательства. Технический и промышленный переворот. Развитие торговли и путей сообщения. Рост роли городов. Городское население.

Развитие товарного производства в сельском хозяйстве Беларуси, специализация. Помещичье и крестьянское хозяйства как единый экономический комплекс. Политика правительства по крестьянскому вопросу. Реформа П. Киселёва. Специальное профессиональное образование в Беларуси.

**3. Беларусь и реформирование социально-экономической системы Российской империи во второй половине XIXв.**

Аграрная реформа 1861 г. как фактор модернизации социально-экономических отношений в аграрном секторе. Влияние восстания 1863 - 1864 гг. на реализацию реформы в Беларуси. Изменение в положении государственных крестьян и других социальных групп сельского населения.

Модернизационные процессы в сельскохозяйственном производстве. Особенности развития капитализма в помещичьем и крестьянском хозяйствах.

Особенности промышленной революции в Беларуси. Рост городов. Специфика урбанизации в Беларуси. Торговля. Падение роли ярмарок и развитие стационарной торговли. Трансформация финансово-кредитной системы. Развитие сухопутных и водных путей сообщения и средств связи. Железнодорожное строительство. Появление телеграфа.

**4. Столыпинская модернизация и Беларусь.**

Возникновение новых отраслей и дальнейшая специализация промышленного производства. Рост акционерного капитала. Иностранный капитал в Беларуси.

Аграрная реформа П. Столыпина, особенности ее реализации в Беларуси. Дифференциация крестьянства. Рост частной земельной собственности. Модернизация сельскохозяйственного производства.

**5. Советская модернизация белорусской деревни.**

Ликвидация помещичьего землевладения. Продразвёрстка. Первые коммуны. Белорусская деревня в период Новой экономической политики. Продовольственный налог. Социалистическая реконструкция сельского хозяйства. Создание колхозов и совхозов. Машинно-тракторные станции. Социокультурная трансформация белорусской деревни.

**6. Социалистическая модернизация промышленности в БССР.**

Промышленность Беларуси в условиях НЭПа: развитие рыночных отношений, введение хозяйственного расчёта, реорганизация управления народным хозяйством, изменения в отношении к частному капиталу. Переход к форсированной индустриализации. Создание новых отраслей промышленности. Итоги индустриализации в БССР.

**7. Основные направления модернизационных процессов в БССР (1943 – 1991 гг.)** .

Особенности послевоенной модернизации, её основные этапы. Экономическая и социальная трансформация общества. Их сущность и последствия. Концепция построения коммунистического и развитого социалистического общества. Строительство новых и модернизация действовавших промышленных предприятий. Мелиорация и химизация сельскохозяйственных угодий и их последствия. Урбанизационные процессы. Научно-технический прогресс.

**8. Модернизационные процессы в экономике Республики Беларусь**

Модернизация промышленности, путей сообщения. Реформы в аграрном секторе экономики, торговле, сфере обслуживания. Государственная и частная собственность, иностранный капитал и инвестиции.

**9. Модернизационные процессы на территории Беларуси (XIX – начало XX в.)**

Историография проблемы. Источники. Технический и промышленный переворот в Беларуси, особенности его проявления. Аграрные реформы (1837г., 1861 г.,1906 г.) как инструмент модернизации в деревне. Социальная трансформация белорусского общества.

**10. Социально-экономическая и культурная трансформация белорусского общества в 1917 – 1941 гг.**

Историография проблемы. Источники. Переход от политики «военного коммунизма» к Новой экономической политике. Советская индустриализация и особенности её проявления в БССР. Социалистическая реконструкция сельского хозяйства и её особенности в БССР.

**11. Модернизационные процессы в экономической сфере в Беларуси (1943 г. - начало XXI в.)**

Историография проблемы. Источники. Восстановление народного хозяйства в БССР. Попытки реформирования в области промышленного и сельскохозяйственного производства. Изменения в социокультурной сфере. Инновации в экономике Республики Беларусь.

**УЧЕБНО-МЕТОДИЧЕСКАЯ КАРТА**
**учебной дисциплины «Экономическая модернизация в Беларуси (XIX - начало XXI вв.)»**
(дневная форма получения образования)

| Номер раздела, темы, занятия | Название раздела, темы, занятия, перечисление изучаемых вопросов | Лекции | Семинарские занятия | Самостоятельная работа студентов | Материальное обеспечение занятия (наглядные, методические пособия и др.) | Литература | Формы контроля знаний |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 |
| **1** | **Введение**<br>1. Предмет, цель и задачи дисциплины .<br>2. Историография и источники.<br>3. Веберовская и марксистская концепции модернизации.<br>4. Современные модернизационные теории. | **2** | | | Методические пособия<br>Презентации | [1, 2, 3] | Устный опрос |
| **2** | **Модернизационные процессы в Российской империи в первой половине XIX в. и Беларусь.**<br>**2.1.Изменения в сельскохозяйственном производстве.**<br>1. Помещичье и крестьянское хозяйства как единый экономический комплекс.<br>2. Политика правительства по крестьянскому вопросу. Реформа П. Киселёва.<br>3. Инвентарная реформа. | **2**<br><br>2 | **4**<br><br>2 | | Карта “Беларусь у складзе Расійскай імперыі (1795 – 1917 гг.)” | [1, 2, 3] | Конспект, реферат |
| | **2.2. Качественные изменения в промышленности**<br>1. Технический переворот в промышленности.<br>2. Модернизация путей сообщения. | **2** | 2 | | Карта “Беларусь у складзе Расійскай імперыі (1795 – 1917 гг.)”<br>Компьютерная презентация | [1, 2, 3] | Конспект, реферат |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 3 | **Беларусь и реформирование социально-экономической системы Российской империи во второй половине XIX в.**<br>**3.1. Аграрная реформа1861 г. как фактор модернизации социально-экономических отношений в аграрном секторе**.<br>1. Реформа 1861 г.<br>2. Влияние восстания 1863 - 1864 гг. на реализацию реформы в Беларуси.<br>3. Изменение в положении государственных крестьян и других социальных групп сельского населения.<br>4. Модернизационные процессы в сельскохозяйственном производстве.<br>**3.2.Особенности промышленной революции в Беларуси.**<br>1. Промышленная революция<br>2. Трансформация финансово-кредитной системы.<br>3. Развитие сухопутных и водных путей сообщения и средств связи. Железнодорожное строительство. | **8**<br>4<br><br><br><br><br><br><br><br><br><br>2 | **4**<br>2<br><br><br><br><br><br><br><br><br><br>2 | | Карта “Беларусь у складзе Расійскай імперыі (1795 – 1917 гг.)” Компьютерная презентация | [1, 2, 3] | Устный опрос |
| 4 | **Столыпинская модернизация и Беларусь.**<br>**4.1.Модернизационные процессы в промышленности.**<br>1. Возникновение новых отраслей и дальнейшая специализация промышленного производства.<br>2. Рост акционерного капитала.<br>3.Иностранный капитал в Беларуси.<br>**4.2.Модернизация сельского хозяйства**.<br>1. Аграрная реформа П. Столыпина, особенности ее реализации в Беларуси.<br>2. Дифференциация крестьянства.<br>3. Рост частной личной земельной собственности. | **6** | 2<br><br><br><br><br><br>2 | | Методические пособия Презентации | [1, 2, 3] | устный опрос |
| 5 | **Советская модернизация белорусской деревни.**<br>**5.1. Белорусская деревня в 1917-1927 гг.**<br>1. Ликвидация помещичьего землевладения.<br>2. Продразвёрстка.<br>3. Первые коммуны.<br>4. Белорусская деревня в период Новой экономической политики. Продовольственный налог. | **2**<br>2 | **6**<br>2 | | Методические пособия Презентации | [1,2] | устный опрос |
| | **5.2. Социалистическая реконструкция сельского хозяйства**.<br>1. Создание колхозов и совхозов.<br>2. Машинно-тракторные станции.<br>3. Социокультурная трансформация белорусской деревни. | | 4 | | Методические пособия Презентации | [1,2] | Конспект, реферат |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 6 | **Социалистическая модернизация промышленности в БССР.**<br>**6.1. Промышленность Беларуси в условиях НЭПа**.<br>1. Развитие рыночных отношений.<br>2. Введение хозяйственного расчёта.<br>3. Реорганизация управления народным хозяйством.<br>4. Изменения в отношении к частному капиталу. | **2**<br><br>2 | **4**<br><br>2 | | Карта “Беларуская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка ў 1919 – 1941 гг.” | [1,2] | Устный опрос |
| | **6.2. Форсированная индустриализация.**<br>1. Создание новых отраслей промышленности.<br>2. Изменения в составе рабочего класса.<br>3. Итоги индустриализации в БССР. | | 2 | | Карта “Беларуская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка ў 1919 – 1941 гг.” | [1,2] | Конспект, реферат |
| 7 | **Основные направления модернизационных процессов в БССР (1943 – 1991 гг.)** .<br>1. Особенности послевоенной модернизации, её основные этапы.<br>2. Строительство новых и модернизация действовавших промышленных предприятий.<br>3. Мелиорация и химизация сельскохозяйственных угодий и их последствия.<br>4. Урбанизационные процессы.<br>5. Научно-технический прогресс. | **2** | **4** | | Карта “Беларуская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка 1945 – 1991 гг.” | [1,2] | Устный опрос |
| 8 | **Модернизационные процессы в Республике Беларусь.**<br>1. Модернизация промышленности, путей сообщения.<br>2. Реформы в аграрном секторе экономики, торговле, сфере обслуживания.<br>3. Государственная и частная собственность, иностранный капитал и инвестиции. | | **4** | | Карта “Беларуская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка 1945 – 1991 гг.” | [1,2] | Устный опрос |
| 9 | **Модернизационные процессы на территории Беларуси (XIX – начало XX в.).**<br>1. Историография проблемы. Источники.<br>2. Технический и промышленный переворот в Беларуси, особенности его проявления.<br>3. Аграрные реформы (1837г., 1861 г.,1906 г.) как инструмент модернизации в деревне. | | | **16** | Компьютерная презентация Конспект, реферат | [1, 2, 3] | Отчет по выполненным в рамках самостоятельной работы индивидуальным заданиям |
| 10 | **Социально-экономическая трансформация белорусского общества в 1917 – 1941 гг.**<br>1. Историография проблемы. Источники.<br>2. Переход от политики «военного коммунизма» к Новой экономической политике.<br>3. Советская индустриализация и особенности её проявления в БССР. | | | **16** | Компьютерная презентация Конспект, реферат | [1,2] | Отчет по выполненным в рамках самостоятельной работы индивидуальным |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 4. Социалистическая реконструкция сельского хозяйства и её особенности в БССР. | | | | | | заданиям |
| **11** | **Модернизационные процессы в экономической сфере в Беларуси (1943 г. - начало XXI в.).**<br>1. Историография проблемы. Источники.<br>2. Восстановление народного хозяйства в БССР.<br>3. Попытки реформирования в области промышленного и сельскохозяйственного производства. | | | **16** | Компьютерная презентация Конспект, реферат | [1,2] | Отчет по выполненным в рамках самостоятельной работы индивидуальным заданиям |
| | **ВСЕГО**: | **24** | **28** | **48** | | | **зачет** |

## ИНФОРМАЦИОННО-МЕТОДИЧЕСКАЯ ЧАСТЬ

## ЛИТЕРАТУРА

**Основная литература**

1. Аргучинцев, Г.А. История государства и права Беларуси: учебное пособие для студентов специальности « Правоведение» / Г.А. Аргучинцев. – Минск: Изд-во «Амалфея», 2019. – 380 с.
2. Брыгадзін, П. І. Гісторыя Беларусі ў кантэксце еўрапейскай цывілізацыі [Электронный рэсурс] : вучэб. дапам. / П. І. Брыгадзін. – Рэжым доступу: https://www.gstu.by/sites/default/files/atoms/files/55/12/brygadzin.pdf. – Дата доступу: 17.06.2019.
3. Дзяржаўнае кіраванне і грамадскае самакіраванне на тэрыторыі Беларусі (канец XVIII – пачатак XX ст.) : вучэб.-метад. дапам. / М-ва адукацыі Рэсп. Беларусь, Беларус. дзярж. пед. ун-т ; А. П. Жытко [і інш.] ; пад агул. рэд. А. П. Жытко. – Мінск : Беларус. дзярж. пед. ун-т, 2017. – 320 с.

**Дополнительная литература**

1. Грамадска-палітычнае жыццё ў Беларусі, 1772–1917 гг. / Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі ; А. У. Унучак [і інш.] ; рэдкал.: В. В. Даніловіч (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларус. навука, 2018. – 573 с.
2. Есиков, С. А. Российская деревня в годы нэпа. К вопросу об альтернативах сталинской коллективизации (по материалам Центрального Черноземья) / С. А. Есиков. – М. : РОССПЭН, 2010. – 244 с.
3. Каспэ, С. И. Империя и модернизация: Общая модель и российская специфика / С. И. Каспэ. – М. : РОССПЭН, 2001. – 256 с.
4. Касцюк, М. П. Рэформы і рэвалюцыі як шляхі мадэрнізацыі грамадства ў XX ст. / М. П. Касцюк // Працы гістарычнага факультэта Беларус. дзярж. ун-та : навук. зб. / рэдкал.: У.К. Коршук (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларус. дзярж. ун-т, 2009. – Вып. 4. – С. 203–208.
5. Каханоўскі, А. Г. Разгортванне мадэрнізацыйных працэсаў у Беларусі ў XIX – пачатку XX ст. / А. Г. Каханоўскі // Працы гістарычнага факультэта Беларус. дзярж. ун-та : навук. зб. / рэдкал.: У.К. Коршук (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларус. дзярж. ун-т, 2009. – Вып. 4. – С. 218–229.
6. Носевич, В. Традиционная белорусская деревня в европейской перспективе / В. Носевич. – Минск : Технология, 2004. – 350 с.
7. Опыт российских модернизаций XVIII–XX века / В. В. Алексеев [и др.] ; отв. ред. : В. В. Алексеев. – М. : Наука, 2000. – 244 с.
8. Побережников, И. В. Переход от традиционного к индустриальному обществу: теоретико-методологические проблемы модернизации / И. В. Побережников. – М. : РОССПЭН, 2006. – 237 с.

9. Талмачова, С. А. Мясцовыя органы дзяржаўнага кіравання па рэалізацыі аграрнай палітыкі самадзяржаўя на тэрыторыі Беларусі (1861–1914 гг.) : манагр. / С. А. Талмачова. – Мінск : Беларус. дзярж. пед. ун-та, 2019. – 344 с.

10. Токць, С. М. Сацыяльныя і культурныя працэсы ў беларускай вёсцы ў другой палове XIX – пачатку XX ст. / С.М. Токць. – Мінск : Беларус. дзярж. ун-т, 2015. – 328 с.

11. Ходзін, С. М. Беларуская вёска ў міжваенны час: шляхі і формы савецкай мадэрнізацыі (1921–1939) : манагр. / С. М. Ходзін. – Мінск : Беларус. дзярж. ун-т, 2014. – 240 с.

12.Шыбека, З. Нацыянальная мадэрнізацыя 19–20 стагоддзяў і яе асноўныя этапы / З. Шыбека // Гістарычны альманах. – 2002. – Т. 7. – С. 48–53.

## Методические рекомендации по организации и выполнению самостоятельной работы студентов

При изучении дисциплины «Экономическая модернизация в Беларуси (XIX - начало XXI вв.)» могут использоваться различные подходы в организации самостоятельной работы студентов.

Время, отведенное на самостоятельную работу, может использоваться магистрантами на:

- подготовку к лекциям и семинарам;
- проработку тем (вопросов), вынесенных на самостоятельное изучение;
- изучение тем, не выносимых на лекции и семинары;
- составление тематической подборки литературных источников;
- конспектирование учебной литературы;
- подготовку тематических докладов, презентаций;
- подготовку к тестовому контролю и к зачету по учебной дисциплине;
- другое.

Основными методами организации самостоятельной работы магистрантов являются:

- выступление с докладом;
- изучение тем и проблем, не выносимых на лекции и семинары;
- конспектирование первоисточников;
- тестирование;
- подготовка и участие в активных формах обучения.

Контроль самостоятельной работы осуществляется в виде:

- оценка устного ответа на вопрос;
- защиты учебных заданий;
- индивидуальной беседы.

**Требования к выполнению самостоятельной работы студентов**
(дневная форма получения образования)

| № п/п | Название темы | Кол-во часов для СРС | Задание | Формы выполнения |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Модернизационные процессы на территории Беларуси (XIX – начало XX в.). | 16 | Историография проблемы. Источники. Технический и промышленный переворот в Беларуси, особенности его проявления. Аграрные реформы (1837г., 1861 г.,1906 г.) как инструмент модернизации в деревне. Социальная трансформация белорусского общества | Составление опорного конспекта |
| 2 | Социально-экономическая и культурная трансформация белорусского общества в 1917 – 1941 гг. | 16 | Историография проблемы. Источники. Переход от политики «военного коммунизма» к Новой экономической политике. Советская индустриализация и особенности её проявления в БССР. Социалистическая реконструкция сельского хозяйства и её особенности в БССР. | Подбор литературы по проблемным вопросам темы |
| 3 | Модернизационные процессы в экономической сфере в Беларуси (1943 г. - начало XXI в. | 16 | Историография проблемы. Источники. Восстановление народного хозяйства в БССР. Попытки реформирования в области промышленного и сельскохозяйственного производства. Изменения в социокультурной сфере. Инновации в экономике Республики Беларусь. . | Составление опорного конспекта |
| **Всего** | | **48** | | |

## Перечень используемых средств диагностики

Для текущего контроля и самоконтроля знаний и умений магистрантов по учебной дисциплине «Экономическая модернизация в Беларуси (XIX - начало XXI вв.)» можно использовать следующий диагностический инструментарий:

- устный опрос;
- собеседование;
- тестовый контроль;
- отчет по выполненным заданиям;
- зачет

**ПРОТОКОЛ СОГЛАСОВАНИЯ УЧЕБНОЙ ПРОГРАММЫ**
учебной дисциплины **«Экономическая модернизация в Беларуси (XIX - начало XXI вв.)»** с другими учебными дисциплинами специальности

| Название дисциплины, с которой требуется согласование | Название кафедры | Предложения об изменениях в содержании учебной программы учреждения высшего образования по учебной дисциплине | Решение, принятое кафедрой, разработавшей учебную программу |
|---|---|---|---|
| Современные тенденции и новации изучения отечественной и всеобщей истории | Истории Беларуси и славянских народов; всеобщей истории и методики преподавания истории | Согласовано на уровне учебных программ | Протоколы № 11 от 28.05.2019, № 12 от 31.05.2019 |
| Модернизационные процессы в странах Запада и Востока | Всеобщей истории и методики преподавания истории | Согласовано на уровне учебных программ | Протокол № 12 от 31.05.2019 |